Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ISSN 0024-4686

№ 49 (4492) 5 снежня 2008 г.

У нумары:

Перавага — не Інтэрнету

Рагачоўшчына сведчыць: цікавасць да кнігі — стабільная.

Стар. 5

Непісьменнае пісьменства, альбо Сіндром Бронскага

Быць папулярным — не азначае быць дасканалым…

Стар. 7

«Шаноўныя сябры — гажано эш'ёс…»

Народны пісьменнік Удмурціі Ар-Сяргі пра сябе, творчасць і Беларусь.

Стар. 13

Тры дні ў краі жоўтых гарлачыкаў

Аграгурызм — магчымасць захаваць фальклор, традыцыі, нашу аўтэнтычнасць.

Стар. 14

З кагорты гуманістаў

У вянок памяці Алега Лойкі.

Стар. 15

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА І ПАЎГОДДЗЕ 2009 г.

Для індывідуальных падпісчыкаў:
1 месяц — 7390 руб.
Падпісны індэкс — 63856

Ведамасная падпіска:
1 месяц — 9580 руб.
Падпісны індэкс — 638562

Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў: на 1 месяц — 4950 руб. Падпісны індэкс — 63815

Льготная падпіска для ўстаноў культуры:
1 месяц — 7500 руб. Падпісны індэкс — 63880

Каб год для вас быў неблагім — падпішыцеся на «ЛіМ»!

Снежаньскія абновы

Слынны сваёй гісторыяй, ахінуты легендамі дом на Траецкай гары — Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Беларусі. Святлынь яго абноўленага аблічча, здаецца, можа паспаборнічаць са свежасцю зімовага ўбрання, якое падаравала тэатральным прысадам першая сёлетняя завея. Чатыры бронзавыя музы, чые манументальныя постаці аздобілі фасад будынка, чакаюць свайго антычнага апекуна: скульптуру бога Апалона плануецца ўстанавіць у цэнтральнай нішы праз пару тыдняў. А змены ва ўнутраным арганізацыйна-творчым жыцці тэатра адбываюцца штодня...

З пачаткам зімы актывізаваліся рамонтныя работы ў зале; да 25 снежня павінна завяршыцца абсталяванне галоўнай сцэны, якая ўражвае сваімі памерамі — 25х30 метраў. Некалькі месяцаў таму вярнуўся ў родны дом калектыў балета, абжывае абноўленыя службовыя памяшканні, рэпеціруе на адмысловай сцэне, што з'явілася ў выніку рэканструкцыі тэатра і пашырэння яго плошчы з колішніх 8 тыс.кв.м да амаль 37 тыс.кв.м. У рэпетыцыйных класах ужо ладзяцца заняткі салістаў-спевакоў з канцэртмайстрамі. Рыхтуецца да навасельля і аркестр. Адміністрацыя тэатра оперы пераедзе ў свае сцены да канца снежня, вызваліўшы будынак па вуліцы Фрунзе, 19, для яго цяперашняга гаспадара — Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі.

У абноўленым тэатральным гмаху артысты оперы, балета, аркестра будуць працаваць адзіным калектывам, як працавалі не адно дзесяцігоддзе з часу свайго стварэння і да 1996 г. Іх юрыдычнае аб'яднанне ў Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Беларусі адбылося згодна з указам Прэзідэнта. Але пакуль кожная трупа працуе аўтаномна: харэаграфічныя спектаклі праходзяць у Палацы Рэспублікі, оперныя пастаноўкі — у Цэнтральным доме афіцэраў, ладзяцца філарманічныя канцэрты аркестра, хору, салістаў.

А сёння, 5 снежня, — прэм'ера: новае сцэнічнае жыццё набывае аднаактовая опера Сяргея Рахманінава "Алека" на сюжэт пушкінскай паэмы "Цыганы", шчырая і рамантычная старонка опернай класікі. Над яе ўвасабленнем працавалі дырыжор Віктар Пласкіна, рэжысёр-пастаноўшчык Валерый Анісенка, мастак-пастаноўшчык Вольга Грыцаева, вядучыя салісты.

Мастацкі кіраўнік Беларускай оперы Маргарыта Ізворска-Елізар'ева так пракаменціравала дэбют знанага драматычнага рэжысёра Валерыя Анісенкі на музычнай сцэне: "Быў перыяд, калі ў мастацтве пачала дамінаваць канцэптуальная рэжысура, і засталося мала практыкаў, якія працуюць у рэчышчы псіхалагічнага тэатра. Валерый Анісенка — адзін з нямногіх рэжысёраў, хто развівае тэатр у псіхалагічным напрамку. Да таго ж, ён вельмі музычны чалавек і на інтуітыўным узроўні ў сваіх вырашэннях больш дакладны за музыкантаў, захопленых канцэптуальнасцю. У творчым метадзе Анісенкі шмат карыснага для развіцця спевака-акцёра. Вось чаму мы прапанавалі пастаноўку "Алека" менавіта яму".

Тым часам наш балет выправіўся ў замежную вандроўку: з 4 па 29 снежня ён гастралюе ў Паўднёвай Карэі. Беларускія артысты пакажуць там чароўную калядную казку Пятра Чайкоўскага "Шчаўкунчык" у пастаноўцы свайго мастацкага кіраўніка Валянціна Елізар'ева.

Прыкладна месяц пасля навагодніх святаў балетны і оперны калектывы будуць працаваць у рэжыме, што склаўся за час рэканструкцыі тэатра. А потым пачнецца доўгачаканы творчы рэнесанс, і ўжо ў сакавіку мае адбыцца першы канцэрт "аб'яднаных сіл" у іх абноўленым доме.

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

Фота Кастуся Дробава

Мова роднага лесу

Адметная падзея днямі мела месца ў Доме літаратара. І нагода для яе — выдатная: у рэдакцыйна-выдавецкай установе "Літаратура і Мастацтва" пабачыла свет "Лясная кніга ў творах беларускіх пісьменнікаў". Адрасаваная дзецям сярэдняга школьнага ўзросту (укладальнік — Алесь Бадак, мастак — Дар'я Чарняўская). Таму і не дзіва, што на прэзентацыі кнігі і сустрэчы з некаторымі яе аўтарамі амаль усе месцы ў зале занялі навучэнцы сталічных школ.

Так, "Лясная кніга" — выданне не аднаго пісьменніка, а групы творцаў, сярод якіх Алесь Карлюкевіч, Уладзімір Ягоўдзік, Міхась Пазнякоў, Анатоль Зэкаў, Алесь Марціновіч, Анатоль Бутэвіч, Раіса Баравікова, Генадзь Аўласенка, Уладзімір Мазго... Дадзеная кніга — своеасаблівы працяг ужо добра вядомай чытачу "Чырвонай кнігі ў казках і вершах". Яна прысвечана беларускаму лесу, яго насельнікам. У ёй можна не толькі прачытаць цудоўныя вершы і казкі, прысвечаныя "зялёнаму сябру", але і знайсці шмат цікавай і карыснай інфармацыі пра яго.

Як зазначыў у прадмове выдання дырэктар РВУ "Літаратура і Мастацтва" Алесь Карлюкевіч (Алесь Мікалаевіч таксама быў і ў ролі вядучага мерапрыемства): *"Сабраўшы разам апавяданні, казкі і вершы пра насельнікаў лясного царства, мы вырашылі яшчэ распавесці і дакументальным словам пра звяроў і птушак, пра расліны і дрэвы. Чытаючы пра рознья прыгоды, фантазіруючы ўслед за аўтарамі, адкрываючы самыя неверагодныя падзеі і малюнкі лясного жыцця, вы, відаць, нешта хацелі б ведаць і дакладна... Словам, жыццяпіс звяроў, птушак, раслін, дрэў, грыбоў ды ягад — гэта не адно толькі іх казачнае жыццё. Адкрываючы для сябе рознья неверагодныя гісторыі, звярніце ўвагу на кароткія пазнавальныя, гістарычныя, краязнаўчыя нататкі Дзеда Усяведа. Будзем спадзявацца, што сабраныя ім у энцыклапедыях, старых прыродазнаўчых часопісах звесткі падштурхнуць вас да далейшай цікавасці ў спасціжэнні лясной біяграфіі"*.

Першай узяла слова Раіса Баравікова. Яна расказала вучням пра свае дзіцячыя кнігі, падкрэсліўшы, што ў РВУ "Літаратура і Мастацтва" пабачыў свет шэраг кніг, якія можна назваць "чароўнай энцыклапедыяй пра беларускую прыроду". А цяпер ва ўстанове рыхтуецца новае выданне — "Блакітная кніга", у якой будуць змешчаны казкі і вершы беларускіх пісьменнікаў пра рэкі, азёры...

Для Уладзіміра Мазго "Лясная кніга" — гэта часцінка яго жыцця. Міхась Пазнякоў, у творчым багажы якога шмат кніг для дзяцей і юнацтва, зазначыў, што "Лясная кніга" — адметнае пазнаваўчае выданне, бо лес для беларусаў — значная, жывая з'ява.

Анатоль Бутэвіч вызначыў выхад кнігі падвоеным святам: для пісьменнікаў як аўтараў, а для дзяцей як чытачоў. У сваю чаргу Алесь Бадак упэўніў дзятву, што многія з іх таксама могуць складаць вершы. Разам з вучнямі яны падбіралі рыфмы, чыталі вершы, а самы таленавіты малады сааўтар атрымаў кнігу з подпісам Алеся Мікалаевіча. Анатоль Зэкаў, як і ўсе іншыя перад ім выступоўцы, чытаў свае вершы. А Кацярына Хадасевіч-Лісавая распавяла пра легенды і паданні беларусаў, звязаныя з раслінамі.

Падчас прэзентацыі апроч аўтарскіх вершаў са сцэны гучалі спевы ў выкананні ўзорнага вакальна-эстраднага калектыву "Буслік". Трэба адзначыць, што мерапрыемства было вельмі інтэрактыўным: навучэнцы з ахвотай і задавальненнем адказвалі на пытанні, бралі ўдзел у прыродазнаўчых конкурсах.

Віктар КАВАЛЁЎ

Фота Кастуся Дробава

Пункцірам

* * *

Па ініцыятыве нямецкага і беларускага бакоў абвяшчаецца творчы конкурс на мастацкае аздабленне памятнага знака альбо шыльды на будынку адной з бальніц у Магілёве. З верасня 1941 па студзень 1942 фашысцкія акупанты атруцілі ў газавай камеры і расстралялі каля 1400 яе пацыентаў. Мемарыяльны знак павінен стаць напамінам пра тыя злачынствы.

Адкрыццё памятнага знака плануецца на 3 ліпеня 2009 года.

* * *

З 26 па 30 лістапада ў сталічным кінатэатры "Цэнтральны" прайшлі Дні польскага кіно. Мэта мерапрыемства — пазнаёміць беларускага гледача з навінкамі польскага кінематографа.

За пяць дзён было прадэманстравана адзінаццаць фільмаў. Сярод іх — фільм, уганараваны Гран-пры міжнароднага кінафестывалю "Залаты рыцар" у Чэлябінску ў 2005 годзе, "Надвор'е на заўтра" Ежы Штура, "Хто ніколі не жыў" Анджэя Севярына, "Рэзервацыя" Лукаша Палкоўскага.

Героі паказаных фільмаў, — людзі 20—30 гадоў, якім даводзіцца здзяснять нялёгкі маральны выбар у жыцці.

* * *

У рамках XXI Міжнароднага фестывалю сучаснай харэаграфіі (IFMC) 26 лістапада на віцебскай сцэне выступілі танцоры з Gauthier dance.

Gauthier dance — рэзідэнт-кампанія універсальных танцораў, якія працуюць пры культурным цэнтры Штутгарта (Германія). Кіруе калектывам вядомы ў свеце харэограф Эрык Гацье.

На канцэрце-адкрыцці віцебскага фестывалю нямецкі калектыў прадставіў тры харэаграфічныя пастаноўкі: "Паветра гітар", "Балет 101" і балет "Сола".

* * *

У Гомелі прайшла міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Старонкі ваеннай гісторыі Гомельшчыны". У канферэнцыі прынялі ўдзел гісторыкі з Беларусі і Расіі. Мерапрыемства прымеркавана да 65-годдзя вызвалення горада над Сожам ад фашысцкіх захопнікаў. Даклады выступоўцаў былі прысвечаны ваеннай гісторыя Гомельшчыны ў XI—XIX стагоддзях, а таксама ўдзелу гамяльчан у лакальных войнах і ваенных канфліктах XX стагоддзя.

* * *

Да 15 снежня ў мінскай галерэі Nova (вул. Веры Харужай, 16) працягнецца выстава фотаздымкаў Валерыя Лабко.

Валерый Лабко вядомы як выкладчык Беларускай акадэміі мастацтваў, Школы журналістыкі Мас медыа цэнтра, Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта. Ён прымаў удзел у шматлікіх выставах па ўсім свеце.

Фотамастак Валерый Лабко — таксама аўтар даследаванняў у галіне прадуктыўных адукацыйных методык.

* * *

Свет пабачыла аўдыёкніга Уладзіміра Караткевіча "Быў. Ёсць. Буду". Дыск склалі творы з апошняй аднайменнай кнігі пісьменніка, а таксама вершы розных гадоў. Чытае Андрэй Каляда.

Гэтая аўдыёкніга з'яўляецца працягам праграмы кампаніі "БелТонМедыа" па выданні беларускай і замежнай літаратуры ў гукавым фармаце.

Падрыхтаваў Павел РАДЫНА

Сёлетні год на Піншчыне прайшоў як літаратурны год Яўгеніі Янішчыц. Са студзеня выконвалася праграма "Пад зоркай Я. Янішчыц", а ў маі для бібліятэкараў прайшоў раённы семінар "Зорка Піншчыны — Яўгенія Янішчыц" з прэм'ерай яе кнігі "Пачынаецца ўсё з любві". Пад знакам выдатнейшай паэтэсы ў кастрычніку ў чытальнай зале цэнтральнай раённай бібліятэкі, якая носіць імя Я. Янішчыц, прыхільнікаў яе таленту сабраў літаратурна-музычны вечар. Потым стартаваў месячнік "Янішчыцкі лістапад". Нядаўна ж ладзілася раённае свята паэзіі "Каб застацца ў нязменнай любові".

Ад відавочцы

Святло паэзіі Янішчыц

Апафеозам святочных мерапрыемстваў сталі 20 і 21 лістапада. У дзень нараджэння Я. Янішчыц у чытальнай зале раённай бібліятэкі прачулае слова пра Яўгенію Янішчыц сказаў намеснік старшыні Пінскага райвыканкама Іван Багатка. Адбылася прэзентацыя дзесятага нумара часопіса "Нёман", у якім прадстаўлены "Пінскі сшытак" з творамі мясцовых літаратараў і публікацыі, прысвечаныя Я.Янішчыц. Нумар прадставіў галоўны рэдактар "Нёмана" Міхась Пазнякоў. Выступілі таксама рэдактар аддзела прозы Наталля Касцючэнка, намеснік галоўнага рэдактара Алесь Марціновіч, рэдактар раённай газеты "Полесская правда", пісьменнік Мікалай Елянеўскі. Пра сваю маці расказаў сын паэтэсы Андрэй.

Госці наведалі вёску Рудка, дзе да мемарыяльнай дошкі на хаце, у якой нарадзілася Я. Янішчыц, усклалі кветкі. У суседняй вёсцы Парэчча да іх далучыліся знакамітыя пісьменнікі, якія добра ведалі Я. Янішчыц, — Анатоль Вярцінскі, Валянціна Коўтун, Хрысціна Лялько, даследчыца творчасці паэтэсы Святлана Калядка. На будынку цяперашняй Парэчскай базавай школы была адкрыта мемарыяльная дошка. Сама ж школа стала насіць імя Я. Янішчыц — такое рашэнне прыняў Брэсцкі абласны выканаўчы камітэт. Госці пазнаёміліся са школьным музеем Я. Янішчыц.

Паэтычнае свята прайшло ў вёсцы Велясніцы. Гэта ёй Я. Янішчыц прысвяціла надзіва шчырыя радкі: "Там, ля роднай вёскі Велясніцы, // Ля палян зялёных і лясоў //Наталю апошні раз з крыніцы // Гарадскую смагу і любоў".

Гэтыя словы размешчаны з правага боку сцэны, з левага — не менш пранікнёныя: "Люблю ліпнёвы грыбасей, // І ціш палёў і водар мяты // За тое, што няма радней // Тае мясціны, дзе ўзышла ты". А на сцэне — партрэт паэтэсы і надпіс: "Я. Янішчыц. Ластаўка Палесся".

Перад прысутнымі выступалі А. Вярцінскі, В. Коўтун, Х. Лялько, М. Пазнякоў, галоўны рэдактар часопіса "Маладосць" Раіса Баравікова, Вадзім Спрынчан, Наталля Капа, Уладзімір Скарынкін...

21-га лістапада юбілейныя ўрачыстасці з удзелам старшыні Брэсцкага аблвыканкама Канстанціна Сумара прайшлі ў Палескім драматычным тэатры. На іх былі названы лаўрэаты абласной прэміі імя Уладзіміра Калесніка і абласнога конкурсу літаратурных і літаратурна-даследчыцкіх прац "Мой вечны шлях, мая Айчына".

Тарас ЗЯНОВІЧ

На Піншчыне — новыя зоркі...

Традыцыяй у Брэсцкай вобласці стала ўручэнне Літаратурнай прэміі імя Уладзіміра Калесніка, заснаванай Брэсцкім аблвыканкамам і абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі

Сёлетнім лістападам падзея гэтая прайшла ў Пінску. Адрас абраны далёка невыпадкова. Імпрэза, звязаная з ушанаваннем пісьменнікаў-лаўрэатаў, супала з 60-годдзем з дня нараджэння Яўгеніі Янішчыц.

Перапоўненая зала Палескага драматычнага тэатра прыняла ці не ўсю пісьменніцкую грамаду Берасцейшчыны. І ў чарговы раз падумалася пра тое, што ў літаратараў вобласці ёсць адметнае, спраектаванае на доўгія часы свята. Яно нечым важным стымулюе творчую ініцыятыву, спрыяе развіццю мастацкага таленту, яно падсумоўвае плён літаратурнай работы...Прыемна, што і ў самім Пінску выразна вылучаецца пісьменніцкі асяродак. Памятаючы пра высокую адказнасць перад здзейсненым вялікай зямлячкай Яўгеніяй Янішчыц, на ніве прыгожага пісьменства асабліва старанна рупяцца сёння пінчукі Валерый Грышкавец, Мікалай Елянеўскі, Валянціна Локун, Марыя Ляшук, Анатоль Шушко, Мікалай Лаўрыновіч... Канечне ж, і палову з літаратараў горада над Пінай я не назваў, бо іх — сапраўды грамада!

...Мо таму, што традыцыя ўвагі да мастацкага слова на Піншчыне расце і шырыцца, такой выключна святочнай і падалася мне атмасфера, што панавала гэтым днём у зале Палескага драматычнага тэатра. Уручаючы літаратурныя прэміі імя Уладзіміра Калесніка, старшыня Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін Андрэевіч Сумар і коратка, і адначасова вобразна і грунтоўна расказаў пра творчую значнасць зробленага берасцейскімі пісьменнікамі розных пакаленняў. Многа добрых слоў было адрасавана і паэтэсе перакладчыцы Ніне Мацяш. Дыпломамі і грашовымі прэміямі былі адзначаны Алесь Каско, Мікола Пракаповіч і пасмяротна Міхась Рудкоўскі за кнігу вершаў "Трохперсце". Васіль Ласковіч — за зборнік дакументальных успамінаў пра Вялікую Айчынную вайну "Отзвук далекой грозы". Зінаіда Дудзюк — за кнігу-даследаванне беларускай міфалогіі "Кола Сварога". І Расціслаў Бензярук — за кнігу, адрасаваную дзецям, "Зайцаў кажушок". І мо таму асабліва прыемна было назіраць за цырымоніяй, што ўлада, творчая грамадскасць заўважылі майстроў дастаткова розных, тым і цікавых, што вядуць свае, арыгінальныя мастацкія пошукі.

Шмат добрага гаварылася на ўрачыстасцях пра літаратурную моладзь. Многія юнакі і дзяўчаты былі адзначаны за лепшыя літаратурныя і літаратурна-даследчыцкія працы ўзнагародамі Брэсцкага аблвыканкама. Сярод лаўрэатаў конкурсу "Мой вечны шлях, мая Айчына" — і вучаніца Мерчыцкай СШ Пінскага раёна Альбіна Драко. Пра тую велізарную працу, што праводзіцца на Берасцейшчыне з моладдзю, вялі гаворку і загадчык кафедры філалагічнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта Уладзімір Сенькавец, і старшыня Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Анатоль Крэйдзіч, і дырэктар Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага Тамара Данілюк, і галоўны рэдактар часопіса "Маладосць" Раіса Баравікова, і вядомы ў краіне журналіст, ураджэнец Піншчыны галоўны рэдактар "Народнай газеты" Уладзімір Андрыевіч...

Гучалі словы ўдзячнасці і ад гасцей. Ганаровай граматай Саюза пісьменнікаў Беларусі быў узнагароджаны старшыня Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін Сумар. Дыпломам Саюза пісьменнікаў — начальнік упраўлення ідэалагічнай работы аблвыканкама Аляксандр Рагачук. Граматамі РВУ "Літаратура і Мастацтва" — старшыня Брэсцкага абласнога аддзялення СПБ Анатоль Крэйдзіч, дырэктар абласной бібліятэкі Тамара Данілюк, галоўны рэдактар пінскай гарадской газеты Марыя Ляшук.

І ў святочнай прамове кіраўніка вобласці, і ў выступленнях старшыні абласной пісьменніцкай арганізацыі гучалі добрыя словы пра супрацоўніцтва з Берасцейшчынай рэдакцыйна-выдавецкай установы "Літаратура і Мастацтва", часопісаў "Маладосць" і "Нёман". Так ужо склалася, што творчыя ініцыятывы, якія спрыяюць падтрымцы сапраўды таленавітага і значнага, нараджаюцца тады, калі знаходзіцца паразуменне, калі пра заўтрашні дзень думаюць супольна.

Варта заўважыць: сціплым і старанным генератарам многага добрага, вартага ўвагі шырокага чытача, што дзеецца літаратурным актывам Берасцейшчыны, з'яўляецца старшыня абласной арганізацыі СПБ таленавіты празаік, вопытны журналіст Анатоль Крэйдзіч. Яго арганізатарскі талент, цеплыня, з якой пісьменнік ставіцца да праблем, клопатаў калег, дарагога каштуюць. І гэта навідавоку. Анатоль Крэйдзіч у апошні час шмат высілкаў і намаганняў прыклаў да рэалізацыі падтрыманага аблвыканкамам творчага праекта "Літаратурная карта Берасцейшчыны". Ідэя, рэалізаваная супольна з філалагічным факультэтам Брэсцкага універсітэта, вылілася ў грунтоўную кнігу, без якой сёння ўжо нельга ўявіць ніводную бібліятэку вобласці. Такі адмысловы рэгіянальны падручнік па літаратурнаму краязнаўству, укладзены з элементамі хрэстаматыі, несумненна, — прыклад астатнім куточкам нашай Айчыны ў засваенні літаратурна-мастацкай спадчыны.

Кастусь ЛАДУЦЬКА

Юбілеі

Сталасць творчасці

У літаратурна-мастацкім салоне "Сустрэчы на Замкавай" пры цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя Герцэна горада Гомеля прайшоў юбілейны вечар Віктара Яраца.

"Ярац нарадзіўся як асоба раней свайго часу. Мудрасць яго паэзіі ў тым, што ён вялікія рэчы апавядае простымі і цёплымі словамі". *(А.Бароўскі)*

"Адносіны да слова ў яго шматасацыятыўныя. Але менавіта гэта, па нязведаных законах паэзіі, адводзіць яго ад спакушанай гульні са словамі. Ён шукае і знаходзіць не пераклічку гучанняў, не абстрактную пабудову слоў, а тую натуральнасць, у якой затаілася некранутасць думак і пачуццяў. Многія яго вершы — такі і хочацца сказать — не славесныя. Дарэчы, паэзія заўсёды была і будзе такой. А, значыць, невытлумачальнай. *(І. Катлярoў)*

Выразы двух вядомых паэтаў як мага лепш характарызуюць творчасць Віктара Яраца, выкладчыка ГДУ імя Ф.Скарыны, кандыдата філалагічных навук, публіцыста і перакладчыка. Ён шырока вядомы на Гомельшчыне як аўтар паэтычных кніг "Уваходзіны", "Добрыца", "Дняпроўскі бакен". Адзін з апошніх яго вершаў "Чарнобыльская восень" па сваім эмацыянальным напружанні набліжаецца да бессмяротнай паэзіі Б. Пастэрнака — ва ўсім багацці асацыяцый, ва ўсёй зменлівай дынамічнасці карцін прыроды і жыцця чалавека.

Паэзія В. Яраца патрабуе няспешлівага, удумлівага чытання.

Журботнае расставанне з летам, сум і туга па адляцелых, як восеньскае лісце, гадах, па родных мясцінах, па маладосці. Бо прыйшла сталасць. Сталасць поглядаў, жыцця, характару, сталасць творчасці.

Наталля МАЛАШЭНКА

Адноўленая прэмія

Да ведама

26 лістапада — у дзень нараджэння знанага беларускага пісьменніка — у Віцебску ўручаны абласныя прэміі імя Уладзіміра Караткевіча. Урачыстая цырымонія ўручэння адбылася ў Літаратурным музеі — філіяле Віцебскага абласнога краязнаўчага музея. Як паведаміла карэспандэнту "ЛіМа" сакратар камітэта па прысуджэнні гэтай ганаровай узнагароды Галіна МАРТЫНАВА, прэміі былі заснаваныя рашэннем абласнога выканаўчага камітэта ў 1999 годзе. Тады існавалі дзве асноўныя намінацыі — "за дасягненні ў галіне літаратуры" і "за прапаганду жыцця і творчасці У.Караткевіча" і ўручаліся ўзнагароды раз у год. З 2000 па 2005 гады лаўрэатамі сталі 12 пісьменнікаў і 3 установы культуры.

Цягам трох наступных гадоў прэміі не ўручаліся. Але за гэты час арганізатары прапрацавалі нарматыўныя дакументы, удакладнілі некаторыя пункты палажэння аб конкурсе і ўнеслі карэктывы ў парадак яго правядзення. Цяпер існуюць тры асноўныя намінацыі — "паэзія", "проза", і "за прапаганду жыцця і творчасці У. Караткевіча".

Такім чынам, у 2008-м пасля пэўнага перапынку літаратурная прэмія фактычна адноўлена. Пра ганаровы творчы конкурс і яго ўмовы сёлета было паведамлена ў абласным друку. Сваіх лаўрэатаў вылучылі аддзелы культуры Шумілінскага і Докшыцкага райвыканкамаў, сярэдняя школа №1 г. п. Лёзна, Віцебская гарадская бібліятэка імя І. Крылова, аддзел культуры Полацкага гарвыканкама. На разгляд прымаліся літаратурныя творы, надрукаваныя ў 2007—2008 гг. У выніку ў намінацыі "проза" вылучаны тры аўтары: Фёдар Палачанін — за кнігу "Голас сумлення", Генадзь Пацыенка — "Взрыв души", Барыс Бележэнка "Сны и дороги" і "Волшебная мельница". У галіне паэзіі пераможцай стала палачанка Надзея Салодкая (зборнікі паэзіі "Горсточка лета" і "Апошняя квадра"). У намінацыі "за прапаганду жыцця і творчасці У. Караткевіча" лаўрэаты не названыя. Адзін з магчымых пераможцаў, імя якога адразу ўзнікае ў памяці пры гаворцы пра папулярызацыю спадчыны пісьменніка — Аршанскі музей У. Караткевіча (філіял Установы культуры "Музейны комплекс гісторыі і культуры Аршаншчыны"), — ганараваны ў гэтай намінацыі ў 2005 годзе. Паводле новых правілаў, намінанты вылучаюцца паўторна на прэмію не раней як праз 5 гадоў.

Ірына ТУЛУПАВА

Сувязі

Паўстагоддзя духоўнага служэння

На мінулым тыдні Мінск наведаў Апостальскі Візітатар для беларусаў грэка-каталікоў замежжа айцец Аляксандр Надсан. Святкаванне 50-годдзя ягонай святарскай дзейнасці адбывалася ў касцёле Святых Сымона і Алены — у розныя дні тут прайшлі ўрачыстая літургія і грамадскае віншаванне. Акрамя таго, духоўны лідэр беларусаў замежжа меў некалькі сустрэч з журналістамі, дзеячамі культуры і мастацтва. Па запрашэнні Старшыні Прэзідыума НАН Беларусі Міхаіла Мясніковіча айцец Аляксандр Надсан наведаў і Нацыянальную акадэмію навук Беларусі.

Тут яго прымалі вядомыя навукоўцы і пісьменнікі — дырэктар Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы Аляксандр Лукашанец, дырэктар Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы Аляксандр Лакотка, дырэктар бібліятэкі імя Якуба Коласа Наталля Бярозкіна, акадэмік, літаратуразнаўца, празаік Уладзімір Гніламёдаў, спецыяліст па паўднёва-славянскіх мовах Генадзь Цыхун, літаратуразнаўца Міхась Мушынскі, крытык Міхась Тычына, галоўны рэдактар часопіса "Полымя", паэт Мікола Мятліцкі ды іншыя.

Айцец Аляксандр Надсан — сапраўды унікальная постаць для беларускай навукі. Бібліяграфія ягоных публікацый складае каля трохсот адзінак — пераклады, навуковыя артыкулы, кнігі.

"Ён не проста згуртаваў вакол сябе беларусістаў усяго свету, а па сутнасці запачаткаваў шмат якія дысцыпліны, як, напрыклад, вельмі славутыя цяпер татарскія беларускія кітабы, якія расчытаў і ў 1975 годзе ўвёў у навуковы ўжытак. Акрамя таго, айцец удакладніў дату друкавання "Малой падарожнай кніжкі" Ф. Скарыны, — распавяла тэолаг Ірына Дубянецкая, якая суправаджала госця падчас яго знаходжання ў Мінску. — Ён быў першым чалавекам з заходняга свету, які пасля Чарнобыльскай трагедыі прыехаў у Беларусь з гуманітарным грузам і заснаваў на Захадзе Камітэт па дапамозе ахвярам радыяцыі, дзякуючы якому пасля, як грыбы, павырасталі падобныя камітэты па ўсім свеце".

Сам айцец Аляксандр Надсан на сустрэчы з навукоўцамі распавёў пра вядомую кожнаму гуманітарыю беларускую бібліятэку імя Ф. Скарыны ў Лондане, заснавальнікам і кіраўніком якой з'яўляецца.

Па яго словах, бібліятэка незалежная, але мае афіцыйны статус і ўласнае памяшканне, што вельмі важна, бо нерухомасць у Англіі каштуе дорага. У фондах сабраныя матэрыялы, напісаныя па-беларуску, альбо на іншых мовах, але датычныя Беларусі — усяго каля 30 тысяч адзінак, што робіць бібліятэку унікальнай на Захадзе. Ёсць у фондах і каля 20 старадрукаў XVI—XVII стст., і рукапісы, самы стары з якіх датаваны XV стагоддзем. Тут захоўваецца аўтограф вядомай паэмы Янкі Купалы "Курган", частка рукапісаў "Другога чытання для дзетак беларусаў" і паэмы "Сымон-музыка" Якуба Коласа. "Бібліятэка заўсёды мела дзве галоўныя мэты. Па-першае, неабходна было сабраць і захаваць кнігі, што меліся ў беларусаў з нашай дыяспары. А па-другое, як і меркавалася, дзякуючы нашай бібліятэцы зацікаўленасць да беларускай культуры ўзрасла. Да нас прыязджаюць славісты з усяго свету, а таксама і беларусы, якіх цікавіць у асноўным культурны стан і жыццё беларускай дыяспары", — дадаў айцец Аляксандр Надсан.

Саша ДОРСКАЯ

На здымку: айцец Аляксандр Надсан (справа) са Старшынёй Прэзідыума НАН Беларусі М.Мясніковічам, Г. Дубянецкай і дырэктарам Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы А. Лукашанцам.
Фота Кастуся Дробава

Прэзентацыі

Святло ў вокнах сяброў

У Пасольстве Літвы ў Мінску адбылася літаратурная сустрэча-прэзентацыя. На беларускай вуліцы свята: па-літоўску выйшлі адразу чатыры кнігі: "Паляванне ў райскай даліне" Алеся Разанава, анталогія сучаснай беларускай паэзіі "Святло ў вокнах", дзіцячая кніга Бірутэ Ёнушкайтэ "Вусатая гісторыя Левука" і супольны альманах Беларусі, Польшчы і Літвы "Словы і фарбы".

У сваёй прамове Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Літвы ў Беларусі Эдмінас Багдонас адзначыў сувязь беларускай і літоўскай культуры, гісторыі, прыгадаў факты з мінулай моўнай сітуацыі ў Беларусі, якая шчыльна звязвала беларускі і літоўскі нацыянальныя этнасы.

Літаратуразнаўцы з Беларусі і Літвы — Адам Мальдзіс і Пятрас Бражэнас распавялі пра гісторыю літаратурна-культурных узаемадачыненняў дзвюх краін. Альма Лапінскене, старшыня Літоўскай асацыяцыі беларусістаў паведаміла, што сёлета трэба адзначаць 100-гадовы юбілей беларуска-літоўскага літаратурнага сяброўства. Менавіта ў 1908 годзе верш Алаізы Пашкевіч (Цёткі) "Хрэст на свабоду" быў перакладзены на літоўскую мову, а ў "Нашай Ніве" тады ж быў змешчаны пераклад апавядання Ёнаса Бялюнаса "Кветка шчасця".

Свае творы прачыталі многія аўтары анталогіі "Святло ў вокнах" — Раіса Баравікова, Леанід Дранько-Майсюк, Эдуард Акулін, Валянціна Коўтун, Андрэй Хадановіч і іншыя.

Ціхан ЧАРНЯКЕВІЧ

Сустрэчы

У гасцях — скульптар

Днямі да салдат і афіцэраў 361-й ордэна Чырвонай Зоркі базы аховы і абслугоўвання цэнтральных органаў ваеннага кіравання завітаў вядомы скульптар, член Беларускага саюза мастакоў Уладзімір Жбанаў.

Пытанняў у вайскоўцаў было шмат, паколькі самабытныя і адмысловыя скульптуры Уладзіміра Іванавіча ўпрыгожваюць не толькі вуліцы і плошчы Мінска, але і іншыя гарады Беларусі, і блізкага замежжа. Гэта і "Астролаг" у Магілёве, і "Папялушка" ў Бабруйску, і "Паручнік Ржэўскі" ў горадзе Паўлаградзе (Украіна), і "Бегемот", "Ева", "Маленькі генерал" — у прыватных калекцыях Масквы. У падмаскоўных Хімках у мінулым годзе быў устаноўлены помнік героям спецпадраздзяленняў КДБ і ФСБ, якія загінулі ў лакальных войнах. Сёлета ў горадзе Даўгапрудным (Расія) устаноўлена скульптура "Рамізнік".

Скульптар завітаў да вайскоўцаў, як кажуць, не з пустымі рукамі, а з падарункамі. Акрамя цікавага аповеда пра сваю творчую працу, ён падарыў кожнаму прысутнаму каляндарыкі з выявамі яго скульптур, а бібліятэцы часці — дакументальны фільм пра свой творчы шлях і кнігу-фотаальбом. Большасць ілюстрацый у альбоме выкананы фотамастаком Андрэем Шчукіным. На іх — гарадскія скульптуры Уладзіміра Іванавіча тыя, якія знаходзяцца ў прыватных калекцыях, эскізы будучых творчых работ. Многія яго скульптуры ўдала ўпісаліся ў гарадскі ландшафт і сталі блізкімі для гараджан. Вось на лаўцы побач з "Незнаёмкай" — закаханыя, вось студэнт прысеў на багажнік веласіпеда "Паштальён", каб перакусіць, а на бронзавым "Коніку", што ля Камароўкі, з задавальненнем "катаюцца" не толькі малыя...

Ад армейцаў паступіла прапанова выдаць яшчэ адзін аналагічны альбом, дзе знайшлося б месца таксама для аповедаў пра лёс той ці іншай скульптуры, якія цяжкасці і перашкоды падпільноўвалі на шляху да ўвасаблення ідэі і як іх удалося пераадолець... Той жа "Лазеншчык", які ў народзе завецца "Вясёлым Васем", аднойчы знік з прыступак лазні № 7, і толькі праз паўгода вярнуўся на сваё месца, а ў "Дамы з сабачкам" нехта "адабраў" парасон. У "Дзяўчынкі з парасонам" яго неаднойчы ламалі, а вось "Мюнхгаўзену" пасля доўгіх спрэчак так і не знайшлося месца ў Мінску... Самыя неверагодныя гісторыі мае практычна кожная работа скульптара Уладзіміра Жбанава.

Потым быў паказаны фільм пра Уладзіміра Іванавіча.

Ніна ЯЦКОЎСКАЯ

На здымку: аўтограф ад майстра.

Выстаўкі

«Шляхі да незалежнасці»



Пад такім назовам у Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі адкрылася выстаўка, прысвечаная 90-й гадавіне Незалежнасці Польшчы, якую арганізавалі Вайсковы аташат Пасольства Рэспублікі Польшча ў Рэспубліцы Беларусь і Польскі Інстытут у Мінску.

Атрыманне незалежнасці ў лістападзе 1918 года з'яўляецца пераломным момантам у гісторыі польскага народа. Прэзентаваная з гэтай нагоды выстаўка — гэта спроба рэканструкцыі падзей таго часу. Экспазіцыя складаецца з дзвюх частак: "Шляхі да незалежнасці" і "Стваральнікі незалежнасці".

Першая частка прадстаўлена шаснаццаццю планшэтамі, якія адлюстроўваюць тагачасную гістарычную рэчаіснасць. Пісьмовыя і выяўленчыя матэрыялы распавядаюць пра эмоцыі і спадзяванні палякаў, якія нягледзячы на складаныя абставіны і падзел краіны заўсёды імкнуліся да сваёй незалежнасці.

Другая частка экспазіцыі складаецца з трынаццаці планшэтаў, на якіх прадстаўлены асобы кіраўнікоў і найбольш вядомых дзяржаўных дзеячаў Польшчы, непасрэдна звязаных з падзеямі 1918 года.

В.К.

Фота аўтара

Вечарыны

Сцяжынамі Паўлінкі

У Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы адбылася вечарына, прысвечаная 115-годдзю з дня нараджэння Паўліны Мядзёлкі — педагога, тэатральнага дзеяча, аўтаркі вершаў, паэм, песень, п'ес, успамінаў. Яна адна з першых выканала ролю Паўлінкі ў аднайменнай п'есе Янкі Купалы, была сябрам сям'і Купалы. У 1966 годзе атрымала званне заслужанага дзеяча культуры Беларусі. Памерла 13 лютага 1974 года.

Самым, бадай, натхнёным перыядам яе творчага жыцця можна лічыць гады педагагічнай дзейнасці ў Дзвінскай беларускай гімназіі (1922—1925). Побач былі Ігнат Дварчанін, Максім Гарэцкі... Спектаклі, пастаўленыя П. Мядзёлкай, абуджалі тысячы беларусаў па ўсёй Латгаліі. Сам Райніс запрасіў яе артыстаў у Рыгу, каб "Паўлінка" прайшла і ў яго тэатры.

Госці музея змаглі ўбачыць фотаздымкі, прывезеныя мною з цікавых падарожжаў па Латвіі, дзе ў сем'ях былых выпускніцы гімназіі захоўваліся сведчанні памяці пра П. Мядзёлку.

Увагу прысутных на вечарыне прыцягнуў таксама фотаздымак, на якім П. Мядзёлка — сярод нашых маладых літаратараў. Сустрэча гэтая адбылася ў сакавіку 1969 года падчас Усесаюзнай нарады маладых пісьменнікаў. Данута Бічэль пазваніла Паўліне Вікенцьеўне (яна тады жыла ў Маскве), і мы сустрэліся з легендарнай Паўлінкай. Радасць была ўзаемнай. Нашы маладыя сцежкі жыцця асвяціліся яе прысутнасцю.

Сяргей ПАНІЗНІК

На здымку: Паўліна Мядзёлка з Данутай Бічэль, Яўгеніяй Янішчыц, Анатолем Кудраўцом, Міколам Капыловічам, Мар'янам Дуксам, Сяргеем Панізнікам. Масква, 1969 год.

Прыступкі школы Хутарскай

Хутарская сярэдняя школа — старэйшая ў Чэрвеньскім раёне — сёлета ў лістападзе адзначыла 145 гадоў з дня свайго заснавання.

Па запрашэнні дырэктара Людмілы Толкач мы з Уладзімірам Маруком трапілі ў сцены гэтай знакамітай школы. Чыста прыбраны двор, клумбы ў кветках, альпійская горка з вясковай экспазіцыяй. Акуратная і дагледжаная школа. Але не гэтым яна знакамітая. Школа не можа існаваць без адданых сваёй справе настаўнікаў. З адным з такіх настаўнікаў (выкладае беларускую мову і літаратуру) Пракопам Сакавым нас адразу і пазнаёмілі. Ён быў ініцыятарам стварэння музея гісторыі школы і краязнаўчага музея. Настаўнік больш як паўвека аддаў любімай справе. Наша знаёмства са школай пачалося менавіта з музея, у якім беражліва захоўваюцца дакументы, звязаныя з гісторыяй роднага краю, фотаздымкі і побытавыя рэчы.

Са сцен школы выйшла шмат знакамітых і таленавітых людзей. "Мы ганарымся і даводзім дзецям, — распавядае Пракоп Мікалаевіч, — што яны павінны памятаць, што вучацца ў Хутарскай школе".

На сцяне музея — генеалагічнае дрэва дынастыі Сікорскіх. Яшчэ ў даваенны час у пачатку 1930-х сюды прыехала маладая настаўніцкая сям'я: Міхаіл Іванавіч Сікорскі і яго жонка Яўгенія Канстанцінаўна. Маладыя інтэлігентныя, культурныя і адукаваныя людзі. За кароткі час, дзякуючы клопату дырэктара, была пабудавана двухпавярховая драўляная школа з прасторнымі класамі, сталовай і бібліятэкай. У 1936-м на конкурсе лепшых школ Беларусі Народны камісарыят асветы прысудзіў Хутарскай школе другое месца ў рэспубліцы. "Але знайшоўся подлы чалавек і напісаў ананімку на дырэктара. І ў 37-м годзе Міхаіл Іванавіч Сікорскі быў рэпрэсіраваны і сасланы на дзесяць гадоў у Архангельскую вобласць. Нізавошта чалавека асудзілі. Усе здзіўляліся, бацькі і настаўнікі, — расказвае загадчык музея, — толькі пасля вайны яго рэабілітавалі. Вярнуўся дамоў, але "ворагу народа" не дазволілі працаваць у школе. І ў той жа час, калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, тры яго сыны сталі на абарону сваёй радзімы, змагаліся ў партызанах і на фронце. Старэйшы Мікалай стаў вялікім вучоным: кандыдат гістарычных навук, доктар філалагічных навук, член Саюза журналістаў СССР, прафесар, доўгі час у Маскве быў дырэктарам Ленінскай бібліятэкі. Ён даслаў нам некалькі лістоў, падараваў кнігі з аўтографамі. Сярэдні сын — Усевалад Сікорскі ваяваў у партызанах, пасля вайны стаў доктарам філасофскіх навук, прафесарам, заслужаным дзеячам навукі БССР, у 70-х гадах быў рэктарам БДУ. Сёння жыве ў Мінску, падтрымлівае з намі сувязь. Яго сын Валерый — кандыдат фізіка-матэматычных навук, працуе выкладчыкам у БДУ. Дачка Святлана — кандыдат хімічных навук, жыве ў Маскве. Сікорскія падаравалі нам каля васьмідзесяці кніг з асабістай бібліятэкі. У свой час мы дабіваліся, каб школе прысвоілі імя Сікорскага, але пакуль нашы высілкі не далі вынікаў. Трэці сын Міхаіла Сікорскага, Генадзь, пайшоў у партызаны зусім маладым (не было і 18-і) і загінуў у баі з немцамі каля суседняй вёскі. Пахаваны на нашых могілках".

Акрамя гэтага ў музеі шмат матэрыялаў, прысвечаных Вялікай Айчыннай вайне і славутым землякам, у прыватнасці, распавядаецца пра шасцярых славутых жанчын, якія ваявалі за радзіму. Адна з іх, Ганна Пракопчык, прайшла вайну з першага да апошняга дня, запіс у ваенным білеце такі: "прызвана 22 чэрвеня 1941 года, а скончыла вайну 9 мая 1945 года ў Берліне". Захоўваюцца ў школьным музеі арыгінальныя лісты, што дасылаліся землякамі з фронту. Паводле слоў загадчыка музея, школьнікі склалі поўныя спісы сваіх землякоў, якія загінулі, якія былі ў партызанах ці ў падполлі або ваявалі на фронце. Выпускнік школы Іван Ладуцька стаў Героем Савецкага Саюза. Хутарская зямля дала не толькі вучоных, дактароў навук, герояў, тут нарадзіўся і пісьменнік Міхась Пянкрат, якому прысвечана асобная экспазіцыя. "Да вайны скончыў нашу сямігодку. Сыны Міхася Пянкрата нам перадалі яго рукапісы, вершы, лісты і кніжкі, — дадае Пракоп Мікалаевіч. — Уладзімір Ліпскі напісаў цудоўную кнігу пра нашага кампазітара Ігара Лучанка. Аказваецца, карані Ігара Міхайлавіча ідуць таксама з хутарскай зямлі. Яго дзед жыў у вёсцы Стары Брод". І зноў Пракоп Мікалаевіч пералічвае выпускнікоў школы, медалістаў, кандыдатаў навук, прафесараў...

Далей пераходзім у краязнаўчую частку музея, якая нагадвае сялянскую хату пачатку стагоддзя. З ініцыятывы Пракопа Мікалаевіча ўсе рэчы збіралі і прыносілі самі школьнікі. "Цяпер усё перабудоўваюць на сучасны лад. А мы вырашылі зрабіць інтэр'ер сялянскай хаты. Каб дзеткі ўяўлялі сабе, як жылі дзяды і прадзеды. Дзеці, калі што-небудзь знаходзяць, прыносяць сюды, у музей, — расказвае Пракоп Мікалаевіч — Вось, калі ласка, прас. І пінцэт быў спецыяльны, каб вугалькі закідваць. А гэтым прыстасаваннем калолі арэхі. Зімой — два тыдні Каляды, рабіць нельга, сядзелі і лушчылі арэхі. Лямпа. Патэфон. Электрычнасці не было... А гэта ражок. Падараваў адзін пастух. Ён ведаў шмат найгрышаў. "І зноў перад вачыма рэчы з далёкай даўніны: матачнік, бязмен, куродым, куфэрак... "А вось вялікі куфар. Дзіцячая калыска — да столі замацаваная на вяроўцы. Дзежка. Маслабойка. Вось хлебніца. Вышываныя ручнікі. Усё ў асноўным было драўляным, лес апранаў чалавека і карміў яго".

Школа мае цікавую гісторыю, багатыя традыцыі. Засмучае толькі адно: ва ўсіх класах вучыцца толькі 70 вучняў. Але гэта ўжо — наша агульная дэмаграфічная праблема.

Антон КУДЛАТЫ

На здымках: даваенны будынак Хутарскай школы; сучасны выгляд.

Свірская адысея класіка

Памятаю, калі ў жніўні 1952 года завітаў у Свірскую раённую бібліятэку (Свір быў райцэнтрам), то мяне, як пачынаючага настаўніка-літаратара прыемна ўразіў самаробны сціплы плакат, на якім выразна вылучаліся дзве чырвоныя васьмёркі. Плакат абвяшчаў, што 88 гадоў назад у Свіры жыў пачынальнік новай беларускай літаратуры Вінцук Дунін-Марцінкевіч.

Свіршчына — адметная старонка ў лёсе В. Дуніна-Марцінкевіча. Ужо за год да паўстанцкіх падзей 1863 года пісьменнік трапіў пад падазрэнне ўлад у палітычнай "недабранадзейнасці". Тым больш, што ў наваколлі фальварка Люцінка, дзе ён жыў, гуртаваліся паўстанцы, збіраліся на розныя нарады паўстанцкія кіраўнікі. Ці адчуваючы небяспеку, ці папярэджаны надзейным чалавекам В. Дунін-Марцінкевіч за дзень да з'яўлення ў Люцінцы паліцыі знік. 600 дзён паліцэйскія шукалі яго, аднак "помещіка Марцінкевіча нігде на жітельстве не оказалось".

Так, пісьменнік з'ехаў з Люцінкі менавіта ў Свір (спачатку — у Дубаўляны, паблізу Свіра). Менавіта ў Свіры ў кастрычніку 1864 года Дуніна-Марцінкевіча арыштавалі і павезлі проста ў Мінск, дзе ледзь не год (да ліпеня 1865-га), пакуль вялося следства, трымалі ў астрозе. Робіць гонар свіранам і дубраўлянцам тое, што ў час допытаў усе ў адзін голас сведчылі, што пісьменнік забароненымі справамі не займаўся.

Памяць пра Марцінкевіча ў Беларусі жыве. Яго спектаклем "Пінская шляхта" штогод распачынаецца тэатральны сезон Бабруйскага тэатра драмы і камедыі яго імя, у Люцінцы ладзяцца літаратурныя святы, яго імем названы вуліцы ў Мінску, Маладзечне і Бабруйску, імя яго выбіта на летапісным камені ў вёсцы Мясота. Сёлета па рашэнні ЮНЕСКА шырока адзначаецца 200-гадовы юбілей пісьменніка. З гэтае нагоды пабачыла свет юбілейная манета, памятная марка, кампакт-дыск, на колішняй яго сядзібе ўстаноўлена мемарыяльная стэла з пісьменнікавым барэльефам, выдавецтва "Мастацкая літаратура" выпусціла І-ы том поўнага збору яго твораў.

На Свіршчыне ў Камароўскай сярэдняй школе прайшоў нядаўна "круглы стол", прысвечаны юбілею В. Дуніна-Марцінкевіча, а ў Свірскай бібліятэцы зроблена выстаўка яго твораў.

Дарэчы, народны фотаклуб "Мінск" арганізаваў у Мінскай абласной бібліятэцы імя А. С. Пушкіна адметную экспазіцыю "Асветнік з Люцінкі". Думаецца, досведам гэтага фотаклуба маглі б пакарыстацца і свірчане — наладзіць фотавыставу, напрыклад, пад назвай "Патрыярх Беларушчыны на Свіршчыне". Праўда, няшмат засталося сведчанняў пра час, калі тут жыў Марцінкевіч, але можна, як кажуць мастакі, зафіксаваць мясціны, дзе ён мог бываць: рыначная плошча, касцёл, замчышча, царква, возера і рэчка, асторыя, дзе ён мог хыць і сталавацца, дубраўлянскі парк і інш. Вельмі было б добра, каб знайшоўся фатограф-аматар, які б здолеў усё гэта зрабіць.

Яська ДРАЎНІЦКІ

Міцкевіча помніць Завоссе

Той, хто хоча зразумець паэта, павінен наведаць яго радзіму", — сказаў аднойчы геніяльны Гётэ. І вось у філіяле Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры "Музей-сядзіба Адама Міцкевіча "Завоссе" з нагоды 210-годдзя з дня нараджэння славутага земляка адбылося свята. Хлебам-соллю сустракалі ў "Завоссі" шматлікіх гасцей, сярод якіх — прадстаўнікі Міністэрства культуры рэспублікі, Пасольства Польшчы ў Беларусі, навукоўцы, пісьменнікі, мастакі і творчыя калектывы.

Дырэктар музея Анатоль Еўмянкоў правёў займальную і цікавую экскурсію па сядзібе Міцкевіча. Паўтара дзесятка гадоў таму на гэтым месцы нічога не было. Але да 200-годдзя з дня нараджэння паэта сядзібу ўзнавілі па малюнках і абразках Эдварда Паўловіча і Напалеона Орды. На падставе гэтых малюнкаў і накідаў знайшлі падмурак дома, а затым па-новаму адбудавалі сядзібу на тым самым месцы. Сведкі тых часоў — трохсотгадовая ліпа, збітая маланкай (пэўна, як сімвал неўміручасці паэзіі, з трухлявага пня пашчапанага дрэва прабіваецца маладзенькае дрэўца), ды валун-камень, які заўсёды ляжаў ля брамы. На камні выбіты надпіс, што тут у Дзень Нараджэння Хрыстова — 24 снежня 1798 года нарадзіўся Адам. Па сутнасці — гэта першы помнік Адаму Міцкевічу. Сядзіба згарэла падчас Першай сусветнай вайны.

Пасля экскурсіі па сядзібе Міцкевіча побач з домам пачаліся святочныя ўрачыстасці. Гасцей прывітаў старшыня Мінскага аддзялення палякаў Мечаслаў Лысы. Выступіла галоўны рэдактар часопіса "Маладосць" Раіса Баравікова: "У сусветнай літаратуры ёсць паэты асабліва прыцягальныя, іх постаці настолькі магутныя, што немагчыма не падпасці пад уплыў іх творчасці, — адзначыла паэтэса. — Да такіх постацяў належыць вялікі Адам Міцкевіч. Постаць Міцкевіча яднае і звязвае нашы літаратуры, польскую і беларускую".

Доктар філалагічных навук Аляксандр Лукашанец адзначыў, што "феномен Адама Міцкевіча заключаецца ў тым, што ён не ўпісваецца ў сучаснае разуменне і паняцце нацыянальнасці і этнічнай прыналежнасці. Справа ў тым, што Міцкевіч жыў у той час, калі гэтыя паняцці можна было разглядаць шырэй...".

Паэты Генадзь Пашкоў і Навум Галыпяровіч, перакладчыкі і даследчыкі творчасці Адама Міцкевіча Ірына Багдановіч і Серж Мінскевіч — усе знайшлі шчырыя словы пра слыннага земляка. І зноў на свяце валадарыла Яе Вялікасць Паэзія — гучалі творы Адама Міцкевіча: па-беларуску, па-польску і на рускай мове... Гучалі вершы, прысвечаныя памяці паэта.

Беларускі паэтычны тэатр аднаго акцёра "Зніч" пад кіраўніцтвам Галіны Дзягілевай прадставіў монаопераў Алега Залётнева "Адзінокі птах" (саліст беларускай оперы Андрэй Марозаў), а скульптар Эдуард Астаф'еў падрыхтаваў для гасцей скульптурныя бюсты паэта.

Анатоль КУДЛАСЕВІЧ

Літаратурная вёска Бастынь

З ініцыятывы Лунінецкай журналісткі Таццяны Канапацкай традыцыйны гадавік "Лунінецкая памяць" прысвечаны біяграфіі старажытнага берасцейскага паселішча — вёскі Бастынь, што месціцца ў Лунінецкім раёне. Так склалася ў яе лёсе, што вядомасць мае ажно з 1458 года. Тады яна была дзяржаўнай уласнасцю. З першых гаспадароў Бастыні — заснавальнік славутага рода Радзівіл Осцікавіч. Шукальнік архіўных сведчанняў пра вёску знакаміты краязнаўца і калекцыянер Леў Коласаў піша ў кнізе "Лунінецкая памяць. Дадатак 3: Бастынь" (укладальнік — згаданая Таццяна Канапацкая): "Бастынь... перайшла ў спадчыну яго сыну Мікалаю (Радзівіла Осцінавіча. — ***К. Л.***). У 1520 г. трое яго сыноў падзялілі спадчыну. Мядовая даніна з Бастыні ў памеры 50 вёдраў увайшла ў долю, якую атрымаў Ян — земскі маршалак, драгічынскі і слонімскі староста, у 1539 г. — падчашы, жамойцкі староста... У 1545 г. спадчына была раздзелена паміж трыма яго дочкамі. Бастынь ужо адносілася да маёнтка Ліпск. Частка сяла належала дзвюм галінам Радзівілаў: сыну Яна Мікалаю Чорнаму і сыну Юрыя Мікалаю Рудому. У 1550 г. сяльцо і палац (маленькі двор) Бастынь — уласнасць апошняга..."

Бастынь — з нямногіх паселішчаў такога маштабу, якія маюць у нашай краіне ўласныя герб і сцяг вёскі (зацверджаны Геральдычным Саветам пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь 29 красавіка 2004 года). Мае паселішча і ўласную адмысловую легенду пра паходжанне назвы. Па дарозе дахаты патрапіў у вёску салдат. Начаваць спыніўся ў мясцовых гаспадароў. Загарэлася хата. Выратаваў салдат дачку гаспадароў і застаўся на гэтай сядзібе... "...Асабліва не чакаючы, узяўся новае падвор'е будаваць, ды не на старым месцы, а пад лесам, дзе зямля была надта добрая. Такую хаціну адляскаў, што толькі глядзі на яе ды любуйся. Увесь двор высокім тынам абнёс, каб звяроў і ліхіх людзей асабліва не баяцца. А падвор'е сваё па-вайсковаму назваў: "бастыён" — непрыступнае, маўляў, умацаванае. Толькі мясцовыя жыхары не маглі вымавіць цяжкае для іх слова і таму перайначылі на свой лад — Бастынь. Стуль усё і пайшло".

З вёскай, яе жыхарамі звязаны і літаратурныя памяткі. У 1950 годзе лунінецкая раённая газета "Авангард" друкуе нарыс пра ўраджэнца Бастыні Барыса Цельпука, якога паўторна выбіралі ў Вярхоўны Савет СССР, — "Слуга народа".

Пра другога бастынца — Івана Бушылу, які з-за страху быць пакараным хаваўся ў мясцовых лясах 42 гады, — Яраслаў Пархута напісаў аповесць "Адзінец". Спрычыніўся да лёсу паселішча сваім публіцыстычным досведам і пісьменнік-дакументаліст Мікола Калінковіч.

Заслуга краязнаўчай, грамадскай руплівасці Таццяны Канапацкай у тым, што яна напоўніцу сабрала інфармацыю пра бастынцаў. А вёска ж выправіла ў вялікі свет многа адметных асоб. Бастынь — радзіма генерал-маёра Івана Дырмана, контр-адмірала Мікалая Чопчыца, многіх высокіх дзяржаўных чыноўнікаў... У прыватнасці, вядомых у Брэсце і вобласці Ірыну Арабей, Ніну Чопчыц, ды шмат яшчэ каго. Кніга, укладзеная Таццянай Канапацкай, багата ілюстравана здымкамі з сямейных архіваў. На фотакартках знойдуць сябе многія і многія бастынцы. Няма сумненняў, што краязнаўчы зборнік пра вёску жыхары старажытнага паселішча разглядаць будуць як найлепшую ў свеце энцыклапедыю. Так, энцыклапедыю Бастыні і ўвогуле народнага жыцця ў Лунінецкім краі.

Кастусь ЛАДУЦЬКА

Перавага — не Інтэрнету

Рагачоўшчына заўсёды славілася сваімі дасягненнямі ў галіне культуры, а таксама мясцінамі, цесна звязанымі з жыццём і творчасцю вядомых людзей, у першую чаргу літаратараў. Тут да гэтага часу прыгадваюць сустрэчы ў бібліятэках і клубах з Міхасём Лыньковым, Андрэем Макаёнкам, Уладзімірам Караткевічам, Міколам Янчанкам... Аб развіцці сеткі культасветустаноў раёна, поспехах і праблемах карэспандэнты штотыднёвіка "Літаратура і мастацтва" гутараць з начальнікам аддзела культуры Рагачоўскага райвыканкама Міхаілам ЗАЙЦАВЫМ.

— Міхаіл Фёдаравіч, дзейнасць бібліятэкі ці адкрыццё новай — гэта, на ваш погляд, падзея, ці ўсё-ткі звычайная справа?

— Па-першае, раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма на сённяшні дзень ахоплівае 45 бібліятэк. У ліку іх: цэнтральная раённая, дзве гарадскія і дзіцячая, 41 сельская бібліятэка, у тым ліку адна дзіцячая ў аграгарадку Доўск.

Па-другое, адкрыццё новага культурна-асветнага і адукацыйнага цэнтра, якімі з'яўляюцца тыя ж бібліятэкі — гэта заўсёды падзея і для мясцовых жыхароў, і для работнікаў культуры раёна, сапраўднае свята. Бадай, год прайшоў як мы ўрачыста адкрылі бібліятэку ў адрамантаваным будынку ў вёсцы Гадзілавічы, а колькі было радасці ў жыхароў! У 2011 годзе плануем адчыніць дзверы для наведвальнікаў у публічнай бібліятэцы ў мікраране непадалёку завода "Дыяпраектар".

— Многія ўстановы культуры існуюць сёння не ў належных умовах. Ці дапамагаюць органы мясцовай улады рабіць рамонт памяшканняў? Мо аказваюць фінансавую падтрымку ў набыцці новых кніг беларускіх і замежных аўтараў, айчынных часопісаў і газет?

— Пачну, відаць, з кніг. Выконваючы даручэнне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па фінансаванні бібліятэчных фондаў у памеры не менш 15 працэнтаў са сродкаў мясцовых бюджэтаў, якія выдаткуюцца на ўтрыманне публічных бібліятэк, мы штогод выдзяляем крэдыты на набыццё новай літаратуры, правядзенне падпіскі на перыядычныя выданні. Так, на 1 кастрычніка 2008 года было закуплена больш як 7 тысяч экземпляраў кніг на агульную суму 84 мільёны рублёў. Часопісаў і газет для бібліятэк на другое паўгоддзе 2008 года было выпісана больш як на 97 мільёнаў рублёў. А для ўсіх культустаноў раёна (тут маюцца на ўвазе і сельскія Дамы культуры ды клубы) сёлета на першае паўгоддзе было выпісана перыядычных выданняў на 113,1 мільёна рублёў, на такую ж суму ажыццёўлена падпіска і на другое паўгоддзе. Такім чынам, удзельная вага камплектавання бібліятэчных фондаў у агульным аб'ёме фінансавання бібліятэчнай сеткі склала 27,8 працэнта (у той час, як рэспубліканскі паказчык 15 працэнтаў).

Пашыраецца сетка ўстаноў культуры (цяпер з улікам клубаў, сельскіх Дамоў культуры ды бібліятэк налічваецца 88 аб'ектаў). І працэс рэарганізацыі не стаіць на месцы. Так, зусім нядаўна на базе аграгарадка Ціхінічы адкрыта дзіцячая школа мастацтваў, дзе на сённяшні дзень працуюць тры аддзяленні — музычнае, мастацкае і харэаграфічнае. Эстраднае аддзяленне адкрыта таксама пры Рагачоўскай дзіцячай школе мастацтваў, а Ціхініцкі сельскі Дом культуры ператвораны ў Цэнтр культуры і адпачынку.

Дарэчы, у раёне многае робіцца ў сувязі з рэалізацыяй дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі. Ужо, напрыклад, адрамантаваны ўстановы культуры ў аграгарадках Журавічы (радзіма Андрэя Макаёнка) і Дварцы, для якіх набыта дабротная мэбля, сучасныя музычныя інструменты і гукавая апаратура. Цяпер вядзецца рамонт культурна-асветных устаноў у аграгарадках Побалава, Заполле, Гарадзец, Забалацце. На гэта выдзелена з мясцовага бюджэту 677 мільёнаў рублёў.

Словам, матэрыяльна-тэхнічная база ўстаноў культуры з кожным годам паляпшаецца. Сёлета, напрыклад, выдзелены будынкі для размяшчэння сельскіх бібліятэк і клубаў у Драгунах, Шапчыцах, вырашаецца пытанне аб прадастаўленні ўтульнага памяшкання для Званецкай сельскай бібліятэкі, працягваецца будаўніцтва новага будынка Рагачоўскай дзіцячай школы мастацтваў, планамерна вядзецца добраўпарадкаванне тэрыторый вакол гарадскога Дома культуры і музея Народнай славы.

Дарэчы, пэўнай крыніцай фінансавання клубаў і бібліятэк сталі платныя паслугі ўстаноў культуры насельніцтву. У прыватнасці, у мінулым годзе план быў выкананы на 105,4 працэнта (атрымана 237,2 мільёна рублёў), на 100 працэнтаў выкананы за 9 месяцаў ён і ў бягучым годзе — (на рахунку ўжо 200 мільёнаў рублёў).

— Зразумела, што такое адчувальнае ўдасканаленне матэрыяльнай базы мае на ўвазе ўдасканаленне і працы ўстаноў культуры...

—У нас працягваецца выкананне афіцыйных раённых праграм "Жывая памяць Рагачоўшчыны", "Крыніца" (па захаванні традыцыйнай культуры, промыслаў, рамёстваў), "Бібліятэка — агульнадаступны інфармацыйны цэнтр" ды іншыя.

Створаны ў раёне і належныя ўмовы для выяўлення талентаў: пры ўстановах культуры працуе амаль 300 клубных гурткоў, аб'яднанняў па інтарэсах, суполак, дзе займаецца больш трох тысяч юнакоў і дзяўчат. І, безумоўна, кожны сябра гуртка, суполкі ці студыі жадае быць лепшым. І вось вынік: 14 калектывам мастацкай самадзейнасці Рагачоўскага раёна прысвоены ганаровыя званні народных і ўзорных. Сёлета на разгляд абласной камісіі прадстаўлены лісты аб прысваенні звання народны яшчэ аднаму творчаму калектыву — клубу "Народная песня" гарадскога Дома культуры. На мой погляд, справе актывізацыі дзейнасці клубных аматарскіх суполак і гурткоў садзейнічалі аглядыконкурсы, накшталт: "З народных крыніц", "Мацярынскай славы — светлы арэол" ды вечарыны фальклорнага мастацтва тыпу "Народная творчасць — крыніца жыцця".

Ужо стала добрай традыцыяй і штогадовая цырымонія ўручэння лепшым творчым калектывам Рагачоўшчыны прыза "Залаты Рог".

— Міхаіл Фёдаравіч, ці аддаюць перавагу бібліятэкам перад Інтэрнетам чытачы Рагачоўскага раёна? Творы якіх беларускіх пісьменнікаў карыстаюцца асаблівым попытам?

— Мною ўжо даўно прыкмечана, што моладзь з'яўляецца найбольш актыўнымі чытачамі. Паслугамі бібліятэк нашага раёна штогод карыстаецца 26—27 тысяч чалавек, альбо 41—42 працэнты насельніцтва. Таму мы добра разумеем, што эфектыўнасць дзейнасці бібліятэк у многім залежыць у тым ліку і ад папаўнення іх паліц якасным інфармацыйным рэсурсам і ў першую чаргу — кнігамі: раманамі, аповесцямі, зборнікамі вершаў ды казак. На сённяшні дзень фонд нашай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы (РЦБС) налічвае больш 570 тысяч экземпляраў, сярод якіх — кнігі, перыядычныя выданні, грампласцінкі, дакументы на электронных носьбітах. Што ж тычыцца кніжнага фонду, то ён надзвычай універсальны: мастацкая, грамадска-палітычная, сельскагаспадарчая літаратура, выданні па прыродазнаўчых навуках, філасофіі, астралогіі і гэтак далей. Але, безумоўна, асноўная яго частка — гэта мастацкая літаратура. Значную нішу тут займаюць і творы беларускіх аўтараў. Аднак, калі прааналізаваць, каго з беларускіх пісьменнікаў найбольш чытаюць рагачоўцы, то высвятляецца, што Івана Шамякіна, Васіля Быкава, Генрыха Далідовіча, Васіля Ткачова, Георгія Марчука, Уладзіміра Караткевіча. Дарэчы, нашы чытачы аддаюць перавагу менавіта друкаванай кнізе, а не Інтэрнету.

— На сённяшні дзень не ўсё каштоўнае з духоўнай спадчыны ўдалося захаваць для нашчадкаў... Што зроблена апошнім часам для захавання культурна-гістарычнай спадчыны ў вашым раёне?

— Перш за ўсё, у дзяржаўным спісе сярод гістарычна-культурных каштоўнасцей краіны налічваецца 77 помнікаў даўніны. Сумесна з супрацоўнікамі музея народнай славы правяраем стан іх захавання, складаем уліковыя карткі і пашпарты, якія змяшчаем на электронных носьбітах. На крытычных аб'ектах, занесеных у дзяржаўны спіс гістарычна-культурнай спадчыны, вядуцца работы па рэканструкцыі і рэстаўрацыі (як, напрыклад, у будынку былога Рэальнага вучылішча), распрацавана каштарысная дакументацыя па ўпарадкаванні брацкай магілы ў аграгарадку Ціхінічы, будынка былой Земскай управы і парку ў вёсцы Кісцяні. У цэнтры горада завяршаецца аднаўленне алеі герояў.

Вяртаецца з забыцця імя вядомага пісьменніка і грамадскага дзеяча XIX — XX стагоддзяў У. Кігна-Дзедлава, які пахаваны на могілках у вёсцы Фёдараўка.

Дарэчы, сярод сельскіх устаноў культуры намі быў праведзены раённы агляд-конкурс па распрацоўцы турыстычных маршрутаў пад назвай "Хай застанецца спадчына". Вынікі прыемна парадавалі: было прапанавана аж 19 турыстычных маршрутаў. А нядаўна музеем народнай славы ў межах раёна распрацавана 12 новых турыстычных маршрутаў пад назвай "Пісьменнікі-землякі". З гэтай нагоды ў Курганскай і Рыскоўскай сельскіх бібліятэках афармлены літаратурнакраязнаўчыя экспазіцыі, прысвечаныя жыццю і творчасці пісьменніка-земляка У. Кігна-Дзедлава. У чэрвені бягучага года ў вёсцы Курганне прайшло вялікае раённае свята фальклору, прысвечанае творчасці маці пісьменніка — Лізавеце Іванаўне Кігн, якая ў свой час пабудавала школу для мясцовых дзяцей, сабрала і выдала ў свет зборнік беларускіх народных песень.

— Міхаіл Фёдаравіч, падзяліцеся, калі ласка, планамі развіцця раёна ў культурна-асветніцкім кірунку на бліжэйшы час.

— Свае перспектыўныя планы, як я ўжо казаў вышэй, мы цесна ўвязваем з рэалізацыяй дзяржаўных праграм па адраджэнні вёскі, развіцці малых гарадоў і агратурызму. Асаблівая ўвага будзе нададзена арганізацыі адпачынку моладзі. Як і раней, будзем таксама працаваць над удасканаленнем выканаўчага майстэрства самадзейных творчых калектываў.

Гутарылі
Міхась КАВАЛЁЎ,
Валянцін БАРЫСЕВІЧ

Наканаванае...

Бібліятэкары — людзі звычайныя, з уласцівымі ўсім сумненнямі і слабасцямі, нават памылкамі. Але пры гэтым — і асобы незвычайныя. Менавіта так можна сказаць і пра Алу Васільеўну Раманюк, якая ўсё сваё жыццё прысвяціла бібліятэчнай справе. Яна ведае, што служэнне кнізе прыносіць не толькі шчасце, але, часам, і скруху. Раздумваючы над сваёй прафесіяй, прыкмячае, што сярод яе прадстаўнікоў ёсць тыя гаротнікі, якія ўзяліся за бібліятэкарскую справу спешна, неабдумана, па выпадковым збегу абставінаў. Але такіх — меншасць. У асноўным працаўнікі кнігі — людзі шчаслівыя, бо разумеюць сваю культурніцкую місію, самаходзь бяруць на свае (часцей за ўсё — слабыя, жаночыя) плечы анёльскія абавязкі вестуноў і без стомы шчыруюць сярод друкаваных выданняў.

Пачала Ала Васільеўна свой прафесійны шлях загадчыцай маленькай вясковай бібліятэкі на Валыншчыне ў 1958 годзе. Але галоўная частка апостальскага служэння кнізе Алы Васільеўны прайшла ў Брэсце. Шчыравала ў бібліятэцы імя Янкі Купалы, займала пасаду старшага бібліятэкара інфармацыйна-бібліятэчнага цэнтра пры Брэсцкім аблвыканкаме, потым — дырэктара цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Брэста. Узначальвала пры гэтым гарадскую бібліятэку імя А. С. Пушкіна. Кіраўнічая пасада, як вядома, не малое выпрабаванне для чалавека. Медныя трубы славы неаднойчы рабілі з непрыкметных людзей самаўлюбёных нарцысаў. Алу Васільеўну падобны нарцысізм шчасліва абмінуў. Яна, чалавек высокага арыстакратызму і шляхетнасці, так і засталася тою ж вясковаю бібліятэкаркай, поўнай творчых задумак.

Брэст для Алы Васільеўны — не проста геаграфічны пункт. Ён — духоўны яе бацька. Горад для яе — гэта найперш чытач, які пры ўсёй сваёй шматаблічнасці мае нешта асаблівае, непаўторнае. Брэст "прыходзіў" у бібліятэку, у дырэктарскі кабінет Алы Васільеўны, пытаўся, прапаноўваў, спавядаўся не толькі пра кнігі, але, часам, і пра абставіны асабістага свайго жыцця. І гаспадыня бібліятэкі прымала голас Брэста з разуменнем, з чароўнай дабрынёю чалавека, які разумее чужы боль, бо і сама ведае, што такое цяжар няўдач і непаразумення.

Сярод іншых кніг жывуць у бібліятэцы "прапісаныя" Алай Васільеўнай выданні брэсцкіх аўтараў. Гэтае "прапісванне" стала адной з вялікасных традыцый, якія прыжыліся і ў іншых бібліятэках. "Ну што тут асаблівага, — скажа хтосьці. — Збіранне кніг мясцовых літаратараў — паўсядзённы абавязак бібліятэкі". Так, абавязак. Але з якім запалам, на якой сардэчнай ноце робіць усё гэта Ала Раманюк разам з калегамі! Яны паўсядзённы абавязак ператвараюць у нязгаснае свята ўслаўлення кожнага таленавітага земляка.

Прэзентацыі, якія наладжвае Ала Васільеўна, адметныя. Гэта — не прэзентацыі, а сябрыны, вечарыны, пасядзелкі, дзе ёсць месца і для сур'ёзнай размовы, і для жарту, і для прадстаўлення кнігі. На такіх сустрэчах Алы Васільеўны як бы няма. Сядзіць непадалёку, не імкнецца "задаць накірунак" размове гасцей бібліятэкі. Але ўсе, хто прыйшоў, добра разумеюць, што падрыхтоўкай вечарыны займалася менавіта Ала Васільеўна — майстар нябачнай, несвяточнай, чарнавой працы. А з другога боку, ніхто не стрымае яе, калі трэба выказацца ў падтрымку чалавека іншага, які хоць і сапраўды годны, але, як і бывае нярэдка, безабаронны. Падтрымлівае, дапамагае, бароніць Ала Васільеўна не заўсёды словам: гэтая мудрая жанчына — можа, ад вопыту жыцця, можа, ад Бога, ведае, што часам дапамагае простая далікатнасць, асцярожнае, беражнае стаўленне да пакрыўджанага.

Можа, таму і стала Ала Васільеўна менавіта бібліятэкарам: кнігі для яе — не крыніцы халоднай эрудыцыі, а жывыя дарадцы ва ўсіх жыццёвых перыпетыях. Пра свой жа лёс Ала Васільеўна гаворыць з той доляй мужнай стрыманасці, якая выяўляе душу высокую і самастойную. Сваіх няўдач на чужыя плечы яна не перакладала ніколі, абмяркоўваць аблічча сваіх блізкіх звычкі не мае. Адкрытая для людзей, яна любіць Брэст, а Брэст адказвае ёй узаемнасцю.

...Прыцемкі. Заціхае стомлены горад. Ала Васільеўна ідзе з працы. Асенняе лісце падае ёй пад ногі. Жыццё людзей, што прыцішыліся цяпер у кватэрах, уяўляецца бібліятэкару вялікаю вечнаю кнігаю. Ідзе з працы шчаслівы чалавек.

Юрый ПАТАЛКОЎ

Тое, што застаецца...

Усё больш празаікаў пераступае сёння тую ўмоўную мяжу, якая спалучае (а не падзяляе!) прозу і паэзію, імкнучыся знайсці новую мастацкую мову для выяўлення сваіх думак і пачуццяў. Назіраецца між тым працэс і супрацьлеглай скіраванасці. Справа, мабыць, у тым, што сінтэтычнае паяднанне крэатыўных магчымасцей гэтых двух відаў творчасці спрыяе больш поўнаму, цэласнаму ўвасабленню асабовасці аўтара і яго мастацкага патэнцыялу. Да таго ж, яно адпавядае вядучым тэндэнцыям сучаснага літаратурнага развіцця, імкненню да мастацкага універсалізму.

Ірына Жарнасек, прызнаны і сур'ёзны празаік, таксама апошнім часам звярнулася да паэтычнага спосабу выражэння сваіх адносін да свету. Пры гэтым трэба заўважыць, што *сумежнасць* і *пераходнасць* выступаюць у яе зборніку вершаў "Шукаю Цябе" ўвогуле як сутнасныя і вызначальныя якасці. Імі абумоўліваецца і сама вершаваная форма твораў, паколькі верлібры захоўваюць у сабе многае ад магчымасцей празаічнага выказвання. У тэматычнай сферы таксама істотнае значэнне мае здольнасць аўтара да спалучэння і супастаўлення розных духоўных і жыццёвых з'яў.

Апошнім часам даволі часта з'яўляюцца ў нас вершы і нават асобныя паэтычныя зборнікі, у якіх раскрываюцца хрысціянскія вобразы і матывы. Тым не менш кніга І. Жарнасек прыкметна вылучаецца на гэтым фоне сваёй канцэптуальнай пэўнасцю, выразнасцю выяўлення аўтарскага пункта гледжання і цэльнасцю пачуццёвага перажывання. Спавядальнасць, як уласцівасць лірыкі, у дадзеным выпадку ўяўляецца чымсьці значна большым — тым, што наўпрост звязвае чалавека з самымі істотнымі для яго асновамі светаўладкавання. З самой назвы зборніка вынікае скіраванасць лірычнага маналога, яго звернутасць да **Таго**, хто з'яўляецца для верніка першапрычынай усяго існага і пабуджальнікам духоўнага дасканалення. Гэта своеасаблівы паэтычны дзённік верніка, у якім усё так або інакш спалучана з галоўным, прадвызначальным. Прытым варта падкрэсліць, што аўтар у сваім звароце да Бога не выяўляе той апанаванасці, якая даходзіла б да самазабыцця, ігнаравання рэальных жыццёвых варункаў. Якраз наадварот. Усе, нават найдрабнейшыя, "празаічныя", побытавыя абставіны жыцця пастаянна знаходзяцца ў полі зроку І. Жарнасек, змушаюць да суаднясення іх з вышэйшымі духоўнымі ідэаламі.

У першым жа вершы зборніка, дзе падаецца малюнак ранішняга малебна ў касцёле, духоўна ўзвышанае, замілаванае пачуццё, якое выклікаюць дзеці, схіленыя ў малітве, абцяжарваецца згадкай пра іх бацькоў, для якіх яшчэ не настала прасвятленне. Аднак, заўважае аўтар, ёсць надзея, што якраз дзіцячыя малітвы могуць, урэшце, абудзіць і агрубелыя сэрцы дарослых. Святыня, у якой вернікі далучаюцца да найвышэйшай ласкі, непасрэдна звяртаючыся да Збаўцы, не з'яўляецца чымсьці герметычна адгароджаным ад зямнога, паўсядзённага свету. Гэта вельмі наглядна выяўлена ў вершы "Літанія", у якім побач суіснуюць духоўна асвечаныя з'явы і сцэны побытавага характару:

За іхнімі спінамі — трактар,
матацыкліст бесклапотны
загрыміць вецярком шалёным...
Але той,
хто тут стаў на калені,
не зважае,
бо свой мае пільны клопат...

У гэтым вершы аўтар, дарэчы, спрабуе паказаць рэальнае ўздзеянне на заблукалыя душы таго ратавальнага святла, якое зыходзіць ад святынь. Яно можа здавацца нават выпадковым. "П'янтос вясковы", якому ніколі не выпадала "заўважыць крыж пры дарозе", аднойчы спыніўся ля храма, прыслухаўшыся да малітвы. І штосьці абудзілася жывое ў яго прыспанай душы, "сціснула сэрца прапітае нязнанай раней гаркотаю...". Значыць, заўсёды застаецца ў чалавека магчымасць самаабнаўлення, пераасэнсавання, змянення шляху.

Для паэтычных твораў І. Жарнасек характэрны якраз такі, шырокі погляд на чалавека, яго душэўную прыроду і стасункі з боскім пачаткам. Чалавеку не дадзена папярэдняга ведання боскага прадвызначэння, і таму ён павінен заўсёды быць падрыхтаваным да адкрыцця ў сабе і ў свеце чагосьці раней неспазнанага. Згодна з такім падыходам выстройваюцца і асабовыя дачыненні аўтара з галоўным адрасатам яго твораў — Творцам усяго існага. Гэтым вытлумачваецца і, здавалася б, парадаксальная назва кнігі — "Шукаю Цябе". Бо пра пошукі Бога заяўляе, мяркуючы па ўсім, якраз вельмі цвёрды, пераканаты вернік. Шукаць аднойчы і назаўжды знойдзенае? Так, сцвярджае паэтэса, менавіта такімі пошукамі, пастаяннымі і настойлівымі, павінен займацца чалавек, калі ён жадае наблізіцца ў найбольш магчымай ступені да боскай сутнасці быцця. Бог — ва ўсім, і, аднак, вельмі важна ажыццявіць пэўныя свядомыя намаганні дзеля спазнання гэтай ісціны, "зрабіць толькі крок"...

У кнізе выразна абазначаны дзве ступені далучанасці да веры — характэрная для свету дзяцінства і для дарослых. Калі для апошніх больш уласцівы пошукі і сумненні, ваганні і роздумы, памылкі і раскаянні, то дзеці ўспрымаюць божую ласку і апеку даверліва і непасрэдна. Зусім невыпадковым кампазіцыйным рашэннем уяўляецца змяшчэнне твораў, у якіх увасоблена якраз гэтая дзіцячая, наіўная і безаглядная вера, напачатку і ў канцы кнігі. Звяртаецца аўтар і да згадак пра сваё ўласнае маленства, як, да прыкладу, у вершы "Лесвіца", дзе яна пяцігадовай дзяўчынкай уздымаецца ў сне па лесвіцы, каб папрасіць Бога адмяніць смерць. З пункта гледжання цяперашняй сталасці і разважнасці такое памкненне падаецца наіўным і непамысным. Хоць аўтар і сёння не можа зрабіць адназначны вырак ("Ды, на жаль, ці на шчасце, / не ўдалося агараць мне / далёкі й высокі шлях"...).

Наогул жа на ўсім працягу жыцця чалавека ніколі, мабыць, дарэшты не знікае, не растрачваецца гэтае першаснае, наіўна-даверлівае стаўленне да быцця. З вершаў І. Жарнасек вынікае, што і ў няпростых жыццёвых абставінах такія пачуцці і адносіны ўмацоўваюць душэўныя сілы яе лірычнай гераіні і іншых герояў. Трэба зазначыць, што старонкі кнігі даволі густа заселены людзьмі. Пранікненню ў іх унутраны свет, выяўленню іх глыбока чалавечай сутнасці садзейнічае, несумненна, празаічны вопыт пісьменніцы. Яны розныя, яе героі, сярод іх і самаахвярныя вернікі, як жанчына, што ратуе святую выяву ад здзеку вандалаў, і тыя, для каго духоўныя каштоўнасці не з'яўляюцца пакуль што пуцяводнымі арыенцірамі. Усе няпростыя сітуацыі, складаныя характары паяднаны пазіцыяй аўтара, якая найбольш строгім і патрабавальным суддзёю з'яўляецца найперш сабе самой. Паколькі гаворка вядзецца пра самае важнае, сутнаснае.

Вершы І. Жарнасек пазбаўлены знарочыстых упрыгожанняў. Яны гранічна набліжаны па сваёй мове да звычайнага людскога маўлення. Ды тут і сапраўды квяцістая "паэтычнасць", якая ў нас яшчэ часта прымаецца за "ўзор" сапраўднага слоўнага мастацтва, была б недарэчы. А хто сказаў, што паэзіі неўласціва менавіта вось такое наўпроставае, шчырае і спавядальнае праманленне? Стварыць жа яскравы паэтычны вобраз, які б адразу адклаўся ў памяці, аўтар умее. Зусім небагата слоў спатрэбілася ёй для таго, каб сказаць вельмі многае пра перавагу духоўнага над мітульгой дробнага і неабавязковага ў наступным вершы:

З усіх нашых сходаў
пісьменніцкіх
засталіся
трывала ў памяці
кветкі
на прыполе
Ніны Мацяш.

Што прыналежнае незаспакоенаму духоўнаму пошуку, заўсёднай празе самаўдасканалення і спазнання, тое і застаецца.

Яўген ГАРАДНІЦКІ

Метафізіка бегу



"Бег", так называецца раман Аляксея Талстова, што пабачыў свет у выдавецтве "Галіяфы". Як для сучаснага твора назва някідкая і разам з тым дзёрзкая. А калі ўзяць пад увагу яшчэ і высакароднае прозвішча аўтара, то можа падацца, што мы маем справу з чарговай пародыяй на кніжную класіку — распаўсюджанай сярод маладых авангардыстаў забавай. Але не варта спяшацца з высновамі: у дадзеным выпадку ўсё самабытнае — і прозвішча пісьменніка, і гучная назва твора.

"Усё ўжо зразумела. Далей чытаць няма неабходнасці. Усім, хто пачынае займацца такімі справамі, вядома, што нічога новага напісаць сёння немагчыма, усё ўжо створана. Навокал толькі чарговыя перафразіроўкі і абсмоктванні архаічных сэнсаў. А пайшлі вы ўсе... Бягу, а значыцца, існую".

Гэтак безапеляцыйна Аляксей Талстоў заяўляе пра сябе з самых першых старонак твора. Правакаваць на думкі — вось галоўная задача яго прозы, адсюль наяўнасць у ёй нецэнзурнай лаянкі і крамольных, нярэдка багаборніцкіх заклікаў да палемікі з чытачом. Відаць, аўтар, як і многія дзеячы актуальнага мастацтва, кіруецца думкай, што да свядомасці сённяшняга чалавека трэба дакрычацца — інтэлектуальныя развагі і чыстай вады эстэтыка, на жаль, не кранаюць струнаў яго душы. Гэтыя пікантныя акалічнасці маглі б адпудзіць прадстаўнікоў старэйшага пакалення, калі б яны не былі ўплеценыя ў насычаны грунтоўным роздумам аповед. Нездарма акадэмік Уладзімір Гніламёдаў, выступаючы на прэзентацыі рамана, супрацьпаставіў нях хай і экспрэсіўную, але глыбокую прозу Талстова нігілістычным высілкам некаторых маладых літаратараў.

У любым выпадку, выхад дадзенай кнігі — гэта слушная для беларускай літаратуры падзея. Прыкметных з'яў у буйной прозе сёння наогул назіраецца мала, асабліва звязаных з творчасцю маладых пісьменнікаў. Таму раман "Бег" справядліва можна назваць свежым подыхам айчыннага пісьменства.

Акрамя змястоўнай глыбіні, у сваёй першай кнізе Аляксей дэманструе нядрэннае валоданне словам, што яскрава сведчыць пра наяўнасць літаратурнага таленту. Мастацкай мове рамана ўласціва самабытная паэтыка з ухілам у сучасныя рэаліі: "кананада недапалкаў знервованага ў чаканні тралейбуса грамадства", "святло агромністага пратону праз жалюзі", "страбаскапічныя маланкі". Досыць неаднастайны паводле зместу 200-старонкавы тэкст твора, тым не менш, не пазбаўлены прыкметаў графаманіі. У некаторых выпадках развіццё сюжэта зацягваецца да непрымальнасці, а слабая канцэнтрацыя дзеяння яшчэ больш абцяжарвае чытанне кнігі. Але дадзеныя хібы лёгка пераадольваюцца, калі зрабіць папраўку на перавагу лірыка-суб'ектыўнага пачатку ў творы.

Неаднародны раман і па стылі, што цалкам адпавядае нормам постмадэрновай літаратуры. Праўдзівыя урбаністычныя выявы трансфармуюцца ў сюррэалістычным рэчышчы, а напрыканцы твора аповед наогул зрушваецца ў бок прытчавасці ў духу Паўло Каэльё. На ўскраіне горада, у якім адгадваецца Мінск, з'яўляецца міфалагічная пустыня і такое ж казачнае мора, і рэальныя вобразы сустракаюцца на гэтай мяжы з алегарычнымі.

У творы маецца шэсць паралельных сюжэтных ліній, паміж сабой лагічна не звязаных, якія, тым не менш, выпадкова перасякаюцца, нібы прамыя ў геаметрыі Лабачэўскага. Адчайны юнак Пабла, які кідае выклік усяму свету, гаротная студэнтка Яна, што ператвараецца ў маньяка-забойцу, дэградуючы інтэлігент Пал Палыч, богападобны юродзівы Юзік, сталы наведвальнік гарадскога сметніка, шэсць каўбоеў, што сышлі з экрана старога вестэрна, і тры хлопцы-падарожнікі на марскім узбярэжжы — што можа аб'ядноўваць гэтых непадобных адзін да аднаго герояў, лёс кожнага з якіх уяўляе сабой твор асобнага жанру? Звязвае іх тое, што ўсе яны кіруюцца ірацыянальным імкненнем да бегу па прасторы ўласных, абсалютна адрозных жыццяў.

"Людзі ставяць сабе мэты, дасягаюць іх і зноўку ставяць новыя, праводзяць усё жыццё, спрабуючы дагнаць штосьці, зрабіць штосьці такое... а што, ніхто з іх дакладна не ведае. Людзі бягуць".

Гэта думка старая, як і ўвесь гэты свет. Зрэшты Аляксей не імкнецца паведаміць чытачу нешта новае, у адваротным выпадку ён проста займаўся б фікцыяй. Яго найперш хвалюе пытанне, не *што* пісаць, а *як* — свежа, эмацыянальна, завострана. Аб'ект яго даследавання — бег: бег як модус быцця, як прынцып існавання цывілізацыі, бег без канца і пачатку, без мэты і без прычыны. Пісьменнік ні ў якім разе не імкнецца вырашыць метафізічную праблему бессэнсоўнасці бегу — інтэлектуальнымі высілкамі тут нічога і не даб'ешся. Але шляхам мадэлявання ўласнай мастацкай рэчаіснасці ён раскрывае ўсю яе загадкавую парадаксальнасць.

Алесь СУХАДОЛАЎ

Непісьменнае пісьменства, альбо Сіндром Бронскага

И вот мне непонятно, как вы можете писать, если вы не умеете даже говорить по-русски. Что это за "пара минуточек", "за кур"? Вы, вероятно, хотели спросить "насчёт кур"?

М. Булгаков «Роковые яйца»

Гартаючы старонкі некаторых выданняў з пазнакай «літаратурна-мастацкае», я ўспамінаю рэакцыю булгакаўскага прафесара Персікава на пытанне журналіста Альфрэда Бронскага і спрабую ўявіць, што здарылася б з прафесарам, калі б ён меў магчымасць пазнаёміцца з такой "літаратурай". Але спачуваць трэба не яму, а тым, хто спажывае такую вось "цяжкатраўную" прадукцыю:

Я издам свои новые книжки,
Расплывутся они, словно плотки,
Убегут, как из школы мальчишки,
Обо мне сочинённые плётки.

І, паверце, «издаст», бо з паўдзесятка ягоных выданняў ужо «расплылись, словно плотки», па бібліятэках.

Ці не праўда, гадоў пятнаццаць таму дзяржаўныя выдавецтвы, дзе заўжды працавалі (і працуюць) высокапрафесійныя рэдактары, выпусціць такое ў свет палічылі б для сябе за ганьбу.

Але вось з'явіліся ў нас шматлікія прыватныя выдавецтвы, і для рупліўцаў пяра з сіндромам Бронскага настала раздолле. Стукнуўшы *"дзверру"* чарговай "несправядлівай" рэдакцыі, кінуліся яны ў тыя з выдавецтваў, што працуюць па прынцыпе "за вашы грошы — любая ваша прыхамаць". Ну, а выбіваць-клянчыць грошы на выданне сваіх кніг такія аўтары ўмелі, і таму ў хуткім часе панеслі яны "ў народ" свае опусы, прафануючы літаратурную творчасць і пісьменніцкае званне.

Супраць графаманскай вакханаліі выступалі ў друку Уладзімір Саламаха, Віктар Гардзей, Юрый Сапажкоў, Казімір Камейша (дасюль успамінаецца ягоны артыкул "Пугі яму, пугі!", змешчаны ў адным з леташніх нумароў "Вожыка").

Але былі ды і цяпер ёсць тыя, хто чамусьці лічыць, быццам крытыкаваць чалавека, які раптам вырашыў стаць пісьменнікам, нават калі ён зусім не ўмее пісаць, нельга. Вось калі сталяр зладзіць крываногі зэдлік, то яго не толькі пакрытыкаваць, але і пакараць трэба (як жа, скалечыцца нядоўга), а вось бракароба ад літаратуры чапаць не трэба, бо "гэта не гуманна".

З ласкі такіх гуманістаў і працягваюць "выплюхвацца" з выдавецтваў бяздарныя творы. Непісьменны пісьменнік — прыкрая і, на жаль, даволі распаўсюджаная з'ява ў сучасным літаратурным працэсе.

Ні ў якім разе не хачу ганіць прыватныя выдавецтвы ўвогуле. Сёння, калі нават даволі вядомы пісьменнік мусіць некалькі гадоў чакаць выхаду сваёй кнігі ў дзяржаўным выдавецтве, прыватныя ў пэўнай ступені ратуюць сітуацыю... Хіба мала добрых кніг выпушчана выдавецтвамі "Кнігазбор", "Логвінаў", "Про Хрысто", "Чатыры чвэрці", "Тэхналогія", "Галіяфы"? Але ж праўда і тое, што ўсе кніжкі *зусім* непісьменных, *амаль* непісьменных і *не зусім* пісьменных аўтараў выйшлі менавіта ў прыватных выдавецтвах, найперш тых, дзе не вельмі кваліфікаваныя рэдактары, або (з-за эканоміі?) іх там не трымаюць увогуле.

Для мяне застаецца таямніцай, як такім выдавецтвам удаецца гэтак лоўка разрэкламаваць якую-небудзь шэранькую кніжку, што недасведчаны чытач, паверыўшы, быццам кніжка тая — нешта выключнае, подбегам імчыць у кнігарню ці бібліятэку.

Гэтая таўшчэзная — ажно семсот старонак! — кніжка трапіла і да мяне. Невыпадкова. Мая добрая знаёмая, аматарка чытання, спыталася: *"А як табе творы Батраковай?"* Пачуўшы, што Батракову я не чытала, асуджальна пахітала галавой: *"І табе не сорамна?! Ты ж філолаг ды і пісьменніца ў дадатак!"*

І зрабілася мне соромна...

І пайшла я ў бібліятэку, дзе папрасіла "што-небудзь Батраковай".

Калі ўбачыла прапанаваную (дарэчы,"па блату", бо "ўсе хочуць Батракову") **"Территорию души"**, то стала мне зусім няёмка: сапраўды, як жа гэта я, "філолаг і літаратарка" да сённяшняга дня не прачытала кнігу, якая перавыдадзена ў Беларусі ажно ў чацвёрты раз?! Трэба было тэрмінова выпраўляць становішча...

Разгарнуўшы раман, прабегла вачыма анатацыю і спатыкнулася на сярэдзіне першага ж сказа: *"...точно описана автором психология взаимоотношений мужчины и женщины, их нелёгкие судьбы и непростые характеры"*. Як доказ таго, што *"психология, судьбы и характеры* ***описана***" і сапраўды *"точно"*, аўтар прыводзіць факт чацвёртага перавыдання рамана. Вельмі "лагічна"!

Сем наступных сказаў анатацыі ўяўляюць сабою пытанні кшталту *"как не потерять?"*, *"как вернуть?"*, *"как в очередной раз простить?"* (каханага чалавека — **В. К.**). У апошнім жа, дзевятым, аўтар запэўнівае, што *"подсказки к ответам на эти вопросы"* чытач знойдзе ў рамане.

Словам, калі ў каго з вас ёсць азначаныя праблемы, хуценька прачытайце "Территорию души" (700 старонак!), і ўсё ў вас будзе "о'кей". Насцярожылі мяне і занадта прэтэнцыёзныя для азначанай тэмы загалоўкі частак рамана. А тут яшчэ характэрныя для большасці няўдалых выданняў шматлікія аўтарскія прызнанні-падзякі за дапамогу, падтрымку, натхняльныя водгукі і г. д. Жаданне чытаць "Территорию души" адразу неяк аслабла, і я адклала кніжку ўбок. Можа, неўзабаве я забылася б і на імя Наталлі Батраковай, калі б раптам не пачула яго па радыё, не ўбачыла на экране тэлевізара і на старонках вельмі аўтарытэтнага і вельмі паважанага мною выдання. Дакараючы сябе за паспешлівасць і павярхоўнасць думкі, я зноў разгарнула кнігу.

Спачатку вырашыла прачытаць вершы, бо яны папярэднічалі кожнай з шасці частак рамана і, відаць, з'яўляліся свайго роду эпіграфамі. Прачытала. Вершы агаломшылі мяне поўным занядбаннем такіх паняццяў, як рыфма, рытм, прымітыўнасцю думкі, немілагучнасцю некаторых радкоў і мноствам надрыўна — істэрычных *"кто?!"*, *"куда?!"*, *"почему?!"*. Працытую толькі два ўрыўкі.

Так всё же почему?!
Невидима, нетленна
Стоит стена,
и ей дано нас разделять!
Как сложно объяснить,
на что она похожа,
Нельзя перешагнуть
(а мо паспрабаваць? — **В. К.**),
***снести**, разбить, **убрать**.*

...И подводила грустные итоги:
Всего достигла,
всем сумела доказать,
Что имидж её вовсе не случаен.
Но в мире сильных одиноко.
Не понять,
Не заглянуть в бездонные глубины
Души...

Галоўнай гераіне рамана Ганне Кругловай, відаць, так, як і Наталлі Батраковай, *"жутко хочется писать"*. І яна піша. Вершы. Некаторыя цішком падкладае ў паперы свайму шэфу і па сумяшчальніцтве палюбоўніку (праўда, не вельмі ўважліваму) Косцю — Канстанціну Крылову:

Прости за всё, в чём не права,
Как грустно, что и ты причастен
К разгрому в месте, где жила
***Надежда в призрачное счастье**.*

Як бачыце, вершы Ганны Кругловай такога ж узроўню, як і тыя, што змешчаны перад часткамі рамана. Як я зразумела, усе яны (а вершаў у кнізе каля двух дзесяткаў) належаць пяру аўтаркі дылогіі.

Пасля знаёмства з паэтычнымі здольнасцямі Наталлі Батраковай я прымусіла сябе прачытаць раман. Чыталася цяжкавата не толькі з-за прадузятасці, якая паспела авалодаць мной, але і з-за шматлікіх моўных "ляпаў". А іх у рамане, што называецца, на любы густ:

*"Раздавшийся вечером звонок в дверь застал её за обычным в последние дни занятием (?! — **В. К.**) — скорченной над унитазом"*. *"Прошлым летом собирались с однокурсниками, твоих маму с папой вспоминали, и всем было неловко, что никто не знает, где их дочь"*. *"Ну и день! — чертыхнулся Костя, быстро решая, как себя вести, рассмотрев майорские погоны за стеклом"*.

А як вам вось такое:

"...с головой загрузив себя работой"; *"...влюблённостью к этой удивительной девушке"*; *"...патриотизм к родной стране"*; *"...ароматный запах"*; *"...ужом крутит тело от горьких мук"*; *"...очень искренне лучились её глаза от счастья"*; *"...всем **отъездам** Кости **предшествовала** бурная, страстная **ночь**"*...

Заслугоўваюць увагі і моўныя сродкі, якія аўтарка скарыстоўвае для апісання сваёй улюбёнай і, на яе думку, вельмі станоўчай гераіні рамана Ганны Кругловай:

"удивительно красивая девушка", *"забавная девушка"*, *"прекрасная, чистая, симпатичная"*, *"высокая интересная девушка"*, *"умная, смелая, гордая девушка"*. Не абы-што, як бачыце. Акрамя таго, у некаторых выпадках адчуваецца неадпаведнасць паміж аўтарскай характарыстыкай і ўчынкамі гераіні або яе, так бы мовіць, статусам. Возьмем два апошнія словы з характарыстыкі Ганны: *"гордая"* і *"девушка"*.

Не ведаю, пра якую "гордость" Ганны можна гаварыць, калі варта палюбоўніку *"крепко прижать"* яе да сябе (што ён заўжды робіць адразу ж пасля чарговага свайго паскуднага ўчынку), як яна, млеючы ад *"желания"*, забываецца пра ўсе прыніжэнні. А прыніжэнняў не злічыць: ад слоўных абраз і балючага хапання за плечы да грубага згвалтавання.

"— Ах так! — гневно произнёс Костя и, схватив Анну обеими руками, бросил на стоявшее в углу кресло. — ... Здесь можешь кричать, — гневно выдохнул он, рванул на ней юбку.

Анна продолжала сражаться, всё ещё не веря в то, что он собирается сделать... и, о Боже! Вопреки всем обстоятельствам, сладострастная волна пронзила её тело".

Ну, а што наконт *"девушки"*, то гэтае слова ў адносінах да Ганны правільным будзе ўжываць толькі ў якасці зварота да яе незнаёмых людзей (на вуліцы, у транспарце і г. д.). Пастаяннае ж аўтарскае *"девушка"* пра трыццацігадовую жанчыну-развядзёнку з дзіцем, жаночымі хваробамі і цяжарнасцямі гучыць недарэчна.

Хачу сказаць, што я спынілася толькі на нязначнай частцы моўна-стылістычных агрэхаў.

Наталля Батракова, таксама, як і ўзгаданыя раней працаўнікі крытыкі, лічыць, што ні пра які твор нельга гаварыць "это плохо" і "это не нравится", нават, пра дзіцячыя "каляки- маляки". Ну, а калі тыя "каляки-маляки" хтосьці пачне абвяшчаць шэдэўрамі і выстаўляць побач з шэдэўрамі сапраўднымі, тады як?

Не, назваць "калякамі-малякамі" "Территорию души" было б несправядліва. Калі б як след адрэдагаваць тэкст, скараціць яго (у першую чаргу пазбавіцца ад "вершаў"), то атрымалася б ладная "повестушка" для звычайных дамашніх гаспадынь. Зрэшты, гэта мая асабістая думка.

Вось пішу і нібыта наяве чую нечае зласліва-насмешлівае: "Гэта ўсё ад зайздрасці: раманы Батраковай папулярныя, не тое што...".

Адказваю: быць папулярным зусім не азначае быць вартым. Ведаеце, якія кнігі самыя папулярныя сярод наведвальнікаў нашай бібліятэкі? Так званыя "любоўныя раманы", дзе на вокладках яркія выявы напаўголых залатавалосых прыгажунь у абдымках смуглявых мускулістых мужчын. Такі вось узровень нашай чытацкай культуры. Што ж да зайздрасці, то, прызнаюся, здараецца іншым разам такі грэх. Толькі зайздрошчу я не аўтарам сумніўных твораў, якія "распіяраны" да ўзроўню ледзь не эпахальнай з'явы (тут у мяне зусім іншыя пачуцці: няёмкасці і абурэння), а цікавым, арыгінальным пісьменнікам, такім, напрыклад, як Алена Брава з **"Каменданцкім часам для ластавак"**, **"Менадай і яе сатырамі"** — годнымі ўзорамі **СУРЁЗНАГА** пісьменства. Думаецца, талент Алены Брава ўжо заўважаны і чытачамі, і крытыкамі. Неўзабаве ў "Мастацкай літаратуры" павінна выйсці яе новая, другая па ліку кніжка. Гэй, "піяршчыкі"! Дзе вы? На якой цяпер *"территории"*? Хаця не! Ёсць у нас, на шчасце, пакуль бясплатныя бібліятэкі, для якіх прапаганда прыгожага пісьменства — святы абавязак, як, дарэчы, і праца па выхаванні мастацкай культуры. Ды вось бяда: не ўсе бібліятэкары ў стане адрозніць не толькі "чытво" ад літаратуры, а нават прымітыўную непісьменную пісаніну ад пісьменства прыгожага. Так што не здзіўляйцеся, калі на паўдарозе да стэлажа вас спыніць перасцерагальны воклічык: *"Вы куда? Там всё только белорусское. Вот возьмите лучше новый роман N..."*

Валянціна КАДЗЕТАВА

Ад рэдакцыі

Змясціўшы артыкул пісьменніцы Валянціны Кадзетавай на старонках газеты, рэдакцыя знаёміць чытача з прафесійным поглядам на дылогію Наталлі Батраковай "Территория души". Аднак ацэнкі прафесіяналаў — пісьменнікаў і крытыкаў — не заўсёды супадаюць з ацэнкамі шараговых чытачоў. Калі ў некага ёсць іншыя меркаванні, "ЛіМ" гатовы распачаць дыскусію. Чакаем водгукаў ад аматараў творчасці Н. Батраковай.

Трапяткая душа ў далонях

Менавіта такое ўражанне ўзнікае, калі трымаеш у руках кнігу Стасі Наркевіч "Настальгія". Сакавітая, жывая, па-сапраўднаму матчына беларуская мова. Нават у абсалютна гарадскога чалавека вясковыя сюжэты выклікаюць пачуццё, нібыта ён усё жыццё пражыў побач з героямі апавяданняў.

Пераходзіш разам з аўтарам ад лёсу да лёсу, ад хаты да хаты, і здаецца — гартаеш старонкі асабістага жыцця, багатага на сустрэчы і падзеі.

З большасцю Стасіных герояў мы знаёмыя па публікацыях у мясцовай перыёдыцы і штотыднёвіку "Літаратура і мастацтва". Не пакідае думка: дарэмна Настасся Лазебная (сапраўднае імя аўтара) марнавала столькі часу на рэдактарскай пасадзе ў публіцыстычных выданнях. Ёй бы не адрывацца ад пісьмовага стала, каб як мага больш выплеснуць з перапоўненай душы на паперу, каб паспець адарыць чытача самым галоўным сваім багаццем — матчыным словам.

Дарэчы, для чытача на нейкі час Стасіна вёсачка становіцца роднай. Здаецца, што і цябе люляла матухна ў той жа калысцы, што і ты вучыўся хадзіць па тых жа вясковых сцежках. Гэтак жа востра адчуеш на вуснах прысмак палыну, як Стасіна гераіня Каця, згубіўшы веру ў каханне. І таму скасабочаныя хаты роднай вёсачкі Зіны такія ж шчымліва блізкія, як старыя кварталы роднага Віцебска. Пякучы боль сціскае сэрца, калі чытаеш ёмкае апавяданне "Мыліца", шчымлівы — калі перагортваеш апошнюю старонку "Расплаты". Затое "Капялюш" выклікае пагарду, а "Спатканне праз гады" — сум, як, дарэчы, і "Пякучыя ружы" альбо "Папялішча кахання", "Горкі апельсін"...

Калі героі С. Наркевіч здатныя на падман, дык сама яна аніводным словам не падманвае чытача. Ёй верыш цалкам, таму і суперажываеш і няшчаснаму ў каханні Сашку са "Злавеснага крыку галак", і гаротнай Шурачцы, што аддала душу Богу "Пад покрывам жудаснай ночы", і міжволі шэпчаш са Сцешай яе няхітрую малітву, і праз дзесяцігоддзі ўслухваешся ў стогн Бладысёвай скрыпкі. І наступае прасвятленне, як у вясковай кабеты Ганны ад вокрыку святара ці ў мастачкі Ніны — са смерцю безнадзейна закаханага ў яе Генадзя. Россыпы ўспамінаў Стасі Наркевіч нібыта робяцца тваімі асабістымі, з якімі ўжо не развітаешся ніколі.

Светлы, улюбёны ў жыццё чалавек падзяліўся з намі самым запаветным. Хай жа поўніцца яна і надалей, каб россыпы гэтага багацця штомага часцей асыпаліся на нас, удзячных чытачоў. Хай жа і надалей упэўнена і таленавіта працуе пісьменніца ў нашай літаратуры.

Святлана ЗАЛЕСКАЯ



Вацлаў ХАДАСЕВІЧ

Вацлаў Хадасевіч даўно друкуе ў “Вожыку” дасціпныя вершы, мініяцюры, гумарэскі. А неяк паміж іншым ён прачытаў мне і сваю лірыку, тое, што піша, як ён казаў, “для сябе”. І радкі кранулі мяне сваёй чалавечай усхваляванасцю, натуральнасцю вобразаў, добрай выверанасцю слова. Чаму ж, падумалася, такое шчырае, лірычна-цёплае, можа, і выпакутаванае — ды толькі “для сябе”? Хай пазнаёміцца з ім і чытач. Думаю, што і яго, як і мяне, яно ўсхвалюе.

Казімір Камейша

Радзіме

Ці Бог, ці лёс мае заслоняць вочы,
Хай нават застануся я сляпым,
З чужых дарог
у родны край пакрочу,
Абмацаўшы сцяжынкі і слупы.

А як прыйду да крыжа ўскрай дарогі
Ды канюшыны абдыму стажок,
Скажу сабе:
“Жывеш ты, дзякуй Богу,
Ты на Радзіме, дома ты ужо!..”

У роднай хаце

Юнацтва мне не дадавала ў росце,
Я злосны на сябе самога быў
І аднагодкам з вуліцы зайздросціў:
“Вось гэта сапраўды растуць дубы!”

А раніцой ад паўгалоднай міскі
Што сіл было, імчаў да вушака,
Каб параўняцца
з самай верхняй рыскай,
Што правяла матуліна рука.

Даўно я госць у мілай роднай хаце,
І колькі б і калі б я не гасціў,
Паснедаўшы,
з усмешкай просіць маці
Да вушака старога падысці.

І, срэбрынку заўважыўшы
на скронях,
Пагладзіць рыскі даўніх тых часоў.
А я цалую рыскі на далонях,
Тулюся да бялюткіх валасоў.

* * *

“Шчаслівым будзь!” —
бабуля прадказала.
Не памылілася, мой угадала лёс.
На грудзі срэбны крыжык завязала,
І сэрцам, і рукою паказала
Абшар, з якога бусел мяне нёс.

А бусел нёс ад спелай сенажаці
І ад жытоў, дзе ззялі васількі,
Там, дзе матуля і Радзіма-маці
Давалі пернік мне з адной рукі.

* * *

Ты выйдзеш з хаты —
снежныя пялёсткі
Раскіне мякка холад на акне.
А ў сэрцы —
веснавыя адгалоскі
І ты, вярбой схілёнай ля мяне.

...Стаю ў чаканні ціха, нерухома,
Малюнак першы падае са шкла...
Па шыбе бачу,
што даўно ты дома.
Напэўна,
ціха-ціхенька зайшла.

Ліпеньскі вечар

Яшчэ ў дрымоце дзённай совы,
Раса не легла на лугі,
А ён папругай тумановай
Падперазаў ужо стагі.

Пазней, бадзёры і акрэплы,
Мільгнуў хусцінкай між кустоў.
І я пазнаў твой вобраз светлы
У светлае хусцінцы той.

* * *

Дні незаўважна праляцелі,
І вось нарэшце снегапад
Раскідаў белую кудзелю
На дрэвы і на стрэхі хат.

Да храмаў гарадскіх сінічкі
Спяшаюцца, як на пікнік.
І памяняў на сані брычку
На цёплым хутары ляснік.

Разумны воўк у адзіноце,
Бакі падцяўшы на балоце,
Выходзіць на спажыўна след.
Як ні хітрыць, свой след пакіне —
На белай велічнай карціне
Адкрые егеру “сакрэт”.

А ў гэты час апошні года
З дзялянак дух брыдзе жывы.
Калядаваць сама прырода
Ужо рыхтуецца... А вы?

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ

* * *

Ю. К.

я тонкая як твае вусны
празрыстая як твае зрэнкі
нямоглая як немаўлятка
я пятка

я ваза з тонкай фарфоры
мішэнь для стралкоў у хворых
мае валасы твае пальцы
на століе ад сонца зайцы

* * *

У абцугах сціскае холад.
Цень пераследуе.
Усё варожае.
Творчы голад.
Хто ведае?

* * *

Ю. К.

Безліч думак ў падоле трымаю.
Ад цяжару гэтага стагну.
Шыю гну..
І думкі-цацкі
Спаквяля перабіраю,
Да цябе у падале цягну.

Гарох

Ю. К.

Галінкі захілілі неба
Астрог
Ты па дарозе рассыпаў
Гарох
Я выкшталцонай птушкай
Іду
Табе ў кулачку нясу
Нуду
Схавай яе падалей
Спалі
Абдымі
Ссумавалася па тваёй
Любві

* * *

Я саслізнула з раўнавагі —
Не разлічыла сваёй прагі
Да цябе.

І нашае каханне, як лёд растане
Ці, як камень вялікі,
Захрасне ў трубе.

Ці не?

* * *

Ю. К.

Сцяжкамі-пацалункамі
На маім жываце
Вышываеш карункавае
Суквецце.

Зязюля

Што ты мне села на плечы,
Загадкавая Зязюля?
Я з кожным днём імпэтную
Бойку вяду. Ваю.
Што ты псуеш мне вечар?
Што так глядзіш упарта?
Вецер прагоніш прэч?
Калі паляціш? — Заўтра.

Сяргей УКРАІНКА

* * *

З усмешкаю, знявечанаю болем,
успамінаю даўняе цяпер:
як угаворваў стомленую волю
хаця б яшчэ імгненне пацярпець.

Калі яна патраціла ўсе сілы
і пачала сіроткаю канаць,
жыццё мяне надоўга прызямліла,
ператварыўшы ў кволага каня.

Хадзіў пад плугам і цягаў калёсы –
вазіў у луг аўдоцяў і кулін —
і штокастрычнік
пазіраў скрозь слёзы
на сумнакрылы жураўліны клін.

А ўчора зразумеў: ды Божа мілы,
і я ж магу —
мне толькі б захацець!..
...Дастаў свае запыленыя крылы,
уздзеў на плечы,
хоп — і паляцеў.

* * *

— Такія складаюць галовы першымі, —
кіўнуў на мяне стогадовы сусед. —
У нас быў узводны.
Чытаў усё вершыкі.
Да трэцяга бою дажыў... паэт.
А я вось тры класы
з двума калідорамі
данёс да Бялграда.
І сёння нашу...
(Даношваю... То невялікае гора.
Намнога цяжэй мне даношваць душу).
Пра тóй свет падумаеш —
зойдзецца сэрца,
бо столькі за сотню гадоў
награшыў...
А ты, брат, не бойся —
вайна ўжо не вернецца.
Чытай свае кніжкі.
І вершы пішы.

* * *

Алесю

Дакорам той дзень:
пад ігрушаю белай
смакую па кроплі “бяду маю”
і чую раптоўна
душой захмялелай,
што ён ужо вершы не думае!
Паверыць у глупства? Ды ну...
Прадчуваннем
“па-свойму” даваў тады рады я.
... Назаўтра прыйшлі —
і гнятлівае ранне,
і праўда цвярозага радыё.
“Нашто не мяне,
а Паэта забрала?” —
у голаў кашчунна палезла...

... Гадамі планіды нас
ураўнавалі.
Гадамі, але не паэзіяй.

* * *

Васілю

В сем христианнейшем из миров
Поэты — жиды!

Марына Цвятаева

“Правільны” свет —
праведны свет.
А ў гэтым, каторы без веры,
толькі паэт (толькі Паэт!)
можа быць Агасферам.

Восень ідзе. Вось ён — ідзе
(баюся спалохаць удачу)...
Сярод людзей усё радзей
я Агасфера бачу.

...Столькі людзей у свеце,
а ты адзінокі, паэце...

* * *

У двары бацькоўскім, ля варот,
я падняў буслінае пяро —
белае буслінае пяро.

Захмяліла радасцю душу:
колькі ж цяпер песень напішу —
пра маю радзіму і народ —
светлых, быццам гэтае пяро,
белае буслінае пяро!

Я танюткa завастрыў сціло,
каб яно як след пісаць магло,
наталіўся марай і паплыў
цераз дубнякі і паплавы
проста ў свет.
За вечнасці парог.
...Схамянуўся,
а ў руцэ — пяро.
Чорнае буслінае пяро.

* * *

И повторял я имена,
Забытые землей.

Юрый Кузняцоў

Вось, на дзвярах,
рэштка спадчыны роду —
падкова.
Казалі,
толькі яе і не змог разагнуць —
на заклад —
мой прадзед маўклівы.
Мой прадзед Сілява Барыс.

* * *

Выпіў сёння гарбаты,
настоенай на тваім спачуванні.
Рэдкае, браце, паскудства.

* * *

Выстрал.
Сэрца маё скацілася
на асфальт.
Страшная зброя —
цёмныя вочы цыганкі.

* * *

Калі Ён пакуту прымаў
на крыжы
за людскія грахі,
народ мой, дзіцёнак,
яшчэ ні правіны не меў...
Як скіфаў, як таўраў і прусаў,
не будзе народа майго
і на святе Вяртання.

Згадае пра нас Трыадзіны?..

Фота Кастуся Дробава

Фотаздымак з ваўчыцай



Юры СТАНКЕВІЧ

Апавяданне

Вальер быў не такі ўжо і вялікі, можна сказаць, нават цеснаваты — памерам тры на чатыры метры. Ён месціўся ўзбоч ад дома: тры рады дроту і сцяна гаспадарчага складу. Дротавая агароджа — два з паловай метры ў вышыню. У вальеры стаяла сабачая будка, але яна была пустая.

Насупраць, у двары, пад грушай месцілася альтанка. Якраз у ёй вакол пераноснага століка з выпіўкай і ежай сядзелі госці, а таксама Гаспадар з Гаспадыняй. Гасцей было двое. Сам госць і яго жонка. Усе чацвёра прыкладна аднаго ўзросту, можа, з невялікай разбежкай — год сарака — сарака пяці.

— Абыдземся без кіча, — сказаў Гаспадар, працягваючы гутарку, — хто што хоча, няхай сам налівае і есць, я асабіста ўсялякіх там тостаў і іншага "мутняку" не выношу.

— Ежце, не камплексуйце, — дадала і Гаспадыня. — Калі што — дык я яшчэ прынясу.

— Між іншым, — заўважыў Госць, — у вальеры пуста. А дзе ваш сабака?

— Пабачыце, — паабяцала Гаспадыня. — Яна ў нары, але зараз, пэўна, вылезе. Яе завуць Дзіна.

Сапраўды, з-за будкі, аднекуль з-пад зямлі паказалася спачатку лабатая галава, агледзелася навокал, са змрочнай цікаўнасцю зірнула на людзей у альтанцы і неўзабаве жывёліна вылезла ўся, разам з тулавам.

— Якая дзіўная аўчарка, — сказаў Госць. — І ў памерах большая за іншых і масць нейкая не тая. Светла-шэрая.

— Яна што, у нары хаваецца? — спытала Жонка Госця.

— Вы ж бачыце, — усміхнулася Гаспадыня.

— Добра, — пасля паўзы прызнаўся Гаспадар. — Скажу вам праўду — гэта ваўчыца.

— Ух ты! — здзівіўся Госць.

— Не, не даю веры! — з робленай цікавасцю выгукнула Жонка Госця.

— Вып'ем! — між тым прапанаваў Гаспадар. — Я вам усё патлумачу. Толькі, — ён крыху памарудзіў, — толькі ўсё гэта паміж намі. Самі разумееце, трымаць дзікіх звяроў забаронена: ці мала што можа здарыцца? Хоць, з іншага боку, нашыя дзеці з ёй смела гуляюць. Я часта выпускаю яе з вальера. Некалькі месяцаў таму яе неслі да ветэрынара, каб забіць. Дакладней, усыпіць, бо ім там, у звярынцы, вядома, не патрэбныя лішнія экземпляры драпежных жывёл. Ядуць зашмат і, да таго ж, далёка не вегетарыяняць. А ўвогуле, каб вы ведалі, яна нарадзілася ад пары стэпавых ваўкоў: тыя — самыя вялікія ў памерах і некаторыя з іх могуць дасягаць да васьмідзесяці кілаграмаў у вазе. Я купіў яе за бесцань, чыста сімвалічна.

Раптам ваўчыца ў вальеры адышла да задняй агароджы і ў некалькі скачкоў моўчкі кінулася на дрот, які забразгацеў ад удару.

— Яна нешта хоча? — занепакоена спытала Жонка Госця.

— Пустое, відаць, проста нервуецца, — сказаў Гаспадар, наліў усім віна і вярнуўся да тэмы, якую яны абмяркоўвалі дагэтуль — пра моду.

— Мода — яна ўсё больш нагадвае вар'ятню з яе жыхарамі. Ідыёцкія прычоскі — прадаюцца нават спецыяльныя сродкі для ўскудлачвання валасоў. Абцягнутыя сцёгны і аголеныя пупкі. Абутак нібы для блазнаў. Нейкае прыхаванае адабрэнне аднаполых шлюбаў... Іншым рэкамендуецца свінгерства — быццам гэта тое, што пазбавіць нармальных людзей ад набыцця прыхаваных комплексаў... Увесь свет гніе.

— Свінгеры? Хіба і нас гэта міне? Хіба і ў нас ужо няма суполак, дзе ахвотна мяняюцца партнёрамі па згодзе? А то і кладуцца пры гэтым у адзін ложак? — хіхікнула Гаспадыня.

— Я не супраць бы! — жартуючы, але, тым не менш, красамоўна зірнуў у яе бок Госць.

— Няўжо? — нервова сказала Жонка Госця і ў сваю чаргу кінула позірк на Гаспадара. — Можа, і праўда гэта прыкольна?

— Ну, не кісла, не кісла, — адзначыў Госць.

Усе раптам замаўчалі. Твары іх злёгку зачырванеліся ці то ад выпітага віна, ці то ад накірунку размовы.

Ваўчыца, якая дагэтуль неспакойна гойсала па вальеры, раптам зноў імкліва разагналася і кінулася на дротавую сетку, якая задрыжэла, але засталася непахіснай.

— Пэўна, яна хоча есці, — пашкадавала Жонка Госця.

— Ваўкі заўсёды хочуць есці, — сказаў Гаспадар. — Нават калі ім хапае, пачуццё голаду ў іх не знікае. Але яна прагне на падворак. Ёй трэба воля.

— Я хачу з ёй сфатаграфавацца, — нечакана для ўсіх выказаў пажаданне Госць. — У вас тут ёсць фотаапарат?

— Вядома, — сказаў Гаспадар. — Зараз я яе выпушчу, — і дадаў жонцы, — будзь ласкава, схадзі за "Кодакам".

— А яна не ўкусіць? — занепакоілася Жонка Госця.

— Пры мне наўрад, — запэўніў Гаспадар. — Ну, калі, вядома, не пачняце яе злаваць.

Жонка Гаспадара пайшла па фотаапарат.

* * *

Хілілася на вечар. Было цёпла, і сонца паступова заходзіла, яго абрысы праглядваліся праз аблокі. Бліжэй да ночы абяцалі дождж.

Госць, высокі і мажны, падышоў усутыч да вальера і прысеў на кукішкі.

— Дзіна, — мякка сказаў ён, паддобрываючыся. — Ты — прыгожая.

Ваўчыца скоса зірнула на яго. Гэта быў кароткі позірк, які, пэўна доўжыўся не больш як дзве-тры секунды. Шэрыя, блізарукія вочы чалавека і бязлітасныя, бурштынавыя, звера — сустрэліся. Госць першы адвёў свае. Ваўчыца гэтак жа моўчкі адышлася і кінулася на агароджу, толькі на супраць-леглы яе бок. Дрот зазвінеў.

— А вось і я.

Жонка Гаспадара прынесла фотаапарат. Гаспадар адчыніў вальер, і ваўчыца імкліва выслізнула вонкі. Не зважаючы на людзей, яна ліхаманкава аббегла ўчастак. Плот, якім ён быў агароджаны, паўсюдна паўставаў на яе шляху. Гаспадар, яго Жонка і госці чакалі.

Урэшце пах ежы прывабіў жывёлу бліжэй да стала. Гаспадар выцягнуў з міскі смажаную курыную нагу і кінуў ёй.

— Трымай, Дзіна!

Пачуўся похруст, мільганулі белыя клыкі і ў адно імгненне курыная нага знікла ў пашчы звера.

— Мне нешта вусцішна, — сказала Жонка Госця.

— Зараз, чакайце!

Гаспадар зняў са сцяны альтанкі жалезны ланцужок з ашыйнікам і, нягледзячы на маўклівы супраціў, надзеў на ваўчыцу.

— Цяпер, — абвясціў ён Госцю, — я патрымаю яе так, каб не трапіць у кадр, а ты можаш нават абняць яе за шыю. Калі што — я побач. Урэшце, яна яшчэ, так бы мовіць, падлетак. Ёй толькі сем месяцаў.

— Не трэба, не падыходзь, нават сабакі не выносяць п'яных, — сказала Жонка Госця.

— Я хачу фотаздымак. З ваўчыцай. І я не п'яны.

Гаспадыня навяла аб'ектыў. Госць асцярожна апусціў далонь на галаву звера. Ваўчыца задрыжэла і наструнілася, знерухомеўшы.

— Гэх ты, д'ябал! — сказала раптам Гаспадыня. — А плёнка ж скончылася!

— Чаму апарат не заражаны? Усё ў цябе не так! — папракнуў Гаспадар.

— Нічога, другім разам атрымаецца, — уздыхнула з палёгкай Жонка Госця.

Гаспадар адвёў ваўчыцу ў вальер. Бачна было, як ёй не хацелася вяртацца і яна ўпіралася ўсімі сваімі магутнымі лапамі. Госці і гаспадары зноў паселі за столік. Ваўчыца аббегла вальер, разагналася і зноў моўчкі кінулася на дротавую сетку. Але на гэта ўжо не звярталі ўвагі.

Прыкладна праз тыдзень былы Госць і яго Жонка сядзелі ў крэслах у пакоі сваёй кватэры. Як і заўсёды ў апошні час побач бесперапынна працаваў тэлевізар, запаўняючы пустату ўсемагчымымі гукамі, гоманам і ствараючы такім чынам ілюзію прысутнасці чагосьці альбо кагосьці.

Жанчына расчэсвала свае густыя валасы колеру саломы, у якіх ужо там-сям праблісквала сівізна.

— Мне млосна, — раптам сказала яна. — Мяне можа званітаваць.

Мужчына моўчкі ўзняў галаву і запытальна паглядзеў на жонку.

— Чаму я не магу паехаць і пажыць у іншых месцах, у іншых краінах? — працягвала яна. — Чаму я не магу пабачыць свет, спраўдзіць хоць якую самую маленькую мэту? Чаму я адчуваю сябе, як тая ваўчыца ў вальеры? Паасобку мы ўсе як яна, а жыццё і ёсць вальер.

— Да слова, — сказаў мужчына. — Ваўчыцы ўжо няма. Ноччу, два дні таму, яна зрабіла падкоп і на вуліцы яе застрэліў міліцыянер з табельнага "макарава", хоць яна нікога не чапала.

— Ты не сказаў мне пра гэта раней — адзначыла жанчына.

— Так. Не хацеў засмучаць. Пэўна, у цябе лёгкая дэпрэсія.

— Я таксама хацела б зрабіць падкоп. Іншым разам мяне цягне кінуцца на гэтыя сцены, — сказала жанчына. — Хіба справядліва жыць у свеце, дзе трэба ўвесь час усміхацца, як ідыётцы, чамусьці радавацца — быццам сапраўды ёсць чаму? Як зразумець, што нават у сваёй кватэры я не адчуваю сябе як дома?

— Ты проста стамілася. Каб з намі былі дзеці, табе знайшоўся б занятак. Хочаш — я набуду шчаня? Будзеш, калі ён вырасце, гуляць з сабакам у скверы.

— Не, — сказала жанчына. — Я хачу як мага далей ад усіх. Куды-небудзь у лес і там закапацца ў нару.

Мужчына не адрэагаваў. Ён моўчкі падышоў да акна і стаў звыкла назіраць за тым, што з дня ў дзень рассцілалася перад яго вачыма: прамакутнікі дамоў і цёмнае неба над імі. Потым па гэтым небе праляцеў самалёт.

Абразкі

Юльян МІСЮКЕВІЧ

Неасцярожная ветлівасць

У аўтобусе Васіль Самусевіч прабіў талон, агледзеўся. Ехаць было далёка, таму ён адразу плюхнуўся на вольнае крэсла. Праз два прыпынкі ўзняўся, каб саступіць месца прыгожай інтэлігентнай жанчыне гадоў пад пяцьдзесят:

— Сядайце, калі ласка.

У танклявай жанчыны, да якой звярнуўся хлопец, змяніўся позірк, твар выцягнуўся. Замест падзякі яна абурана выдыхнула:

— Няўжо я падобна на старую?

Адзінаццацікласнік спачатку не зразумеў, што ёй не спадабалася.

— Не, вы глядзіце! Ён "садзіцеся" кажа! Можа, мяне цяпер ужо на пенсію адправіш? Ты ведаеш, колькі мне гадоў?

— Не ведаю, канечне...

— Дык чаго мяне за бабку прымаеш? Табе падабаецца здзекавацца з дарослых?

Хлопец моўчкі пасунуўся ў другі канец аўтобуса, здзіўлена буркнуў "прабачце", але жанчына яго ўжо не чула. Яна не супынялася. Да яе далучыліся суседкі. Захоплена абмяркоўвалі сучасную моладзь: "нават прыстойны жэст маладыя здольныя ператварыць у здзек!"

Для большасці людзей аўтобуса здарэнне ператварылася ў вясёлую забаўку, мерапрыемства пасярод штодзённай шэрасці, для Васіля Самусевіча — у чарговае расчараванне пакаленнем, якое так імкнецца вучыць і выхоўваць.

Аж глядзець брыдка...

Раніца. У суботу для Васіля яна пачалася а дванаццатай. Гэта для яго нармальна. Увогуле ў жыцці Васіля не было распарадку. Да трох гадзін ночы ён мог сядзець у Інтэрнеце, бо не хацелася спаць. Наступным днём тая ж сітуацыя, толькі ён ужо прачнуўся і праз тры гадзіны зробіць ранішнюю размінку. Такое жыццё вельмі не падабалася бабулькам у ягоным пад'ездзе. Дакладней, ім усё ў Васілю не падабалася, што б той не рабіў.

Яны штодня паміж сабой абмяркоўвалі не толькі яго — ўсіх суседзяў. Сядзелі ў дварыны на лавачцы і кідалі адтуль рэплікі:

— Вунь, пайшоў. Нейкую страшную адзёжу на сябе начапіў.

— Не, Маня, ты не разумееш, гэта так цяпер модна.

— Ды што вы! Я вам скажу, тамака ў цэнтры секта ёсць, вось ён адтуль. Бачыце — які тоўсты ланцуг на штаніне.

— Няўжо тое модна, калі джынсы рваныя? Мабуць, сапраўды з секты.

— Бацькі, пэўна, шпекулянты. Панакуплялі джынсаў амерыканскіх, а бесталач гэтая шастае па сектах, ірве.

— А памятаеце, свята нейкае было, і ён сваю сектанцкую музыку на поўную моц паставіў.

— Ну-ну. І яшчэ сябрукі папрыходзілі, на машынах папрыязджалі, шуму нарабілі і з'ехалі!

Дзень за днём размова бабулек заходзіла глыбей, кранала ўсё болей важныя рэчы. Праз тыдзень яны высветлілі, што Васіль па загадзе секты павесіў свайго стрыечнага брата ў лесе, непадалёк ад дому. Затым здагадаліся, што дзяўчына Васіля — мярцвячка, якую секта вярнула да жыцця і таму ў яе такія белыя валасы і белы твар з праколатым брывом.

— Бачыце, зноў нейкая кроў на майцы, — заўважыла адна з бабулек назаўтра, калі Васіль праходзіў побач.

— Ой, аж глядзець брыдка!

— А ён, мабуць, пачуў. Глядзіце якога сабаку на нас напусціў! Жах!

Да бабульчынай лавачкі падыходзіў вялікі чорны сабака. Ён прынюхаўся да пакета, у якім было мяса, і паволі падняў галаву ўверх. Дзве бабулькі залямантавалі, адна пачала крыкам адганяць звера. Сабака загырчэў і раптам кінуўся на пакет, парваў яго і выхапіў кавалак мяса.

Да лаўкі падышоў Васіль з дручком. Пачаў адганяць сабаку. Гэта спачатку не атрымалася, таму ён колькі разоў выцяў жывёліну, сабака ж ірвануў яго за калашыну.

Невядома, чым закончылася змаганне, калі б не крык з дальняга дваровага кутка:

— Тайсан! Ка мне!

Тайсан, абмінуўшы Васіля, паімчаў да гаспадара.

— А навошта ты адагнаў яго ад нас? — падазрона пацікавіліся бабулькі.

— А вам было б лепей, каб ён вас пакусаў?

Васіль паклаў дручок і прывёў сябе ў парадак.

— Чым тамака займаецца твая секта? — нечакана пацікавілася адна бабулька.

— Цішэй ты! — цыкнула на яе суседка.

— Якая секта? — хлопец з недаўменнем зіркнуў на бабулек.

Ад яснага чыстага позірку абаронцы тыя адчулі сябе вальней, засыпалі хлопца пытаннямі. Яны доўга не маглі ўцяміць, што яго джынсы прадаваліся рванымі, а майка з надпісам "Slipknot" не азначала прыналежнасць да нейкай секты.

— Пайду я, шчэ трэба калашыну зашыць, — сказаў Васіль.

— Дзякуем, унучак, яшчэ раз!

Хлапец знік у пад'ездзе.

Не паспелі за ім зачыніцца дзверы, як ад бабульчынай лавачкі зноў пачуўся таемны шэпт:

— ... І ўсё-ткі, яго дзяўчына — круцелька... На яе ажно глядзець брыдка.

І бабулі зацягнулі ранейшую гаворку. Ганілі не сабаку і ўладара, а хлопца з ягонымі штанамі.

Арт-пацеркі

Да 6-й гадавіны стварэння Прэзідэнцкага аркестра Беларусі (мастацкі кіраўнік Віктар Бабарыкін) прымяркоўвалася яго творчая справаздача ў Палацы Рэспублікі. Канцэрт наведаў кіраўнік дзяржавы. Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка даручыў зрабіць такія канцэрты рэгулярнымі. На сустрэчы з творчым калектывам ён падтрымаў ідэю стварэння вакальнай групы ў складзе аркестра.

Адна са старэйшых купалаўцаў, заслужаная артыстка, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі Зінаіда Зубкова адзначыла нядаўна свой юбілей. Да гэтай нагоды ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы прымяркоўваўся паказ спектакля "Вечар" (паводле п'есы А. Дударава) з яе ўдзелам; адбылася і юбілейная цырымонія. Апроч калег-артыстаў, Зінаіду Зубкову павіншавалі першы намеснік міністра культуры краіны Уладзімір Рылатка, старшыня Беларускага саюза тэатральных дзеячаў Аляксей Дудараў, прадстаўнікі сталічнага клуба "Таленты і прыхільнікі". Цікавая і шчырая сустрэча з актрысай прайшла ў Дзяржаўным музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Беларусі, у імпрэзах якога Зінаіда Зубкова заўжды актыўна ўдзельнічае.

11 снежня ў зале Беларускага саюза кампазітараў адбудзецца сустрэча з Аляксандрам Літвіноўскім. Адзін з паспяховых сучасных айчынных творцаў, вядомых далёка за межамі нашай краіны, ён распавядзе пра свае сёлетнія праекты, ажыццёўленыя на ўзроўні міжнародных музычных стасункаў. Адбудзецца прэзентацыя новага праекта "Jazz graffiti" — плён пошукаў кампазітара ў сферы электраакустычнай музыкі.

Пры канцы лістапада два лялечныя тэатры — Беларускі дзяржаўны і Гомельскі абласны — ладзілі абменныя гастролі. З прэм'ернымі спектаклямі "Мойдодыр" і "Жудлівы спадар Ау" сталічныя лялечнікі выправіліся на сваю "гістарычную радзіму": як вядома, 70 гадоў таму ў горадзе над Сожам гурт артыстаў-самавукаў стварыў тэатр, з якога ўрэшце і паўстаў знакаміты сёння тэатр лялек. А гамяльчане паказалі маленькім сталічным жыхарам свае лепшыя пастаноўкі "Марка багаты" і "Прыгоды Пінга ды Понга".

Наведнікаў сталічнага Музея сучаснага выяўленчага мастацтва ўразіла нядаўна творчасць госця з Польшчы — Анджэя Канечнага, мастака, паэта і публіцыста з прыморскага горада Гдыня. "Пастэлі" — пад такой назвай прайшла выстаўка яго графікі, складзеная з 14-і своеадметных работ. Шматлікія наведнікі вернісажа не толькі адкрылі для сябе творчасць майстра малюнка, але і з прыемнасцю паслухалі вершы Анджэя Канечнага ў аўтарскім выкананні. Дарэчы, гэты мастак, заслужаны дзеяч культуры Польшчы, мае ўзнагароды некалькіх прэстыжных нацыянальных літаратурных конкурсаў.

С. ВЕТКА

Лістападаўская магія кіно

Згадкі пра XV Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад»

На ўрачыстым адкрыцці сёлетняга кінасвята Аляксандр Лукашэнка адзначыў: "Магія кіно сабрала ў Мінску сузор'е выдатных акцёраў і рэжысёраў, чыя творчасць складае гонар кінематаграфіі. Мы маем магчымасць быць сярод любімых артыстаў, выказаць ім словы гарачай удзячнасці і самай шчырай падзякі..."

У "Лістападзе-2008" бралі ўдзел вядомыя артысты, рэжысёры, прадзюсеры. Сярод іх Аляксей Панін, Алена Бабенка, Леанід Мазгавой, Аляксей Пятрэнка, Леанід Ярмольнік, Багдан Ступка, Сяргей Гармаш, Аляксандр Сакураў і шмат іншых. А прыз "За захаванне традыцый духоўнасці ў кінамастацтве" Прэзідэнт Беларусі ўручыў народнаму артысту СССР Васілю Ланавому.

У конкурсным паказе ўдзельнічалі 20 кінастужак з розных краін. Цікавыя работы былі і ў пазаконкурсным паказе. Так, славуты польскі рэжысёр Кшыштаф Занусі прадставіў гледачам фільм "Чорнае сонца".

— Я спецыяльна прыехаў у Мінск на адзін дзень, каб прысутнічаць на форуме. Дзякуючы фестывалю, беларускія гледачы пабачаць гэты фільм, — сказаў рэжысёр.

Фільм з'яўляецца экранізацыяй п'есы добрага сябра Занусі, італьянскага пісьменніка Рока Фаміліяры. У гэтай трагедыі змяшаныя чалавечая жарсць, пошук справядлівасці і імкненне стварыць гармонію ў свеце. Кшыштаф Занусі перакананы, што сёння людзі, асабліва тыя, хто глядзіць серыялы, згубілі адчуванне трагедыі, пра якую ім трэба нагадаць..."Трагізм жыцця хаця б у тым, што ўсё заканчваецца смерцю, мы нічога не можам мець назаўсёды".

На прэс-канферэнцыі ён расказаў і пра сваю апошнюю работу:

— Фільм "Сэрца на далоні" ўжо быў прэміяваны на Рымскім міжнародным кінафестывалі ў гэтым годзе, а Багдан Ступка, які іграе галоўнага героя, атрымаў прыз за лепшую мужчынскую ролю. "Сэрца на далоні" — гэта своеасаблівы здзек з постмадэрнізму. Постмадэрнізм, можна сказаць, — нячыстае дзіця марксізму. Мяне раздражняе вучэнне пра тое, што чалавечых каштоўнасцей не існуе. Увогуле лічу падобныя ідэі вельмі шкоднымі для мастацтва.

Упершыню ў конкурснай праграме Мінскага МКФ спаборнічалі сёлета тэлевізійныя фільмы. Нацыянальная кінастудыя "Беларусьфільм" замовіла наступныя стужкі: "Цень самурая" рэжысёра Ігара Чацверыкова, "Пакуль мы жывыя..." Сяргея Сычова, "Рыфмуецца з каханнем" Аляксандра Яфрэмава, "У чэрвені 41-га" Аляксандра Франскевіча. Гран-пры конкурсу тэлевізійнага мастацкага кіно прысуджаны фільму "Шчаслівага шляху" рэжысёра Аляксандра Баршака (Расія — Украіна). Прыз за лепшую мужчынскую ролю ў конкурсе тэлевізійнага кіно атрымаў народны артыст СССР і нязменны прэзідэнт "Лістапада" Расціслаў Янкоўскі ("У чэрвені 41-га"). А прыз за лепшую жаночую ролю — Марыя Возба ("Рыфмуецца з каханнем").

Святлана Дружыніна

У межах кінафестывалю адбыўся "круглы стол" па праблемах тэлевізійнага мастацкага кіно. У ім удзельнічалі рэжысёры, прадзюсеры, кіназнаўцы, у тым ліку вядомы расійскі прадзюсер і сцэнарыст Владзілен Арсеньеў, знаны маскоўскі тэлеаглядальнік Ірына Пятроўская, генеральны дырэктар Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" Уладзімір Замяталін, выканаўчы дырэктар Балгарскага нацыянальнага кіно, сербскі сцэнарыст і прадзюсер Ёван Маркавіч. На "круглым стале" абмяркоўваліся праблемы тэле-ды кінаіндустрыі, аналізаваліся магчымасці больш шырокага выкарыстання сумеснай з беларускімі тэлекампаніямі вытворчасці фільмаў, пошуку і падтрымкі маладых спецыялістаў і далейшае развіццё тэлевізійнага кіно.

Адбыўся і фестываль дзіцячых і юнацкіх фільмаў "Лістападзік". У анімацыйнай праграме перамаглі расіяне: лепшым прызнаны фільм "Маленькая Васіліса" Дарыны Шміт. "Аповесць мінулых гадоў" беларуса Ігара Волчака атрымала дыплом журы "За арыгінальнае вырашэнне гістарычнай тэмы і захаванне нацыянальных традыцый". Сярод ігравых фільмаў журы вылучыла эстонскую стужку "Клас" рэжысёра Ільмара Раага.

Кшыштаф Занусі

Конкурс дакументальнага кіно прайшоў на "Лістападзе" ўжо другі раз. Журы ўзначаліў прэзідэнт міжнароднага кінафестывалю "Пасланне да чалавека" ў Санкт-Пецярбургу рэжысёр Міхаіл Літвякоў (Расія). Сёлета ацэньваліся работы больш як 30 дакументалістаў з 18 краін. Упершыню спаборнічалі кінастужкі рэжысёраў з Галандыі, Ізраіля, Казахстана, Іспаніі. Прыз "За лепшы дакументальны фільм" атрымала расійская стужка рэжысёра Юрыя Малюгіна "Спіс Кісялёва". А карціна эстонскага рэжысёра Агне Нелка "Свет Лотмана" атрымаў прыз "За лепшую рэжысуру дакументальнага кіно". Спецыяльны прыз Міждзяржаўнай тэлерадыёкампаніі "Мір" "Мова кіно — мова ўзаемаразумення" журы прысудзіла беларускаму фільму "Ва ўсе дні" Міхаіла Жданоўскага.

Гран-пры "Лістапада-2008" атрымала стужка вядомага расійскага рэжысёра Станіслава Гаварухіна "Пасажырка". Гэты фільм меў велізарны ажыятажны "попыт" і прадказальны глядацкі поспех ужо задоўга да паказу (дарэчы, у Мінску была прэм'ера). "У вас не будзе лішняга білеціка? " — пыталіся людзі каля кінатэатра, гатовыя аддаць любыя грошы, каб паглядзець карціну. Я ніколі не бачыў такой перапоўненай залы ў кінатэатры "Кастрычнік": гледачы сядзелі на прыступках, стаялі ў праходах. Але фільм сапраўды варты гэтага.

Серабром "Лістапада" ганаравалі "Мары пра Каліфорнію" румынскага рэжысёра Крысціяна Нямеску. Бронза фестывалю дасталася беларускаму фільму "На спіне ў чорнага ката" рэжысёра Івана Паўлава — дарэчы, гэты фільм да канца фестывалю быў лідэрам.

Прыз "За лепшую рэжысуру" атрымаў фільм, назва якога ў рускім перакладзе — "Безмолвный свет", рэжысёра Карласа Рэйгадаса (Мексіка — Францыя — Нідэрланды — Германія). Прыз "За лепшую мужчынскую ролю" — у Развана Васілеску (фільм "Мары пра Каліфорнію"), а прыз "За лепшую жаночую ролю" — у Барбары Сараф'ян (фільм "Масква, Бельгія" бельгійскага рэжысёра Крыстофа ван Рампая).

♦

Галоўнымі пляцоўкамі для прагляду конкурсных і пазаконкурсных фільмаў былі кінатэатры "Кастрычнік" і "Цэнтральны". Усе паказы збіралі поўныя залы. Кожны фільм конкурснай праграмы прадстаўлялі яго стваральнікі, рэжысёры і акцёры. Так што гледачы маглі не толькі ўбачыць карціны, але і пагутарыць з кіназоркамі.

"Мы перажываем нялёгкі час — час крызісу, час "страшнага суда". Але я спадзяюся, што наш кінематограф вытрымае гэты націск і будзе ісці далей", — сказала старшыня журы кінематаграфістаў, вядомы рэжысёр і сцэнарыст Святлана Дружыніна.

Мінскі МКФ "Лістапад" пацвярджае гэтыя словы.

Уладзімір ПАДАЛЯК

Фота Аляксандра Дзмітрыева і аўтара

Дзень Максіма

«Настройвайцеся на сенсацыю!» — такі вокліч мог бы суправаджаць анонс прэм'еры, што адбудзецца 10 снежня ў Вялікай зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі.

Пагадзіцеся, даволі нязвыкла ўспрымаецца нават спалучэнне тэмы новага твора і яго жанравага вызначэння: "Дзень Максіма Багдановіча", сучасная містэрыя. Магчыма, публіка ўпершыню ўбачыць беларускі нацыянальны, паводле сутнасці сваёй, мюзікл: маштабную музычна-пластычную імпрэзу з нашай надзённай і спрадвечнай праблематыкай, з вакалам, танцамі, тэатралізаваным сінтэзам жанраў і фальклорным каларытам. А інфармацыя пра тое, што ў ролі беларускага паэта выступіць актрыса тэатра і кіно Святлана Зелянкоўская, выклікае асаблівую цікавасць да відовішча.

Аўтар праекта кампазітар Ларыса Сімаковіч (яна ж і драматург, і рэжысёр, і харэограф, і "генератар ідэй" сцэнічнага афармлення) суадносіць прэзентацыю новай работы з днём нараджэння Максіма Багдановіча, што адзначаецца напярэдадні прэм'еры, 9 снежня. Зрэшты, спадарыня Ларыса сціпла называе сябе "толькі кампазітарам" і падкрэслівае, што праект — супольны: да яго спрычыніліся фальклор-тэатр "Госьціца", Ансамбль салістаў "Класік-Авангард" (мастацкі кіраўнік Уладзімір Байдаў), Лявон Вольскі ды "N. R. M.", Ян Жанчак ды "In search for", гурт "Ліцьвінскі хмель", артысты мінскіх тэатраў.

Вобраз беларускага прарока, чыё імя — Максім Багдановіч, упершыню паўстане на філарманічнай сцэне. Яго постаць абавязвае да ідэйнай глыбіні і маштабнасці формы — пэўна, з такім адчуваннем працавала кампазітар, якая ў прынцыпе не лічыць сябе прыхільніцай буйных жанраў і аддае перавагу камернай музыцы. Але Багдановічу (згадайма яго паэзію!) утульна і ў касмічных маштабах. Ці не таму для ўвасаблення ідэі, якая сілкуецца роздумам пра творцу і соцыум, прарока і натоўп, Ларыса Сімаковіч абрала складаны і не характэрны для сучаснага беларускага мастацтва жанр містэрыі?

"Як вынікае з назвы, спектакль — не пра Максіма Багдановіча, а пра дзень, наш з вамі дзень, у якім ёсць мы, нашы стасункі, у якім ёсць і Максім Багдановіч, але да яго яшчэ трэба дайсці. Немажліва напрасткі, жывучы ў побытавым сённяшнім, дайсці да гэтага чалавека-вяршыні (тут можна прывесці аналогію з недасяжнай зонай у "Сталкеры"). Трэба рыхтавацца да ўзыходжання. Жанр містэрыі дазваляе разгарнуць на сцэне чараду трансфармацый, пераўвасабленняў, з дапамогай персанажаў-сталкераў дасягнуць таго стану, праз які можна будзе наблізіцца да Багдановіча, яго душы і зразумець пэўныя нашы памылкі...", — тлумачыць Ларыса Сімаковіч. Аднак перапынім яе аповед, каб не раскрываць высакародную інтрыгу, якая закладзена ў драматургіі спектакля "Дзень Максіма Багдановіча".

Трэба ісці на прэм'еру: глядзець і слухаць! І — думаць...

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

Тысячы прыгожых рэчаў

Беларускія мастацкія промыслы: традыцыі для будучыні

Дзяржаўнае вытворча-гандлёвае аб'яднанне "Белмастацпромыслы" Упраўлення справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — асноўны вытворца вырабаў народных мастацкіх промыслаў і сувенірнай прадукцыі краіны. Карэспандэнт "ЛіМа" пагутарыў з генеральным дырэктарам аб'яднання Валерыем ГРЫБАНАВЫМ.

— Валерый Іванавіч, у чым адметнасць працы "Белмастацпромыслаў"?

— Амаль 90 гадоў існуе наша аб'яднанне. Сёння гэта — 18 фабрык і шэраг магазінаў, у тым ліку шэсць — у Мінску. Самы вялікі з іх — "Кірмаш". У нас ёсць магазіны практычна ў кожным рэгіёне. Фабрыкі займаюцца вытворчасцю вырабаў з саломкі, лазы, дрэва, лёну, таксама керамікі... Гэта не толькі сувеніры і нейкая звычайна-незвычайная драбяза, але і тавары народнага спажывання: прадметы інтэр'еру, адзенне, карціны, кухонны посуд, шмат чаго іншага.

— Калі можна, больш падрабязна: ваша прадукцыя — гэта?..

— З лазы вырабляем вялікія вазы для падлогі, мэблю (крэслы, крэслы-гушкалкі, часопісныя столікі), кошыкі, цукерачніцы, абажуры, кашпо... З дрэва прапануем мэблю, вырабы разьбяроў па дрэве; нашы майстры робяць інкрустацыю, кухонныя наборы, хлебніцы, настольныя гульні (нарды, шахматы), шкатулкі, дэкаратыўныя фігуркі (зубр, алень, мядзведзь, матрошкі)... З саломкі — вазы для падлогі, кветкі, лялькі, хлебніцы, ёлачныя ўпрыгожванні, інтэр'ерныя кампазіцыі... Кераміка прадстаўлена разнастайнымі сервізамі, падсвечнікамі, вазамі, кубкамі, конаўкамі, сувенірамі, дэкаратыўнымі талеркамі і г.д. На рахунку "Белмастацпромыслаў" — тысячы найменняў разнастайнай прадукцыі.

— І што з яе карыстаецца найбольшым попытам?

— Усё залежыць ад часу. Летам мы выпусцілі новую калекцыю льнянога адзення: штаны, спадніцы, кашулі, капелюшы, сумкі... Усё гэта раскуплялася вельмі добра ў спякотнае надвор'е. Таксама карыстаюцца попытам ручнікі, сталовыя камплекты, абрусы, камплекты спецыяльнага адзення для прадстаўнікоў розных прафесійных груп (для дактароў, камунальнікаў; сцэнічныя касцюмы для артыстаў). Нашы фабрыкі нават шыюць заказы для Галандыі, Францыі, Бельгіі. Акрамя гэтага, мы кожны год выязджаем за мяжу, каб прадставіць там сваю прадукцыю. Такім чынам, не толькі вывучаем попыт, а і робімся "пазнавальнымі" на міжнародным рынку. Прыемна, што прадукцыю аб'яднання ўжо добра ведаюць у замежжы.

Але ж у сваёй дзейнасці мы скіроўваемся і на побытавую будзённасць. Інтэр'еры гасцініц, баз адпачынку, санаторыяў, рэстаранаў, пабудоў у нацыянальных парках, афармленыя спецыялістамі аб'яднання ў нацыянальным стылі, прыцягваюць увагу і беларусаў, і замежных гасцей. Узмацненню нацыянальнага каларыту спрыяе стылізаваная вопратка абслуговага персаналу, якая вырабляецца пад заказ. Сталовая і пасцельная бялізна з ільну і бавоўны з лагатыпам прадпрыемстваў павышае прэстыж і эстэтыку.

Мы бяром удзел у розных нацыянальных выставах. За апошнія месяцы "Белмастацпромыслы" прадстаўлялі сваю прадукцыю на адкрыцці Лёдавага палаца ў Бабруйску, на "Славянскім базары ў Віцебску", на святах гарадоў Мінска, Салігорска, на "Дажынках-2008", на Дні беларускага пісьменства... Толькі за гэты год "Белмастацпромыслы" заваявалі 10 дыпломаў. Пра папулярнасць нашай прадукцыі на ўнутраным і міжнародным рынках яскрава сведчыць такая лічба: за 9 месяцаў сёлетняга года было рэалізавана прадукцыі на 48,7 мільярдаў рублёў.

— На прадпрыемствах аб'яднання працуюць надзвычай таленавітыя людзі. Як вы іх знаходзіце?

— Гэта выпускнікі каледжаў, у якіх рыхтуюць разьбяроў па дрэве, спецыялістаў лозапляцення, вышывання і г.д.; ВНУ, якія рыхтуюць мадэльераў, мастакоў, дызайнераў пашыранага профілю. Мы падтрымліваем сувязі і з "пазаштатнымі" талентамі, якія ў нас не працуюць, але часта прапаноўваюць свае работы, эскізы...

— Выбачайце калі ласка, Валерый Іванавіч, але замежныя турысты, якія прыязджаюць у Беларусь, бывае, скардзяцца, што ў нас малавата нацыянальных сувеніраў (бралкоў, ручак, вырабаў на магніціках), якія можна было б набыць на памяць пра нашу краіну...

— Вельмі карысная заўвага! Мы адчулі гэта, калі да нас, у Беларусь, пачалі прыязджаць замежныя аматары футболу. Нашы фабрыкі пачалі ўжо вырабляць сувеніры на магніціку з выявамі адметнасцяў Беларусі. Яны вельмі хутка раскупляюцца! Цяпер рыхтуем разнастайную прадукцыю, звязаную з 600-годдзем Беларвежскай пушчы. Вельмі шмат ідэй!..

— Якім чынам удаецца захоўваць нацыянальную спецыфіку, аўтэнтычнасць прадукцыі?

— Адно з самых унікальных структурных падраздзяленняў "Белмастацпромыслаў" — навукова-даследчая лабараторыя "Скарбніца". Яе супрацоўнікі арганізоўваюць навуковыя экспедыцыі па ўсіх рэгіёнах Беларусі. Паводле ўспамінаў старажылаў і на аснове старых узораў вывучаюць традыцыйныя народныя тэхналогіі, вынаходзяць і нешта новае. Кожны сувенір ці элемент дызайну вырабляецца паводле традыцыйных нацыянальных канонаў.

Начальнік навукова-метадычнай лабараторыі мастацтвазнаўства Алена Жукава дадае:

— *"Скарбніца" атрымала найвышэйшае прызнанне на розных выставах у Расіі, Латвіі, Малдове, у Парыжы. А ў Мадрыдзе ёй быў прысвоены залаты медаль якасці. Кожны месяц наша аб'яднанне ладзіць мастацкі савет, дзе зацвярджаюцца новыя мадэлі вырабаў, якія прапануюцца супрацоўнікамі "Скарбніцы" і мастакамі прадпрыемстваў аб'яднання. А гэта — уявіце сабе! — каля 400-500 прапаноў на месяц. Зацвярджаюцца толькі самыя лепшыя. Магу запэўніць, што ў нас працуюць прафесіяналы.*

Гутарыў
Уладзімір ПАДАЛЯК

На здымках: прапануе "Скарбніца"; за кроснамі.

Фота аўтара

У Мінску прайшоў V Міжнародны фестываль монаспектакляў "Я". Сёлета ён стаў своеасаблівым майстар-класам для студэнтаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.

Тэатр як вучэбны працэс

Упершыню фестываль праходзіў на Вялікай сцэне тэатра-студыі імя Е. Міровіча. "Галоўная ідэя была такая: паспрыяць вучэбнаму працэсу студэнтаў акадэміі мастацтваў, — зазначае Антаніна Міхальцова, дырэктар фестывалю, генеральны сакратар Беларускага цэнтра Міжнароднага інстытута тэатра (ЮНЕСКА) і член журы. — Не заўсёды ж студэнты могуць некуды паехаць".

За чатыры фестывальныя дні было паказана 8 спектакляў. Свае работы прадставілі рэжысёры з Беларусі, Украіны, Літвы, Вялікабрытаніі. Праграма атрымалася разнастайная і цікавая: драмы, камедыі, трагедыі, опера... Знаўцы творчасці Я. Стэльмаха змаглі параўнаць яго "Сіні аўтамабіль" у пастаноўках беларускага і ўкраінскага рэжысёраў. А прыхільнікі не толькі тэатра, але і кінематографа, — пабачыць пастаноўку з элементамі ў стылістыцы нямога кіно.

І — пра ўзнагароды. Журы падкрэсліла, што размеркаванне прызоў тут досыць умоўнае. Але ж калі трэба выбраць "першых сярод роўных", дык... Такім чынам, дыплом III ступені атрымаў Усевалад Чубенка, артыст Камернага драматычнага тэатра г. Валгаграда, за ролю шматпакутнага ката з чалавечым лёсам ў спектаклі "Кыся". Акрамя гэтага, Усеваладу ўручылі прыз прэсы. Дыплом II ступені дастаўся артысту Маладога тэатра (Кіеў) Аляксею Вярцінскаму за "Сіні аўтамабіль" па-ўкраінску. Бірута Мар з Нацыянальнага тэатра драмы г. Вільнюса ганараваная дыпломам I ступені за яе містычную "Антыгону". А Гран-пры фестывалю атрымаў Піп Ютан з Вялікабрытаніі са сваім неўміручым "Чаплінам".

Піп Ютан — аўтар, рэжысёр, выканаўца і мастацкі кіраўнік тэатра "Pip Utton company". Ідэя стварыць свой тэатр — яго даўняя мара. Беларусь наведаў упершыню. Але англійскаму артысту так спадабалася ў нас, што ён паабяцаў абавязкова прывезці свае новыя работы ў Мінск. Уладальнік Гран-пры фестывалю "Я" вернецца ў роднае каралеўства і са спецыяльным прызам Літоўскага пасольства ў нашай краіне.

Да ўсяго, прыз глядацкіх сімпатый атрымала салістка Беларускага дзяржаўнага музычнага тэатра Лідзія Кузьміцкая за выкананне ролі апантанай каханкі ў монаспектаклі паводле п'есы Ж. Както "Чалавечы голас", а кампазітар Алег Залётнеў — прэмію "За аўтарскае музычнае вырашэнне" ў спектаклі "Пачакай, сонца!" Беларускага паэтычнага тэатра аднага акцёра "Зьніч".

Шкада, што такі захапляльны вучэбна-тэатральны працэс праходзіў у камернай атмасферы, хаця ўваход для ўсіх ахвочых быў вольны. Напэўна, не было належнай рэкламы. Інфармацыя пра Міжнародны фестываль монаспектакляў адсутнічала і на сталічных афішах, і нават у Інтэрнеце. Акцёры апынуліся сам-насам з, можна сказаць, адзінкавымі гледачамі. Добра, што ў залу прыходзілі самыя зацікаўленыя з іх, дапытлівыя і апантаныя.

Ганна КАРПУК

На здымку: Піп Ютан (Чаплін) уладальнік Гран-пры.

Фота Андрэя Спрынчана

Песні з экрана

Прэм'ера праграмы "Музыка беларускага кіно" адбылася ўчора, 4 снежня, у Палацы культуры горада Маладзечна. Імпрэзу арганізавалі Міністэрства культуры, спецыяльны фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва і заслужаны калектыў — Нацыянальны канцэртны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам народнага артыста краіны Міхаіла Фінберга.

Ёсць у гісторыі сусветнага кінематографа выпадкі, калі ствараўся фільм без музыкі. Але гэта ўсё ж — адмысловыя выключэнні. Бо мастацтва "рухомых карцінак", можна сказаць, ад самага свайго нараджэння суправаджаецца музыкай. Сеансы нямога кіно падтрымліваў жывой "гукапісальнай" ігрой тапёр. А калі на экран прыйшоў гук, дык імкліва пачаў развівацца і новы жанр прыкладной музыкі. Сёння кожны адукаваны чалавек прыгадае дзесяткі прыкладаў таго, як музыка, створаная спецыяльна для кіно, з часам пакідала экран і набывала вялікую папулярнасць, нават калі сама кінастужка не атрымлівала прызнання і хутка забывалася...

Вось на такія, даўно ўжо не залежныя ад кінакадра, самастойныя інструментальныя мелодыі ды песні звярнуў увагу калектыў музыкантаў, спевакоў-салістаў ды аранжыроўшчыкаў — на чале з маэстра Міхаілам Фінбергам. Новая праграма, прысвечаная 80-годдзю Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм", з якой у розныя часы супрацоўнічалі і лепшыя айчынныя, і вядомыя расійскія кампазітары, прадставіла музыку з фільмаў "Апошняе лета дзяцінства", "Белыя росы", "Прыгоды Бураціна", "Пра Чырвоную Шапачку", "Ціхія троечнікі" ды іншых. Знаёмыя старонкі творчасці Юрыя Антонава, Веніяміна Баснера, Уладзіміра Высоцкага, Яўгена Глебава, Ісака і Максіма Дунаеўскіх, Валерыя Іванова, Ісака Любана, Барыса Макравусава, Аляксея Рыбнікава, Юрыя Семянякі, Яна Фрэнкеля, Эдуарда Ханка... Яны загучалі ў сучасных аранжыроўках Андрэя Шпянёва, Уладзіміра Ткачэнкі, Аляксандра Каліноўскага ды Сяргея Анцішына, у свежай інтэрпрэтацыі Таццяны Глазуновай, Галіны Грамовіч, Ларысы Грыбалёвай, Дзмітрыя Качароўскага, Сашы Нема, Мікалая Скорыкава, Наталлі Тамелы — словам, усіх 12-і выканаўцаў-спевакоў ды групы бэк-вакалістаў.

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

Дастаткова часта, калі размова ідзе пра чалавека паспяховага ў сваёй прафесіі, можна пачуць: ён прысвяціў сваё жыццё... і далей удакладняецца, якой справе. Гэтыя словы даўно зрабіліся моўным штампам, гучаць даволі пафасна. Аднак я без іх ніяк не магу абысціся, бо яны цалкам справядлівыя ў дачыненні да Людмілы Дзмітрыеўны Сіньковай. Сведчаннем тут (нават калі апусціць усе дэталі і падрабязнасці) – сам яе шлях – ад студэнкі філфака БДУ да прафесара...

Здольнасць перадаваць досвед

Людміла Дзмітрыеўна нарадзілася ў 1958 годзе ў сям'і вучоных-філолагаў (бацька — Дзмітрый Якаўлевіч Бугаёў — вядомы літаратуразнаўца, прафесар; маці — Ніна Дзмітрыеўна — моўразнаўца, шмат год працавала ў Інстытуце моўразнаўства Акадэміі навук). Думаецца, менавіта бацькі паўплывалі на выбар дачкой будучай прафесіі. Калі ў сям'і пануе культ навукі, размовы тычацца праблем культуры, мастацтва і літаратуры, а частымі гасцямі ў доме бываюць вядомыя пісьменнікі, — гэта не можа не пакінуць следу ў душы. Дый генетыка, спадчыннасць — таксама, відавочна, адыгралі свае ролі. Прыгажосць, жаночая абаяльнасць, душэўная цеплыня, вытрыманасць і мудрая разважлівасць — гэтыя якасці, несумненна, у дачкі ад маці. А вось у тыя моманты, калі Людміла Дзмітрыеўна адстойвае свае перакананні, калі абараняе пазіцыі справядлівасці, у ёй яўна бачацца рысы бацькавага характару — рашучасць, адвага, бескампраміснасць...

Ужо ў гады вучобы на філалагічным факультэце БДУ выявіліся даследчыцкія здольнасці Людмілы Дзмітрыеўны, схільнасць да навуковай працы. Пасля была аспірантура, паспяховая абарона кандыдацкай дысертацыі, і з 1984 года пачалася выкладчыцка-педагагічная дзейнасць. Аднак паралельна ішла няспынная навуковая работа, вынікам якой стала абарона доктарскай дысертацыі (1997), вучонае званне прафесара (2001).

У 1999 годзе Людміла Сінькова была прызначана на пасаду загадчыка кафедры беларускай літаратуры XX стагоддзя і працавала на гэтай пасадзе да 2004 года (да моманту рэарганізацыі структурных адзінак філалагічнага факультэта). У гэты ж час працавала на пасадах старшыні савета па экспертызе праектаў НДР па філалогіі пры Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь; старшыні савета філалагічнага факультэта БДУ па папярэдняй экспертызе дысертацый; вучонага сакратара савета па абароне дысертацый у БДУ (прычым разам з першымі кіраўнікамі — членам-карэспандэнтам НАН Беларусі А. Лойкам і прафесарам П. Ткачовым — удзельнічала ў стварэнні гэтага савета, у падрыхтоўцы дакументаў для ягонага адкрыцця); старшынёй філалагічнай секцыі навукова-метадычнага цэнтра вучэбнай кнігі і сродкаў навучання пры Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь; уваходзіла ў склад рэдкалегіі часопісаў "Веснік БДУ",

"Веснік Полацкага дзяржаўнага універсітэта", іншых... Гэты пералік далёка не поўны, яго можна яшчэ доўжыць, аднак і названае, па-мойму, сведчыць пра аб'ём працы прафесара Сіньковай.

У сферы даследчыцкай увагі Людмілы Дзмітрыеўны — літаратура XX — XXI стагоддзяў. Сярод асноўных прац — манаграфія "Беларуская проза XX стагоддзя: Дынаміка жанравых структур" (1996), "Цукровы пеўнік: Літаратурна-крытычныя артыкулы" (1996), "Святло слова: Вучэбны дапаможнік па лінгвакраязнаўству" (у сааўтарстве з Ганнай Басавай і Віктарам Іўчанкавым, 2002), іншыя навуковыя і навукова-метадычныя матэрыялы ў айчынных і замежных выданнях. Публікацыі Людмілы Дзмітрыеўны — не з ліку "незаўважных", яны заўсёды датычацца актуальных пытанняў літаратурнага працэсу, сур'ёзных навуковых праблем. Некаторыя з іх выклікалі сапраўдны рэзананс — дастаткова прыгадаць, напрыклад, толькі артыкул "Агрэсія формы", надрукаваны ў "ЛіМе" ў пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя.

Пры гэтым, варта адзначыць, што студэнты ніколі не застаюцца без увагі свайго настаўніка. Я маю на ўвазе не толькі высокапрафесійныя лекцыі Людмілы Дзмітрыеўны, не толькі змястоўныя і цікавыя семінарскія заняткі... Яна ніколі нікому не адмовіла ў кансультацыі, у дапамозе, наадварот, пры ўсёй занятасці заўжды знаходзіць час для грунтоўнай размовы — уважліва выслухае і цярпліва патлумачыць, дасць параду, дапаможа з пошукам патрэбнай літаратуры,...

Не магу з пэўнасцю сказаць, якія якасці характару Людмілы Дзмітрыеўны спрыяюць таму, што да яе *так* хінуцца студэнты... Відаць, гэта гарманічнае спалучэнне сумленнасці, дабрыні, чалавечнасці з глыбінёй інтэлекту і досведу, вастрынёй даследчыцкага зроку, маштабнасцю мыслення; гэта ўменне "складаное" зрабіць "лёгкім" — патлумачыць даходліва і вычарпальна; гэта здольнасць зацікавіць, надаць імпульс, натхніць... Думаецца, усё гэта якраз і абагульняецца словам "талент". Між іншым, вядомае выслоўе сцвярджае: пра настаўніка мяркуюць па яго вучнях. Што ж, некалькі слоў пра вучняў...

Пад кіраўніцтвам прафесара Сіньковай абаранілі кандыдацкія дысертацыі Вольга Барысенка (сёння — дацэнт кафедры беларускай мовы і літаратуры МДЛУ), Вольга Праскаловіч (дацэнт кафедры рыторыкі і методыкі выкладання моў і літаратур БДУ), Віктар Жыбуль (літаратуразнаўца, паэт), Аксана Бязлепкіна (выкладчык кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі Інстытута журналістыкі БДУ), Фёдар Драбеня (выкладчык сталічнай Політэхнічнай гімназіі № 6, лаўрэат конкурсу "Настаўнік года"), Марына Казлоўская (літаратуразнаўца, выкладчык Ліцэя БДУ)... Як бачна, ніводзін з вучняў "не згубіўся", усе дасягнулі плёну ў прафесіі. І нават больш за тое: усе захоплены сваёй працай, выконваюць яе самааддана, бо — свядома ці падсвядома — імкнуцца адпавядаць настаўніку, раўняюцца на яго высокую планку.

Увогуле ж, трэба сказаць, што ва ўсіх напрамках дзейнасці Людміле Дзмітрыеўне спадарожнічае поспех. Можа, таму, што за кожную справу яна бярэцца з нейкім асаблівым натхненнем, аптымізмам, працуе не "на сябе", а дзеля людзей, як кажуць, "за ідэю". Вось, напрыклад, у 2002 годзе — мэтаскіравана ўзялася за стварэнне навуковага часопіса "Беларускае літаратуразнаўства". Сёння — гэта аўтарытэтнае і папулярнае выданне, дзе маюць магчымасць надрукаваць артыкул не толькі вядомыя вучоныя, але і аспіранты, і студэнты...

Або — яшчэ адзін факт. Усе, хто знаёмы з Людмілай Дзмітрыеўнай, ведаюць, як яна апякуецца творчай моладдзю. Не сакрэт, што на філфаку пішуць амаль усе, а вось надрукаваць творы аўтарам-пачаткоўцам даволі складана. Пры кафедры беларускай літаратуры XX стагоддзя, якой загадвала прафесар Сінькова, з 2002 года пачаў выдавацца літаратурны альманах "Скрыпторый". Менавіта ў гэтым зборніку адбыліся творчыя дэбюты Вікі Трэнас, Веры Бурлак (Джэці), Насты Кудасавай, Жанны Капусты ды шматлікіх іншых аўтараў, якія сёння ўжо сцвердзіліся ў літаратуры, набылі вядомасць. Кожны раз, калі я чытаю іх новыя творы, бачу новыя публікацыі, заўжды думаю пра тое, што на ўсіх гэтых таленавітых творцах ёсць водбліск душэўнага святла Людмілы Дзмітрыеўны.

Сёння, азіраючыся назад, думаю, што ніколі б не напісала дысертацыю ў іншага кіраўніка. Было насамрэч цяжка: сям'я, дзеці, праца ў агульнаадукацыйнай школе... І заўжды, калі мяне апаноўвала роспач, калі пачынала сябе шкадаваць, Людміла Дзмітрыеўна беспамылкова знаходзіла самыя неабходныя словы падтрымкі. У нейкіх выпадках падбадзёрвала, падхвальвала, у іншых — магла добра "ўсыпаць", прысароміць... Ёсць у яе нейкая прыроджаная здольнасць разумець стан чалавека, адчуваць настрой.

Штогод, калі ў семінар прафесара Сіньковай прыходзяць новыя студэнты, я назіраю цікавы працэс: як паступова загараюцца ў іх вочы, як яны ажыўляюцца, зараджаюцца энергетыкай свайго настаўніка... У хуткім часе навуковыя і творчыя запатрабаванні гэтых семінарыстаў выяўляюцца ў публікацыях у рэспубліканскім друку (з'яўляюцца артыкулы ў "ЛіМе", у "Полымі", у "Маладосці", у іншых аўтарытэтных выданнях, дзе, як вядома, не надрукуеш нізкапробны непрафесійны матэрыял), у выступленнях на навукова-практычных канферэнцыях, у факультэцкіх творчых мерапрыемствах...

Сёння правамерна весці гаворку пра ***школу прафесара Сіньковай***. І не толькі навуковую... Але і пра школу маральнасці, сумленнасці, пра школу чалавечнасці. Належаць да гэтай школы вельмі ганарова, бо аўтарытэт настаўніка, само імя — стала ўжо своеасаблівым "знакам якасці", адзнакай высокай прафесійнай кваліфікацыі.

...Людміле Дзмітрыеўне ўласціва адна рэдкая якасць — яна не любіць камплімentаў, не прымае ўхвальных слоў у свой адрас. Толькі паспрабуй заікнуцца, незадаволена нахмурыць бровы і нецярпліва махне рукой — маўляў, хопіць! Аднак цяпер, калі яна святкуе свой слаўны юбілей, у нас, яе вучняў, ёсць важкія падставы, каб сказаць шмат цёплых слоў, выказаць удзячнасць за ўсё, што яна для нас зрабіла, за яе цярплівасць і руплівасць, за мудрыя парады і слушныя заўвагі, за клапатлівае апякунства і душэўную шчодрасць...

Лада АЛЕЙНІК

На здымках: першы склад вучонага савета па абароне дысертацый у БДУ, 2000 год; на традыцыйным свяце паэзіі ў Вязынцы, 2007 год.

Паэзія – жаночага роду

Так ужо склалася, што беларусы — паэтычная нацыя. І калі хто возьмецца мяне ў тым аспрэчваць, хай узгадае свае ўласныя спробы пяра ў юнацтве. Амаль кожны беларус пісаў ці піша вершы, і не мае значэння — для сябе або для публікацыі. Калі звярнуцца да больш глыбокага аналізу, то паэзія як від мастацтва і жанр літаратуры, відавочна, з'яўляецца культурнай асновай менталітэту беларускай нацыі. Любы сучасны від мастацтваў у Беларусі так ці інакш абапіраецца або апелюе да паэзіі — ад народнай творчасці з IX стагоддзя да шырокамаштабных перформансаў канца дзевяностых.

Аналізуючы тэндэнцыі развіцця паэтычнага слова за апошнія 20 год, прыходзіш да думкі, што паэзія з тыпова мужчынскага занятку, які патрабуе самаахвярнага служэння лепшым ідэалам нацыі, ператварылася ў жаночую, як па колькасных, так і па якасных паказчыках. Прытым, чым меншую актуальнасць меў грамадскі пафас і публіка патрабавала ўзнёслага лірычнага радка, тым відавочней паўставала жаноцкасць нашай паэзіі. Каб даказаць відавочнае, не будзем блукаць у класіцы, а спынімся на сучасным літаратурным працэсе.

З прыходам у літаратуру і паэзію такога шматаблічнага і шматграннага пакалення як "Тутэйшыя", акалічнасць жаночага, як галоўнага пачатку, была ўсталявана трывала.

Кожны тутэйшы інтэлектуал, толькі заявіўшы пра сябе, намагаўся заняцца вершаскладаннем, каб стаць новым прарокам ці лірычным геніем, што апявае прыроду, свет і, безумоўна, сваю чароўную пані. Але тыя, каго можна лічыць асобамі ў паэзіі, можна палічыць на пальцах адной рукі. Бо паэзія — гэта не толькі элементарнае вершаскладанне (якім можа патэнцыяльна займацца кожны!), а тое, што звязана з далучэннем да таямніцы: Боская адоранасць, якая дазваляе самому суб'екту назіраць рэчаіснасць больш глыбока, а не павярхоўна-натуралістычна — што бачу, тое і пяю. Чыю тутэйшую паэзію хочацца перачытваць не адзін раз, дык гэта С. Верацілы, А. Мінкіна і А.Сыса, а ў песенным жанры — Л. Вольскага, Зм. Бартосіка і В. Шалкевіча.

Зусім іншая справа з "тутэйшымі" паэткамі. У нас іх вялікі выбар: В. Аксак, А. Дабравольская, Г. Дубянецкая, Н. Кучмель, М. Лукша, Л. Паўлікава, Л. Рублеўская, Т. Сапач, Л. Сільнова, Л. Сом...

Тое, што мы на сёння маем у паэзіі, гэта вынік нашага беларускага гістарычнага шляху. Не сакрэт, якія выпрабаванні перажывала наша Айчына на працягу апошніх двухсот гадоў. Бясконцыя войны і катаклізмы падарвалі мужчынскі генафонд нацыі: мужчынам прыходзілася болей ваяваць або валіць лес у Сібіры, чым задумвацца пра ўзнёслае; да таго ж, змаганні з рознымі ворагамі, рэпрэсіі і звычайны алкагалізм выкасілі лепшую частку мужчынскага насельніцтва нашай краіны. І каму, як не жанчынам на сваіх плячах даводзілася падымаць краіну і ствараць усе магчымыя і немагчымыя матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці.

Відавочна, што сітуацыя ў сучасным грамадстве самым простым чынам адбілася на нашай нацыянальнай паэзіі, бо пакуль мы, мужчыны да сарака гадоў знаходзімся ў стане дзяцінства і шукаем нейкія тэмы ды наватарства ў творчасці, яны, жанчыны — дамы, панны і пані — займаюцца гэтай творчасцю непасрэдна. Кожны беларус патэнцыяльна можа складаць вершы (зрэшты, што і робіць!), але ў паэзіі рэй у нас даўно вядуць асобы лепшай часткі чалавецтва.

Сяргей ПАТАРАНСКІ

Братэрства літаратур

Народны пісьменнік Удмурціі Вячаслаў Ар-Сяргі і ў творчасці сваёй, і ў грамадскіх памкненнях становіцца ўсё бліжэй да Беларусі, беларускай літаратуры. Летась з ініцыятывы паэта і празаіка з Іжэўска ладная падборка твораў беларускіх пісьменнікаў з'явілася ва ўдмурцкім часопісе "Кенеш". Сярод перакладчыкаў — і спадар Вячаслаў. А вершы паэта Ар-Сяргі надрукаваны па-беларуску ў "Полымі" (пераклаў іх Віктар Гардзей) і ў часопісе "Всемирная литература" (у арыгінале — піша наш удмурцкі сябар і па- рускy). Сёлетнім вераснем Вячаслаў прымаў удзел у "круглым стале" "Мастацкі пераклад як шлях адзін да аднаго. Славянскі вектар", арганізаваным па традыцыі Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкай установай "Літаратура і Мастацтва", часопісам "Всемирная литература" і Саюзам пісьменнікаў Беларусі. Сваімі ўражаннямі ад сустрэчы з нашай краінай народны пісьменнік Удмурціі падзяліўся з чытачамі газеты "Известия Удмуртской Республики". Прапануем увазе чытачоў нашага выдання гэтую гутарку (з некаторымі скарачэннямі).

«Шаноўныя сябры — гажано эш'ёс...»

— Вячаслаў Вітальевіч, якія пытанні вы разглядалі на сустрэчах з калегамі?

— <...> Роля ўзаемных перакладаў мастацкіх твораў і ў імклівыя часы глабалізацыі застаецца надзіва высокай і часта становіцца галоўным мастком для паходаў майстроў пяра ў "госці" адзін да аднаго (з сур'ёзнымі літаратурнымі прэзентамі), мастком для ўзаемаразумення і ўзаемнага супрацоўніцтва. А без гэтага само развіццё літаратур ставіцца пад пытанне. Важкасць перакладчыцкай работы бясспрэчна прызнавалася ўсімі ўдзельнікамі сустрэчы, паміж якімі і на "круглым стале", і проста ў кулуарах, узнікалі дзелавыя, канкрэтныя перамовы пра распрацоўкі пэўных сумесных праектаў — так бы мовіць, з вока на вока, але без сакрэтаў. У гэтым і заключаецца дабратворная запатрабаванасць падобных міжнародных літаратурна-культурных мерапрыемстваў.

— Вядома, што вашы творы перакладаліся на беларускую мову. <...>

— Так, пераклады маіх вершаў Віктарам Гардзеем даволі саліднай падборкай былі надрукаваны ў старэйшым беларускім літаратурным часопісе "Полымя". Ён працаваў з перакладамі маіх вершаў з рускай мовы, і кроўная блізкасць дзвюх славянскіх моў не магла не паўплываць на адметную якасць яго працы. Беларуская мова мне, як філолагу па адукацыі, вельмі зразумелая, а як чытачу — і мілая, і прыемная. Мне здаецца, што яна ў многім пакінула ў сабе славянскую пранізлівасць і чысціню. А цяпер, наколькі я ведаю, рыхтуюцца і новыя пераклады маіх вершаў для іншых публікацый і ў іншых мінскіх выданнях. Гэта радуе, натхняе, а яшчэ вызначае паяднанасць літаратуры нашай рэспублікі да вялікіх славянскіх літаратур. У сваю чаргу і я бяруся за пераклады вершаў новых сяброў, з якімі пазнаёміў нас гасцінны Мінск.

— Прадстаўнікі якіх краін удзельнічалі ў "круглым стале"?

— З Расіі было запрошана пяць чалавек. Геаграфія іх пражывання дастаткова ёмістая і паказальная — Масква, Санкт-Пецярбург, Екацярынбург і Іжэўск. Чарнагорыю прадстаўляў Слабадан Вуканавіч, Сербію — Прэдраг Кіюк. Салідна выглядала польская дэлегацыя. <...> Гжэгаш Вішнеўскі, Яўген Кабац — вядомыя майстры пяра з Варшавы. З Любліна — Войцэх Пестка, Збігнеў Фронтэк, цудоўныя паэты. <...> Адпаведна, на кожнай сустрэчы па-добраму дзелавы тон задавалі вядомыя беларускія пісьменнікі і літаратуразнаўцы... <...>

— Былі, відавочна, прыняты і нейкія рэзалюцыі як вынік вашых размоў, дыскусій?

— Так. Самае галоўнае — правядзенне падобных мерапрыемстваў нам хочацца вызначыць у добрую традыцыю, нейкім чынам мы маглі б надалей не толькі знаёміцца (і гэта важна!), але і прадстаўляць свае рэальныя работы, здабыткі па тэматыцы перакладчыцка-творчых планаў. Так бы мовіць — і справаздачу трымаць. А галоўнае — замацоўваць сувязі нашых літаратур у імя галоўнай мэты — спрыяння дабрыні, чысціні, адухоўленасці чытача.

— Вы былі ўпершыню ў Мінску?

— Так. І на Беларусь я гляджу вачыма засумаваўшага пілігрыма. Усё было надзвычай цікава. І гэта ўсё — на фоне адкрытых, светлых і дабратворных поглядаў жыхароў гэтай прыгожай зямлі — Белай Русі. Скажу без какецтва, я палюбіў Беларусь. Канечне ж, я пра гэта напішу ў будучым... Гэта, мажліва, увойдзе і ў мае кнігі... Калі я гавару магічнае слова "Беларусь", я адразу бачу перад сабою дзейсных і стваральных людзей адкрытай мною прасторы, тых, хто рупіцца над днём сённяшнім, хто дбае над будучыняй краіны: першага намесніка міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Лілію Станіславаўну Ананіч, галоўнага рэдактара часопіса "Всемирная литература", дзе друкаваліся і мае вершы, валявога чалавека, надзеленага далікатным прыродным тактам, унікальнага празаіка Алеся Наварыча, філосафа і паэта, які гатовы заўжды прыйсці на дапамогу таварышам, Юрыя Сапажкова... А як мне забыць гасціннасць бацькі і сына Лайковых у беларускай вёсцы Мётча. Малады Янка Лайкоў, між іншым, вельмі таленавіты паэт, з самабытнай манерай пісьма. У гэтым шэрагу я бачу і Івана Ярашэвіча, паэта, дырэктара Смілавіцкай сярэдняй школы, які падараваў нам унікальныя сустрэчы са смілавіцкімі малымі радзімамі класікаў сусветнай культуры — польскага кампазітара Станіслава Манюшкі і мастака Хаіма Суціна. Душэўна-трапяткім падаецца мне і асабістае бласлаўленне смілавіцкага святара айца Валерыя, які ўсім сваім выглядам, усёй душою нясе людзям добры свет... Адзін пералік імён гэтых і іншых дастойных людзей зойме немалую газетную плошчу, і ўсе яны застаюцца ўва мне, як яркія пазнакі на шляхах стваральных...

— У дні вашай сустрэчы з Беларуссю праходзіў і Дзень беларускага пісьменства — традыцыйнае ўжо для радзімы Купалы і Коласа свята...

— І нам выпаў гонар удзельнічаць у святе. Гэта было сапраўды вялікае свята ў Барысаве — старажытным горадзе Міншчыны! Дзесяткі і дзесяткі тысяч людзей прысутнічалі на ім з усіх куточкаў Беларусі, а таксама і з-за межаў. Гэта было сапраўды народнае свята, Свята духа беларускага Слова. Віншаванні кіраўнікоў рэспублікі, бласлаўленне Праваслаўнай царквы, выступленні прафесійных і самадзейных артыстаў, падвядзенне вынікаў усемагчымых конкурсаў і акцый, у тым ліку і літаратурных... Прысуджэнне прэміі за лепшыя кнігі выдавецтвам, прэміі лепшым пісьменнікам краіны... Цэлы дзень гучала барысаўская "сімфонія" святкавання беларускага Слова... Я ўдзельнічаў у гэтым прыгожым "музычным" дзеянні са светлай і добрай зайздрасцю — ах, як бы і нам такое стварыць на ўсеагульную радасць!

— Вы таксама, наколькі мне вядома па вашым мінскім інтэрв'ю тэлеканалу "Мір", чыталі свае вершы на высокай сцэне барысаўскага свята. І на якой мове?

— Ад нашага форуму выступілі на святе чарнагорац, паляк і я — згодна рашэння аргкамітэта. А вершы свае чытаў на мовах іх стварэння — удмурцкай і рускай. Мне падалося, што яны былі зразумелыя без перакладу і былі цёпла прыняты людзьмі, чым я прызнацца, вельмі ганарыся (як у Пісанні — "слаб чалавек"...) І, канечне ж, мае вершы былі пра каханне, зразумелае ўсім. Сапраўды, "шаноўныя сябры — гажано эш'ёс — дорогие друзья".

Пераклаў з рускай мовы
Кастусь ЛАДУЦЬКА

Пра ўчарашняе ды незваротнае

Аналізуючы творчасць Славаміра Антановіча (ён — аўтар ужо трох грунтоўных раманаў "Пётр Машеров", "Призраки Можейковской крепости" і "В августе девяносто первого...", чатырох дакументальных кніг і зборніка вершаў), выразна бачыш, як яна мянялася і сталела. Імкненне пісьменніка адлюстроўваць у творах тыя прыкметныя з'явы, якія адбываліся ў нашым грамадстве, напрыклад, пяцьдзесят — сто ці нават дваццаць — пятнаццаць гадоў таму, — акурат і з'яўляецца прыкметай сталасці яго таленту.
З пісьменнікам Славамірам АНТАНОВІЧАМ гутарыць карэспандэнт штотыднёвіка "Літаратура і мастацтва".

— Славамір Валяр'янавіч, „у вашым гістарычным рамане „В августе девяносто первого...", які нядаўна пабачыў свет у выдавецтве "Мастацкая літаратура" і якога ўжо няма на паліцах кнігарняў, апавядаецца пра падзеі нядаўняга мінулага. У гэтым рамане вы выступаеце ў якасці палітолага-пісьменніка, ці ў якасці пісьменніка, які не забыўся пра паліталогію?

— Напэўна, у першую чаргу — у якасці палітолага, які займаецца пісьменствам. У рамане знайшлі адлюстраванне складаныя і надзвычай важныя падзеі ў гісторыі беларускага народа, звязаныя з людскімі мітынгамі і дэманстрацыямі на вуліцах і плошчах, разбурэннем вялікай дзяржавы — Савецкага Саюза, зыходам з палітычнай арэны камуністычнай партыі. Я паспрабаваў сфакусіраваць у творы стаўленне да працэсаў, што адбываліся ў дзевяноста першым годзе ў грамадстве і на палітычным "алімпе", як простых людзей, так і некаторых "штатных" работнікаў былых абкамаў, гаркамаў, райкамаў партыі. Адным словам, сярод дзеючых асоб рамана — і вярхоўныя лідэры, і звычайныя грамадзяне.

— Разумею, што пры стварэнні такога рамана трэба было мець, акрамя ўласнага досведу, шмат матэрыялу дакументальнага...

— Узяцца за напісанне рамана дапамог мне, вядома ж, вопыт, набыты мной падчас працы на адказных пасадах у ЦК КП Беларусі, Вярхоўным судзе, Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, Генеральнай пракуратуры. Змест і падзеі рамана вымагалі таксама выкарыстання шматлікіх архіўных крыніц. Таму даводзілася расшукваць многія дакументы мінулага часу, некаторыя з якіх захоўваліся "за сям'ю замкамі" і да якіх, зразумела, меў дзяржаўны "допуск". Але менавіта наяўнасць вялікай колькасці скарыстаных у рамане дакументальных матэрыялаў, спадзяюся, зацікавяць кожнага неабыякавага да айчыннай гісторыі чалавека.

— Раман "В августе девяносто первого..." па сваім змесце хутчэй біяграфічны, а па жанры, відаць, гістарычна-палітычны. Аднак гэта асаблівасць літаратурнага твора, на мой погляд, ні на кроплю не прыніжае яго мастацкай вартасці, а, наадварот, робіць яго асабліва адметным. Літаратурныя героі Сцяпан Батурын і Ірына Гужынская, якія жывуць, думаюць, дзейнічаюць у адведзеным ім лёсам часе, надзелены надзвычайнай гістарычнай памяццю, чысцінёй пачуцця... Ці не так?

— Раман "В августе девяносто первого..." не з'яўляецца звычайным белетрыстычна-гістарычным даследаваннем. Гісторыя, звязаная з тымі ж драматычнымі падзеямі нацыянальна-вызваленчага руху Рэчы Паспалітай і Вялікага княства Літоўскага супраць расійскай, шведскай, прускай інтэрвенцый у XVII стагоддзі, канфліктнымі сітуацыйна-палітычнымі момантамі ў 1953, 1964 і 1991 гадах, вайной у Афганістане, пабудавана на фактычным матэрыяле, з улікам тых гістарычных супярэчнасцей, якія існавалі падчас развіцця тагачаснага беларускага грамадства. І, вядома ж, Сцяпан Батурын і Ірына Гужынская з'яўляліся яркімі прадстаўнікамі свайго пакалення.

— Прыгадваецца, нехта з партыйных дзеячаў таго часу параўноўваў палітыку з заапаркам. У палітыкаў — свае вобразы, а ў вас?

— У маім рамане існуе не толькі вобраз палітыкі, але і вобраз палітычнага тэатра, дзе партыйныя дзеячы выконваюць у ім свае ролі, глыбока не думаючы аб наступствах. А сітуацыя сапраўды складвалася няпроста. Менавіта аб падзеях, якія закруціліся на той час вакол Дзяржаўнага камітэта па надзвычайным становішчы ("ГКЧП"), а пасля і "Белавежскай змовы" і апавядаецца ў рамане. Брудная палітыка (інтрыгі і махінацыі, здрада і дыпламатыя, чалавечыя эмоцыі і г.д.) у тыя жнівеньскія дні якраз і з'яўлялася той рухаючай сілай, якой былі ахоплены амаль усе слаі насельніцтва.

— Аўтабіяграфічны герой вашага рамана Сцяпан Батурын, як падаецца, неяк прааналізаваў сітуацыю і — зрабіў для сябе горкія высновы: сістэма зламалася не з-за эканамічнага разладу, не ад "гнілога" дысідэнцтва, як пісалі ў друку, а з-за... бязглуздага, бездапаможнага кіраўніцтва партыяй. Аднак на той момант і вы былі ў партыйных колах. Дзе было ваша месца? У партэры, у аркестравай яме ці на галёрцы?

— У партэры знаходзілася насельніцтва, якое не вельмі разумела, што тварылася на той час за кулісамі. Я ў тыя дні таксама знаходзіўся за кулісамі і час ад часу з'яўляючыся ў антракце, тлумачыў гледачам: тое, што толькі дэманстравалася перад імі на сцэне, — гэта падман зроку. Тлумачыў ім, інфармаваў іх што на самай справе робіцца ў краіне, і што людзі будуць ад гэтага мець. Дарэчы, і кніга "В августе девяносто первого..." інфармуе чытачоў аб падзеях, якія закранулі на той час не адну сям'ю.

— Славамір Валяр'янавіч, у рамане ёсць і эпізадычныя героі — да прыкладу, "афганцы. Вобраз таго ж Анатоля Бандарчыка (Амінь аль-Ансары) у творы паказаны ў экстрэмальных умовах вайны ў Афганістане. Праўда, іншы раз, як чытач, адчуваеш незадаволенасць тым, што толькі што "створаныя" ў сярэдзіне кнігі персанажы раптам знікаюць з палатна твора. Чаму так здарылася?

— Усе гэтыя персанажы былі неабходны ў сюжэце рамана толькі дзеля таго, каб больш яскрава адлюстраваць лёс галоўнага героя рамана — Радзімы, якая, на мой погляд, павінна знаходзіцца ў полі зроку чытача з першай і да апошняй старонкі твора.

Гутарыў
Валянцін БАРЫСЕВІЧ

P. S. *Адметнай рысай гістарычных раманаў Славаміра Антановіча "Призраки Можейковской крепости" і "В августе девяносто первого..." з'яўляецца тое, што яны выходзяць за рамкі чыста літаратурнага факта. Гэтыя творы — прафесійная вышыня аўтара. І, відаць, тыя, хто чытаў (ці чытае цяпер) раман "В августе девяносто первого...", адчулі, што пісьменнік старонку за старонкай прысвячае не толькі роднай Шчучыншчыне, але ўвогуле — нашай беларускай зямлі, яе людзям, якія нават у цяжкія дні выпрабаванняў у жніўні дзевяноста першага года не здрадзілі Радзіме, жылі і цяпер жывуць клопатамі аб будучыні роднай краіны, імя якой — Беларусь.*

В.Б.

Французы з радасцю пакідаюць Парыж і едуць у маленькія беларускія вёскі, англічане гатуюць бурачныя салаты, галандцы мяняюць заканадаўчы акт на старажытны беларускі абрад. І гэта не фантастыка, гэта аграгурызм. 1500 кіламетраў праз Беларусь праехалі ў жніўні 30 замежных велатурыстаў і беларускіх валанцёраў. "Веласіпедны тур салідарнасці з турыстычнай Беларуссю" арганізавала Беларускае грамадскае аб'яднанне "Адпачынак на вёсцы" сумесна з Еўрапейскім цэнтрам па эка- і аграгурызме пры падтрымцы Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь. Вандроўнікі пабывалі ў пятнаццаці раёнах Брэсцкай, Гродзенскай, Мінскай і Віцебскай абласцей. Адзін з самых яркіх успамінаў велатурыстам пакінуў пра сябе Лепельскі раён.

Тры дні ў «Краі жоўтых гарлачыкаў і сівых валуноў»

Аграгурызм для нашай краіны не проста перспектыўны кірунак развіцця малога бізнесу, гэта яшчэ і мажлівасць захаваць фальклор, традыцыі, спроба даць мажлівасць аўтэнтычнаму арганічна існаваць у інфармацыйным грамадстве".

Край жоўтых гарлачыкаў і сівых валуноў

Зялёны маршрут з такой назвай быў распрацаваны некалькі гадоў таму ў Лепельскім раёне. Людзей розных прафесій — спецыялістаў па сельскай гаспадарцы, мастакоў, гісторыкаў, удзельнікаў фальклорных гуртоў — аб'яднала неабыякавасць да мінулага і сучаснага сваёй зямлі. Яны сабраліся разам і пад кіраўніцтвам прафесійнага тэатральнага рэжысёра Вольгі Маханенкі выбралі 19 месцаў, якія могуць здзівіць гасцей раёна: вёскі, дзе памятаюць і выконваюць абрад "Жаніцьба Цярэшкі" (яму больш як дзесяць стагоддзяў), дзе спяваюць мясцовы фальклор і танчаць знакамітую ў гэтых краях падыспань, старажытныя валуны-ахвярнікі, векавыя дрэвы, крыніцы, курганы. І сёння гэтыя людзі не проста суполька энтузіястаў, а рэгіянальнае аддзяленне Беларускага грамадскага аб'яднання "Адпачынак на вёсцы", а 19 месцаў — не проста кропкі на карце, а паўнавартасны зялёны маршрут, які можа прымаць і прымае турыстаў.

Дзень першы. За шчасцем пад дрэва

Удзельнікі велатура правялі на маршруце тры дні. Зразумела, што за такі кароткі тэрмін паглядзець усё немагчыма. Для гасцей выбралі самае цікавае. І ў першы дзень велатурыстаў чакала сядзіба Уладзіміра і Зінаіды Міхановічаў у вёсцы Окана.

Спачатку інтарэсы гасцей разышліся. Амілін з Францыі больш за ўсё спадабалася тое, што хата знаходзіцца на ўскрайку леса: "Я прыехала з месца, дзе няма травы, кветак, птушак, грыбоў, амаль няма дрэваў, а ёсць толькі каменне, цэгла, бетон, жалеза і шкло", — так сумна і шэра сказала яна пра мару амаль кожнага з нас — Парыж. Артуру і Джоан з Лондана спадабаліся дываны, якія выткала яшчэ маці Зінаіды Пятроўны. Карацей, кожнаму сваё: каму — спевы фальклорнага гурта "Акаціцы", каму — суп з лісічак і брусніцы, каму — старая традыцыйная забудова падворка вянком (усё пабудовы ўнутры двара і ўваходы, акрамя галоўнага, схаваны ад людскога вока) і лад гаспадаркі.

Але было і тое, што інтарэсы аб'яднала. Гордасць Міхановічаў — гнездаванне побач з сядзібай шэрай чаплі. Гэта досыць рэдкая птушка ў Беларусі і звычайна селіцца далёка ад чалавечага жытла. Але тут яна ўпадабала ўскрайек лесу і сяброўства з жыхарамі сядзібы: калі якое-небудзь птушанё выпадае з гнязда, Міхановічы забіраюць яго ў свой куратнік (гняздо дужа высока — назад не пакладзеш), гадуюць, а потым, як адужае, выпускаюць на волю. Вось і вяртаюцца чаплі на адно і тое ж месца, да добрых гаспадароў-суседзяў.

А яшчэ недалёка ад сядзібы расце дрэва шчасця — дзве сасонкі, якія зрасліся ў адну на вышыні прыкладна ў паўметра ад зямлі. І хто праз гэты трохкутнік пралезе, той будзе шчаслівы і здаровы.

Нешчаслівых у той вечар і сапраўды не было. Турысты сядзелі ля вогнішча ўжо на іншай сядзібе, размаўлялі на сваіх родных мовах, і час ад часу ў іх размовах чуліся знаёмыя імёны — Зіна і Валодзя. Так уразілі іх сталыя (абаім за семдзесят), шчырыя, гасцінныя і ўвішныя гаспадары.

Дзень другі. «Смачна есці!»

У гэты дзень часцей за ўсё паўтараліся не імёны, а выслоўе "Смачна есці!". Па-першае, таму што так называўся фестываль традыцыйнай беларускай кулінарыі, які праводзіўся на базе Лепельскага ваеннага санаторыя, а па-другое, таму што сапраўды было вельмі смачна.

Турысты і ўсе жадаючыя мелі магчымасць паспытаць традыцыйныя беларускія стравы: ад звычайных і добра знаёмых усім дранікаў да незвычайнай і вельмі карыснай для сэрца салаты з макрыцы. Калі страва падабалася, то гурманы маглі запісаць яе рэцэпт ці разам з гаспадыняй паспрабаваць яе тут жа прыгатаваць.

Гаспадыні спаборнічалі ў трох катэгорыях: аматарскія аб'яднанні кухараў, гаспадыні сядзіб і прафесійныя кухары. Галоўнай конкурснай стравай быў яблычны пірог, з нагоды адсвяткаванага Яблычнага Спаса. Гран-пры інтэрнацыянальнае журы (у яго ўваходзілі прафесіяналы і аматары з Беларусі, Нідэрландаў і Германіі) прысудзіла Тамары Шчарбаковай з пасёлка Бароўка за дзве яе стравы — яблычны пірог і рыбныя клёцкі.

Не забыліся арганізатары фестывалю і на "ежу" для душы. Побач з гаспадынямі выступалі фальклорныя калектывы, гралі музыкі, давалі майстар-класы народныя майстры.

Але галоўным у гэты дзень быў, безумоўна, смак ежы сапраўднай, якая прыйшлася па гусце замежным гасцям. Некаторыя з іх абмежаваліся буклетамі з рэцэптамі, а іншыя доўга распытвалі гаспадынь, як прыгатаваць тое, што ўпадабалі. І я думаю, што не марна. Так, напрыклад, бурачная салата Галіны Жураўлёвай упрыгожыць стол і здзівіць гасцей на якой-небудзь лонданскай вячэры.

Дзень трэці. «Каб вілася жонка да мужа, як хмель да дубочка»

Трэці дзень быў адзначаны падзеяй вельмі важнай не толькі для лепельскай часткі маршруту і канкрэтна гэтага велатура, але і для ўсяго аграгурыстычнага кірунку нашай краіны. Такога на Беларусі яшчэ не было — вяселле замежных гасцей па старажытных беларускіх традыцыях.

Галандзец Мэна і француженка Мацільда даўно кахаюць адно аднаго, але ім цяжка было ўзяць шлюб у Еўропе, бо яны з'яўляюцца грамадзянамі розных краін. Абое працуюць у аграгурыстычнай сферы. Мэна не раз бываў у Беларусі (у тым ліку і на Лепельшчыне), бачыў некаторыя з нашых вясельных традыцый, прыкладам, абрад "Жаніцьба Цярэшкі", і вырашыў справіць сваё вяселле тут. Для маладых (дарэчы, як і для гасцей) абрад быў не забаўкай і не гульнёй. Яны шчыра спадзяюцца, што старыя звычаі і сакральныя сімвалы звяжуць іх мацней, чым заканадаўства Нідэрландаў ці Францыі. І, напэўна, не памыляюцца, бо добрыя прыкметы так і "сыпаліся" на іх: з раніцы ішоў дождж, пасля палудня на небе з'явілася вясёлка, у гаспадарцы па старабеларускім узоры Віктара Труфанава "Люкжына", дзе праходзіла вяселле, за некалькі дзён да яго ажарабілася кабыла і акацілася авечка.

Абрад пачаўся з развітання маладых з вольным жыццём: старыя спявалі вясельныя песні, сяброўкі забралі нявесту, сябры — жаніха. Маладых перааранулі ў святочныя народныя строі, якія ўручную зрабілі мясцовыя майстры. Пасля яны прайшлі праз вароты шчасця (гірлянды з кветак), а госці абсыпалі іх зернем і хмелем (абсыпаючы хмелем, прыгаворвалі: "Каб вілася жонка да мужа, як хмель да дубочка"). Жаніх аддаў выкуп за нявесту, выкуп за каня і павёз маладую да разгалістага дуба, да якога яны абавязкова павінны былі дакрануцца і прызнацца адно аднаму ў каханні, каб яно было такім жа вечным, як і гэтае дрэва. Пасля ў возера выкінулі замок, які будзе захоўваць шчасце маладых, а ключ ад яго пакінулі толькі бацьку нявесты. Апошнім выпрабаваннем стала ачышчэнне агнём: маладыя стаялі ў вогненным коле — сакральным сімвале, — а дым ляцеў у неба, забіраючы з сабою іх апошнія сумненні...

Далей было беларускае вясельнае застолле: з дванаццаццю абрадавымі стравамі, з кажухом, на які садзілі маладых, з цымбаламі, гармонікам, спевамі, полькамі, з пераходам з адкрытага паветра ў сімвалічную хату маладых.

Распытваць Мэна і Мацільду пра іх адчуванні ў той дзень было бессэнсоўна: спачатку яны ў адзін голас казалі, што хвалююцца, а потым пасміхаліся і моўчкі хіталі галовамі ў адказ на пытанне: "Ці шчаслівыя вы?".

Гасцям вяселле вельмі спадабалася. Артур з Лондана з жонкай ужо сорак гадоў разам, але пасля гэтага вяселля падумаў: а ці не ажаніцца яму яшчэ раз, у Беларусі?

У Лепельскім рэгіянальным аддзяленні БГА "Адпачынак на вёсцы" таксама лічаць, што ў "Краі жоўтых гарлачыкаў і сівых валуноў" адным вяселлем справа не абмяжуецца. Яго кіраўнік, Вольга Маханенка, плануе працягваць жаніць беларусаў і замежных гасцей па старажытных абрадах і распрацоўвае новыя праекты: "Аграгурызм трэба разумець шырэй, чым проста "хата на вёсцы і мажлівасць павудзіць рыбу". Асабліва, калі мы кажам пра аграгурызм для замежжа. Француз можа вудзіць рыбу і ў Францыі, а мы павінны паказаць яму нешта асаблівае, тое, што ён нідзе больш не ўбачыць. Акрамя таго, аграгурызм для нашай краіны не проста перспектыўны кірунак развіцця малога бізнесу, гэта яшчэ і мажлівасць захаваць фальклор, традыцыі, спроба даць мажлівасць аўтэнтычнаму арганічна існаваць у інфармацыйным грамадстве".

Алена МАЛЬЧЭЎСКАЯ

Фота аўтара

З кагорты гуманістаў

Алег Антонавіч Лойка вызначаўся найперш сваёй чалавечнасцю, дабрынёй і ўменнем спагадаць людзям, рабіць добрыя справы ў дачыненні да тых, каго паважаў ці хоць бы не лічыў адпетымі, безнадзейнымі нягоднікамі.

Адна ягоная мініяцюра, змешчаная ў зборніку вершаў "Неўміручасць", гучыць так:

Не дабягу — дайду,
Не дайду — дапаўзу
У кожную бяду,
У кожную слязу.

Вядома, наконт кожнай бяды ды слязы — характэрнае для паэзіі перабольшанне. Але добрыя справы ён імкнуўся рабіць на працягу ўсяго свайго свядомага жыцця. З вялікай удзячнасцю, у якой выразна выяўляецца далікатная, чулая душа паэта, згадваў ён у аўтабіяграфіі "Праз гады" сваю першую школьную настаўніцу, якая выкладала польскую мову: "Мне сёння здаецца, што гэта перш за ўсё яна, увайшоўшы ў маю душу, назаўсёды пакінула ўва мне чуласць да чалавека, нават боязь, каб не пакрыўдзіць каго-небудзь чым-небудзь. Калі я быў малы, мне кожны дарослы здаваўся ледзь не богам, у кожным бачыў я важнае, незвычайнае, чаго я не ведаю, а ведае ён, я не магу, а ён можа. Гэтае пачуццё ў адносінах да людзей не пакінула мяне і зараз, хоць, вядома, цяпер я крыху навучыўся адрозніваць, хто што ведае і можа. Улічыўшы вось гэтую асаблівасць майго светаўспрымання, мне здаецца, кожны можа лёгка ўявіць, як у маіх вачах узвялічвалася "пані навучыцелька". Яна была самая прыгожая! Яна ўсё ведала, усё магла! Такой я і запомніў яе на ўсё жыццё".

Гэтае захапленне настаўніцай дапамагала хлопцу засвойваць тады яшчэ невядомую яму і незразумелую польскую мову. Пазней ён пасябраваў і з гэтай мовай, свабодна пісаў і гаварыў на ёй.

Прачула, з адкрытай, шчыра выказанай удзячнасцю расказаў А. Лойка пра свайго настаўніка па БДУ Ю. Пшыркова, з якім потым падтрымліваў сяброўскія сувязі, у нарысе "Кувайце, кісцянёўскія зязюлі".

Добразычлівасць Алега Лойкі выяўлялася і ў тым, што ён ахвотна падтрымліваў многіх пісьменнікаў, найперш паэтаў. Рабілася гэта ці ў даволі грунтоўных артыкулах або рэцэнзіях для перыёдыкі, ці ў прадмовах да выдадзеных кніг адпаведных аўтараў, ці ў рэцэнзіях закрытых, пісаных для выдавецтва, калі кнігу трэба было яшчэ прабіць у друк.

Алег Антонавіч прыхільна выказваўся пра В. Таўлая і А. Іверса, С. Новіка-Пеюна і П. Бітэля, А. Вялюгіна і Ул. Караткевіча, А. Разанава і Л. Галубовіча, В. Супруна і С. Пярловіча, В. Зуёнка і Ул. Марука, А. Пашкевіча і А. Сербантовіча, М. Арочку і М. Стральцова, В. Макарэвіча і А. Грачанікава, Г. Бураўкіна і С. Гаўрусёва, А. Вярцінскага і Я. Сіпакова, Р. Семашкевіча і Я. Янішчыц, Ю. Голуба і В. Іпатаву, Е. Лось і Д. Бічэль, К. Цвірку і Ю. Свірку ды яшчэ многіх іншых паэтаў.

Цэлых два дзесяцігоддзі кіраваў А. Лойка аб'яднаннем маладых паэтаў на філфаку БДУ. Яно дало пуцёўку ў жыццё многім юнакам і дзяўчатам.

Хораша аналізаваў Алег Антонавіч аповесці В. Быкава, раманы І. Мележа і зноў жа Ул. Караткевіча. Уважліва чытаў ён і літаратуразнаўчыя працы Г. Кісялёва, А. Мальдзіса, І. Ралько, В. Рагойшы, М. Мушынскага і іншых даследчыкаў.

У 1981 г. Лойка выдаў ёмістую кнігу "Паэзія і час" з падзагалоўкам "Літаратурна-крытычныя артыкулы, творчыя партрэты". У ёй сустракаюцца імёны Р. Барадуліна, Н. Гілевіча, П. Макаля, С. Дзяргая, М. Дуксы і многіх іншых стваральнікаў паэтычнага слова. Уражліва тут напісана пра трагічны лёс Ул. Лісіцына.

У разважаннях пра літаратуру выразна бачыцца высокая патрабавальнасць А. Лойкі, яго прынцыповасць. Ён не баяўся сказаць пахвальнае слова і пра тых пісьменнікаў, афіцыйны погляд на якіх быў прадузяты ці нават рэзка адмоўны. Вядома, гэта ўскладняла выданне кніг даследчыка. Але ён упарта змагаўся, часамі даходзячы да самых вярхоўных улад, напрыклад, да Ю. Андропава, які ў выданні адной Лойкавай кнігі дапамог.

Высокую прынцыповасць А. Лойка захоўваў да канца сваіх зямных дзён. Каб у гэтым пераканацца, дастаткова перачытаць яго зборнік "Галгофа. Кніга лёсаў", выдадзены ўжо у 2001 г. Гэта адна з самых выдатных кніг беларускай крытыкі. Яна зноў жа з вельмі шырокім ахопам літаратурных з'яў. Ёсць тут і спавядальнае слова пра самога аўтара, пра тое, што яму ў свой час замінала ў літаратурнай працы і ў самім жыцці.

Добра ўспрымаецца ёмістая манаграфія А. Лойкі "Максім Багдановіч". Пра Багдановіча Лойка пісаў шмат і з рознай нагоды, у тым ліку з выпадку выдання твораў паэта ва Украіне. Але гэтая манаграфія падае паэтава жыццё і яго творчасць маштабна, ва ўсёй складанасці і разнастайнасці.

Аднак вяршынным дасягненнем Алега Лойкі (пры ўсёй значнасці яго паэзіі і літаратуразнаўчых ды крытычных прац, у тым ліку, даследаванняў па гісторыі нашай літаратуры) з'яўляюцца раманы-эсэ пра Купалу і Скарыну. Гэтыя раманы-эсэ ў нас унікальныя. На беларускай мове яны выйшлі ў 1992 г. Купалаўская кніга мае загаловак "Як агонь, як вада". Яна адзначана Дзяржаўнай прэміяй Беларусі імя Якуба Коласа. Назва скарынінскай кнігі "Францыск Скарына, або Сонца маладзіковае". За гэтымі кнігамі стаіць велізарная даследчыцкая праца. Але напісаны яны майстрам слова, мастаком. І ў гэтым іх ці не найбольшая прывабнасць. Цікавы і той факт, што абедзве кнігі трапілі ў серыю "ЖЗЛ" ("Жизнь замечательных людей"), заснаваную М. Горкім яшчэ ў 1933 г. Лойкавы кнігі ў гэтай серыі выйшлі адна ў 1982 г., другая ў 1989 г. У Маскве кнігу пра Купалу аказалася прабіць лягчэй, чым у тагачасным Мінску. У адпаведнасці з патрабаваннямі серыі, Лойкавы кнігі называюцца проста — "Янка Купала", "Скарына". Выдадзены яны, вядома, у перакладзе на рускую мову. І з'яўляюцца адзінымі да сённяшніх дзён кнігамі ў гэтай серыі пра беларускіх пісьменнікаў. Атрымліваецца, што за 75 гадоў існавання прэстыжнай горкаўскай серыі ніхто з беларускіх даследчыкаў, акрамя А. Лойкі, у гэтую серыю не прабіўся. Факт даволі сумны.

Але час вярнуцца да больш прыемных рэчаў, да гаворкі пра Лойкаву чалавечнасць. Яна выяўлялася і ў тым, што ён ахвотна дарыў свае кнігі калегам па працы. Я таксама маю дзесятак кніг з яго дарчымі аўтографамі. Прыгадаю толькі два з іх. Зборнік "Паэзія і час" падпісаны так: "Дарагому Дзмітрыю Бугаёву са шчырым даўнім вітаннем і падзякай за словы калегі і сябра. 1981". "Галгофа" падаравана ўжо ў 2002 г. з подпісам: "Дарагому Дзмітрыю Бугаёву, з якім шчасце быць поруч". Яшчэ куды больш падстаў было і ў мяне так сказаць пра Алега Антонавіча, бо, акрамя таго, што ён выпраменьваў токі аптымізму і дабрыні на тых, хто працаваў разам з ім, дык мяне яшчэ неаднойчы бараніў у цяжкіх сітуацыях. Усім, хто блізка яго ведаў, А. Лойка даваў прыклад і сваёй вялікай, нястомнай працавітасцю. Яна ў яго працягвалася да канца жыцця. Толькі ў 2001 г. выйшлі яго кнігі: "Старабеларуская літаратура" — падручнік для студэнтаў ВНУ, ужо згаданая крытычная "кніга лёсаў" "Галгофа", а яшчэ ладны паэтычны зборнік "Ушанаванне", у якім змешчаны вершы і паэмы, створаныя ў 90-я і наступныя гады. 2000-м датуецца зборнік вершаў "Неўміручасць".

Мужна рабіў сваю справу Алег Антонавіч і тады, калі невылечная хвароба падступала з усё большай няўмольнасцю. Апошняй ягонай друкаванай працай стала вялікая кніга "Дрэва жыцця" памерам 38,7 улікова-выдавецкіх аркушаў — ажно 624 старонкі павялічанага кніжнага фармату. Тут дадзена падсумаванне ўсяго, што зроблена аўтарам. Падсумаванне сціслае, але кніга атрымалася вялікай, бо спраў было шмат. Такі вынік проста здзіўляе. Аказваецца, чалавек, калі ён надзелены такім рознабаковым талентам, як у Алега Лойкі, і не стамляецца заўсёды працаваць упарта і натхнёна, можа зрабіць вельмі многа.

Алег Антонавіч у фізічным сэнсе пайшоў ад нас. Але нам застаецца яго багатая творчая спадчына, застаецца памяць пра ягоную сардэчнасць, чуласць, чалавечнасць.

Хай табе, дарагі Алег Антонавіч, пухам будзе твая родная слонімская зямелька.

Дзмітрый БУГАЁЎ

Ён сэрца аддаваў будучыні…

Не ведаю, ці бачыў калі хто з нас, студэнтаў 80-х, яго змрочным. Несумненна, як і ўсе мы на гэтай зямлі, ён і сумаваў, і маркоціўся. Аднак застаўся ў памяці і паўстае перад вачыма з нязменнай усмешкай на вуснах. Яго немагчыма ўявіць злосным. Альбо ўявіць, як ён павышаным тонам размаўляе са студэнтам. Хоць, як і ў кожнага выкладчыка, падстаў для гэтага хапала. Але на прагульшчыкаў ды тых, хто бездапаможна "тануў" на экзамене, ён глядзеў нязменна добрымі вачыма, у якіх, праўда, чыталася шчырае недаўменне: як можна не ведаць свой асноўны прадмет? І як можна не любіць родную літаратуру? Для самога Алега Антонавіча беларуская літаратура была менавіта роднай. У яго быў цудоўны паэтычны густ... "Чым больш у Беларусі будзе паэтаў, тым лепш", — казаў ён, і гэтым самым ставіў прамую залежнасць высокай духоўнасці і культуры свайго народа ад колькасці далучаных да прыгожага, у тым ліку, і да прыгожага пісьменства.

Між тым, праз універсітэцкае літаб'яднанне "Узлёт", якім ён кіраваў не адно дзесяцігоддзе, прайшлі сотні(!) пачаткоўцаў, многія з якіх пасля сталі вядомымі пісьменнікамі.

Зрэшты, да ўсіх студэнтаў-філфакаўцаў ён адносіўся з асаблівай любоўю, бо лічыў іх аднадумцамі і адзначерцамі ў адносінах да роднага слова і роднай літаратуры. Яму плацілі тым жа, яго паважалі, я ніколі не чуў, каб яго за вочы абгаворвалі, не бачыў, каб на яго крыўдавалі. Ды і за што, Бог ты мой, было крыўдаваць на гэтага светлага чалавека! Ён, увогуле, вельмі любіў моладзь, верыў у яе, і ўсё сваё вялікае сэрца аддаваў ёй, а значыць, па вялікім рахунку, аддаваў будучыні так любімай ім Беларусі.

Яго дабрыні не было межаў, і кожны з нас ведаў, што з любой праблемай лепш ісці да яго. І да яго ішлі — не таму, што карысталіся гэтай самай дабрынёй, а таму што не раз пераконваліся: так, як ён, ніхто не выслухае і не зразумее.

Алег Антонавіч Лойка быў паэтам у творчасці і ў жыцці. На філфаку ён быў настолькі яркім выкладчыкам, які мог гадзінамі захоплена расказваць пра старажытную беларускую літаратуру, што гэта неяк зацяняла яго ўласную паэтычную творчасць. Памятаю, як я папрасіў Алега Антонавіча падпісаць мне яго двухтомную "Гісторыю беларускай літаратуры: дакастрычніцкі перыяд", якую набыў, калі ўжо закончыў універсітэт. Ён, як тады мне падалося, неяк разгублена спытаў: "А чаму гэтую кніжку?" Што, напэўна, азначала: а чаму не кнігу вершаў? Тады ўжо разгубіўся я і сказаў, што двухтомнік — на памяць пра вучобу на філфаку і яго лекцыі. Тое было праўдай, але пасля нашай сустрэчы мне захацелася перачытаць яго паэзію. Я перачытваю яе і цяпер, калі на душы горка, таму што незабыўную ўсмешку Алега Антонавіча Лойкі ўжо нікому і ніколі не ўбачыць на яве.

Алесь БАДАК

Алег ЛОЙКА

(з апошніх вершаў)

* * *

О, займець мне б моц Хрыста,
Боль, як цень,
здымаць з куста.
Што не ў радасць,
расхістаць,
Промнем ласкі самой стаць!..

Як жа, як разняць рамёны,
Каб спагадаю
натхнёным,
Што, дзе,
хто на свеце — бачыць.
Свету нешта
ўсё-ткі значыць.

Быць нястомным
супраць стомы,
Боль здымаючы пякучы,
Каб ні церняў скрозь,
ні кручаў
Аніколі, анікому,
Анідзе на белым свеце,
Хрысце, Божа,
блаславеце!..

* * *

Думаў: апроч заручын
Нічога свет не хваліць:
Вярба ж і не на кручы
Вышэй крынічнай хвалі.

Думаў: вышэй вяселля
Нічога ў свеце мілым,
А зелянюткі вэлюм
Бярозы над магілай?

Даўжэйшыя барозны
З крыніцамі радняцца...
Мне да сваёй бярозы
Ісці, не азірацца...

* * *

О, залатыя нівы,
Сярэбраныя плёсы,
Калі няшчасце шчаслівіць,
Як не дзякаваць лёсу?!.

Вы, валошка, рамонак,
Вы, бярозачка, дубе,
Крылаціце мне рамёны,
Цішыце боль аб згубе?!.

Сонца, красуй над жытам,
Сні, ручаіна, мора, —
Вышуся над перажытым,
Гора, нібы не гора, —

Дзякую ж не рацэ,
Не любімцам з бору,
А руцэ ў руцэ,
Плачу, што з плячом поруч.

Незабыўныя яго сустрэчы

Хочам праз "ЛіМ" выказаць шчырыя словы спачування родным і блізкім, усім работнікам культуры нашай дзяржавы з прычыны смерці Алега Антонавіча Лойкі — выдатнага сына зямлі беларускай, вучонага, даследчыка, прыхільніка музея Янкі Купалы на працягу дзесяцігоддзяў.

Алег Антонавіч Лойка — аўтар рамана-эсэ пра Янку Купалу "Як агонь, як вада" (1982), прымаў актыўны ўдзел у стварэнні энцыклапедыі "Янка Купала" (1986), ім напісана шмат вершаў-прысвячэнняў Песняру, артыкулаў.

Незабыўнымі засталіся яго сустрэчы з супрацоўнікамі Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы на працягу многіх гадоў на злёце студэнтаў-філолагаў у Вязынцы і Міжнародных навуковых канферэнцыях, якія праводзіліся ў сценах музея.

Навуковыя супрацоўнікі музея ганарацца тым, што былі студэнтамі выдатнага выкладчыка, высокага прафесіянала, які ім прывіваў святую любоў да роднай літаратуры.

Купалаўцы

* * *

Стукнула птушка жалобная
чорным крылом
у вокны душы:
ПАМЁР АЛЕГ ЛОЙКА,
Светлы, разумны і стойкі.

Вольга Русілка

Трэны на развітанне з Алегам Лойкам

Заімгліліся вочы Твае,
заімгліліся...
А мы ехалі, ехалі
ды спазніліся!..
Апусцілася цёмная
хмара —
слязой затулілася
Шчара...
Да усіх дароў
падступае,
а ягоны двор абмінае...
А ў ягоным двары
чужы людзі...
А прыедуць сябры —
весяло́ будзе!...
Толькі госцікі Твае
штось нясмелыя?
Толькі вусны ў Цябе
белыя, белыя...
Чуеш? Плача
за вербамі Шчара...
Няма, няма гаспада́ра!
Гаспадар
у далёкай дарозе...
Прытулі яго, Божа!

Генадзь ПРАНЕВІЧ

Адам ГЛОБУС (Уладзімір Вячаслававіч Адамчык). Нарадзіўся ў 1958 годзе ў Койданаве. Скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут. Працаваў у часопісе "Крыніца" ("Родник"). Цяпер паспяховы прыватны выдавец. Напісаў шмат кніг паэзіі і прозы: "Парк", "Адзінота на стадыёне", "Смерць-мужчына", "Дамавікамерон" "Дом", "Сшыткі", "Кантамінацыі", "Фацэцыі", "Літары". І вось да свайго пяцідзесяцігоддзя пісьменнік выдаў новы том выбранага "CONVOLUTUS" (Мінск, "Сучасны літаратар", 2008, адказны за выпуск М. В. Адамчык, 1000 экз., 830 стар.)

"Зноў дэталь. У Макса Фрыша — у "Мантоку". Ён — герой — пасля ночы блізкасці з каханай як бы мімаходзь адзначае сабе, "спадзяецца, што ў сне не хроп". І далей думае пра нешта падобнае. Вось такая дробязь. А мне падумалася, як часта мы абыходзім вось такія дробязі, якім у мастацтве няма цаны. Каторы наш аўтар ці проста не звярнуў бы ўвагу на такое (банальна, дробязна!), ці такое, каб напісалася, выкрасліў бы маральна пільны рэдактар. Бо такое часам наша разуменне маральнасці і мастацкасці."

Міхась СТРАЛЬЦОЎ



Калі пісаць пра Адама Глобуса, то трэба наважыцца быць талерантным да ўсіх праяў літаратурнай творчасці і жыццёвай дзейнасці гэтага чалавека.

Глобус ідзе ад сябе да свету, каб вяртацца да сябе са светам. У яго тонкі нюх натураліста, які не прапускае ні адной рэчы не дэталізаваўшы яе. Часцей за ўсё яму хапае адной дэталі, па якой пазнаецца ўся рэч альбо яе сутнасць. Гэтаксама і людзі, натуры якіх характарызуюцца выпадковымі ўчынкамі.

Аднак Глобус не ставіць кляйма на сваіх шараговых "героях", але ён вызначае іх і вызначаецца ў сваіх далейшых адносінах з імі...

Усе праявы вялікага зямнога свету (матэрыяльныя і духоўныя), прыцягнутыя яго талентам з усіх магчымых аддаленняў, паступова акаляюць яго і ён становіцца іх эпіцэнтрам, які прыцягвае, адштурхоўвае і ўрэшце парадкуе іх так, што яны, сабраныя ў адно цэлае, трымаюць яго ў тым свеце сваім адзінствам... Гэтак будуецца і на тым стаіць мастацкі **Дом** пісьменніка, вакол якога ў сваім *шэра-казачным* свеце жывуць яго *сучаснікі* ды іншыя *добрыя людзі* са сваімі *рэчамі* і зямнымі непаразуменнямі...

Глобус як мастак па прафесіі любіць усё рабіць дэталёва і грунтоўна. Гэта значыць, што ўсе дэталі ў яго палягаюць на грунце сэнсу. Нішто не канкрэтызуецца даастатку, але паказваецца і ўгадваецца абрысна. Яго кнігі па часе таксама сталі набываць новыя абрысы — яны шырыліся, мажнелі, аздабляліся і набывалі від абпаленай цэглы, годнай для "выбудовы" ўжо згаданага **Дома**.

Не забудзем, што ў А. Глобуса былі выдатныя майстры-настаўнікі: Вячаслаў Адамчык, Уладзімір Караткевіч, Міхась Стральцоў... Іх літаратурная прысутнасць і драматычны чалавечы вопыт, як тыя марскія маякі, адводзілі яго ўласную творчасць ад небяспечных багемных рыфаў і мелкаводдзя і міжволі скіроўвалі яе ў прыватную заціш *прыбытнай* гавані...

Таму, чытаючы тоўстыя тамы яго тэкстаў, чамусьці заўжды ўспамінаецца дзённікавы запіс Адамчыка-бацькі: *"Колькі сшыткаў у шуфлядах майго пісьмовага стала, а для навелы дастаў просты, вучнёўскі"*. Безумоўна, вартасць сшытка яшчэ не азначае вартасці запісанага ў ім тэксту (адзін з такіх тамоў Адамчыка-сына так і называўся "Сшыткі"). Зрэшты, "ліст кі календара" нашага жыцця перагорне вецер часу...

З колішніх Глобусавых "Кантамінацый" я выпісаў гэтыя тры кароткія запісы: *"Галоўнае ў творчасці — наладжванне працэсу, а не канчатковы вынік"*.

"Вядомасць дасягаецца толькі праз кепскую рэпутацыю" і "Нішто так хутка не псуе рэпутацыю літаратара, як праўдзівыя выказванні пра суайчыннікаў і супляменнікаў."

Ці не праўда, як для творчага чалавека, то ў Глобуса занадта прагматычнае мысленне. І менавіта яго ён трымаецца ў жыцці і крок за крокам ажыццяўляе задуманае. Мэтаскіраванасць, цвёрдасць характару і паслядоўнасць натуры з'яўляюцца залогам здзяйснення пастаўленых творчых, матэрыяльных ды іншых меркантыльных задач. *"Прыходзім у свет голыя, а сыходзім апранутыя па-святочнаму"*, — піша ён у сваім цыкле "Рэч". Ну а калі адкінуць філасофскі падтэкст, то можна вызначыць нават паталогію падзення і ўзвышэння чалавека ў грамадстве праз ягоную матэрыялізаванасць. У раздзеле "Добрыя людзі" ёсць вельмі характэрная сцэнка: *"Купюра ляжала на ходніку, міма ішлі людзі. Я паліў і чакаў, хто падбярэ грошы. Салдаты? Не падабралі. Дзеці? Не нахіліліся. Студэнты, старыя? Не, не, не... У нас усе багатыя. Ніхто не нахіліцца над дзесяткаю, на якую нічога не купіш. У нас усе скардзяцца на кошты і адсутнасць грошай, але за дзесяць рублёў нахіліцца ляжуюца. Вецер прыгнаў дзесятку да майго чаравіка, я падняў грошы і вярнуўся ў "Акварыум"*.

У нашай прозе сёння не так шмат класічных і выбітных стылістаў. Арлоў, Глобус, Федарэнка, Бахарэвіч — вось, бадай, і ўсё. Гэта тыя, каго чытаеш натуральна, як дыхаеш... Да таго ж у Глобуса стыль просты і лагічны.

"Іду па наждаку асфальту. Вуліца дыхае дымнаю гарачынёю гарадскога вечара. Камяк чырвонага сонца пагойдваецца ў шчыліне паміж гмахаў." Гэта яшчэ з першай празаічнай кніжкі "Самота на стадыёне". А вось пачатковыя сказы з апавяданняў "Браслаўская стыгмата":

"У Ігара Батуры
бацька забіў маці."
"Валера Салавей з'еў павука."
"Рэчы не любяць Ахрома."

Першым сказам аповеда аўтар як бы ставіць героя ў "кафкіянскую *позу*". Далей ужо ідзе не суд, не асуджэнне і не апраўданне нават, а скажам так, агалошванне справы... Суха, сутнасна, без акцэнтаў — як яшчэ не збліжаныя да небяспечнай мяжы жыццё і смерць...

Калі, пішучы пра іншых, каб падвысіць творчы цэнз таго ці іншага літаратара, дадаеш колькі яскравых згадак з яго асабістага жыцця, то, пішучы пра Глобуса, якраз наадварот, стараешся адасобіцца ад яго зямных дзей, каб яны не абцяжарвалі яго мастацкага ўзвышэння...

Не сакрэт, што як і ў кожнага заможнага чалавека, гаспадара (у тым ліку і свайго слова), у Глобуса шмат літаратурных зайздроснікаў. Хоць, здавалася б, дабрабыт і талент — рэчы несумяшчальныя. Аднак жыццё абвяргае прасталіненую логіку чалавечага мыслення. Яшчэ як сумяшчальныя! Нават прыцягальныя...

Адам Глобус — працаголік, больш за тое, літараголік... Яго талент палягае ў адточванні майстэрства штодзённай працай. І плён яго творчай карпатлівасці відавочны і, як мне падаецца, з вышэй агавораных прычын недаацэнены літаратурнай публікай і калегамі па пяры...

Але яго вялікасць Час вызначыцца і з вызначэннем Адама Глобуса.

Калі чытаеш яго творы, само па сабе прысутнічае адчуванне, што чытаеш сапраўднае. Няма і каліва сумневу ў мастацкасці яго літаратурных тэкстаў. Справа толькі ў тваім чытацкім стаўленні да іх зместу ды ідэйнай скіраванасці... Стыль лаканічны і ясны. Змест празрысты. Ідэі незаангажаваныя. Падтэксту, можна сказаць, няма з прычыны адсутнасці двурушнасці і зменлівасці творчых поглядаў. Класіка. Як у абразку "Дождж":

Выйшаў на вуліцу. Паліўся дождж. Я паглядзеў на неба з-пад парасона і падумаў: "Божа, калі ты ёсць, зрабі, каб скончыўся дождж. Ну хіба табе цяжка? Пакутуе тата. Мучыцца мама. Праз дзень у мяне самалёт да Барселоны... Як я кіну бацькоў? Што скажу людзям пра сваю адсутнасць на пахаванні?" — "Калі ты не пабудзеш на татавым пахаванні, ты сабе гэтага ніколі не даруеш", — кажуць навокал. І яны кажуць праўду. "Божа, дай мне знак, спыні дождж". І дождж перастаў. Я вярнуўся дамоў, пачаў парадкаваць фінансавыя запісы. І тут патэлефанавала мама і сказала: "Тата не дыхае. Тата памёр".

Пісьменніцкі талент Глобуса праяўляецца ў здольнасці ствараць з простага і звычайнага — адметнае і запамінальнае. Ён — цікавы найперш сабой, сваёй **сучаснай** асаблівасцю, якая паступова афармляецца ў Асобу, як бы хто да яго ні ставіўся. Ён шукае вялікае і вечнае ў малым і штодзённым. І хоча, каб яго *"тэксты поўніліся рэчывам, рэчаіснасцю, каб ствараўся эфект прысутнасці. Мне трэба бадзёрая рэальнасць, а не прывіднасці з мройнасцямі. Рэальнасць — тут і цяпер, навокал і поруч, поплеч, зусім блізка. Мая рэальнасць актуалізуецца праз простыя рэчы..."*

Глобус — майстравіта-прафесійны і самасны творца. Так, у меру манерны, строга статычны, нязменна ўстойлівы, як і кожны дабротны твор мастацтва.

На жаль, не ўсё роўнае ў мастацкім плане ўключана пісьменнікам у гэты юбілейны збор твораў... (Скажам, я пакінуў бы па-за вокладкамі кнігі некаторыя вершы, асобныя "казкі" і запісы з "сУчаснікаў", якія прыцягваюць нядобрасумленных чытачоў і адштурхоўваюць інтэлігентаў-эстэтаў.) Не думаю, што ў Глобуса няма адчування "перабору" там, дзе мастацтва выціскаецца вульгарнай прозай. Проста ён, як зямны чалавек, да канца не можа перасіліць у сабе і ўраўнаважыць свае жарсці, каб пушкінскім чынам знайсці гармонію, *паверыўшы* яе добра засвоенай ім алгебрай. (Г. Кісліцына піша, што падобнымі тэкстамі А. Глобус правакуе сваіх чытачоў. Так, правакуе — на прачытанне самога сябе. Нездарма тыя тэксты напамінаюць мне пра "халодную маску" *жывога твару* міма Марселя Марсо... Пастаянна хочацца зазірнуць пад "яе", каб упэўніцца, што вочы майстра сухія...)

Прынамсі, што да вершаў. Вось, скажам, кароткі верш "Свабода":

Нарэшце маю свабодны вечар.
Усходзіць поўня над небакраем.
У ціхім парку, ля светлай рэчкі
з бутэлькай віскі адпачываю.

Гэта перафраз вядомага верша М. Багдановіча — вельмі важны і паказальны момант: форма пакінутая, а змест зменены... Гэтак як чалавек пачатку XX ст. злучаны і сугучна аддалены (але пазнавальны) з чалавекам сённяшнім. Хоць каторы з іх насамрэч "самотны", а каторы "не", адназначна сказаць цяжка.

А вось страфа іншага кшталту:

Банка піва, цыгарэта, секс і мат.
Ад жыцця не патрабуе
ён зашмат.
Так жыве і весяліцца з году ў год,
а імя яго такое — наш народ.

Але хіба вобразы падлеткаў і нявыхаваных людзей — гэта і ёсць увесь беларускі народ?! Паэт тут відавочна здрадзіў празаіку. Змысл паўстаў над духам...

І ўсё ж гэта рэдкія выдаткі вырваныя з кантэксту кніжкі. Думаю, да наступнага свайго юбілею Адам Глобус выдасць прасеянае часам і адабранае чытачом. Нях ай яно будзе і танчэйшым, затое больш вартасным.

І наастатку яшчэ адна акалічнасць. На мой погляд, мала хто спрабаваў прыгледзецца (у параўнальным плане) да творчага стылю бацькі і сына Адамчыкаў... А яны ж блізкія, нераўнуючы як дзве поруч ідучыя паралельныя прамыя... Чытаючы апошнія, перадсмяротныя дзённікавыя запісы Вячаслава Адамчыка ў часопісе "Полымя" я ніяк не мог адстаронціцца ад думкі, што яго "зацыкленасць" на прыродзе вынікае з яго прадчуванняў уласнага сыходу ў гэтую самую прыроду (*з зямлі ўзятага, у зямлю вернутага*)... А "зацыкленасць" сына на прыродзе самога чалавека (сям'і, творчасці, душы, характарах, рэчах) паказвае яго прагавітасць да спазнання жывога ў яшчэ жывым чалавеку...

Таму няма сумневу, што некалі недзе Там гэтыя дзве прамыя перасякуцца... Дзеля выяўлення існасці імі пражытага і створанага.

ЛеГАЛ

Лім

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"

РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная калегія:
Анатоль Акушэвіч
Лілія Ананіч
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Святлана Берасцень
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Уладзімір Дуктаў
Анатоль Жук
Вольга Казлова
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Мікола Станкевіч
Юрый Цвяткоў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
220034, Мінск,
вул. Захарава, 19

Тэлефоны:
галоўны рэдактар,
намеснік — 284-66-73

Аддзелы:
публіцыстыкі — 284-66-71
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-95-62
крытыкі
і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі — 284-44-04
мастацтва — 284-82-04
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: lim_new@mail.ru

Адрас у Інтэрнэце:
www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва".

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"
г. Мінск,
пр. Незалежнасці, 79.

Індэкс 63856
Наклад 3377
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 3.12.2008 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 6640

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 0024-4686